# ПАРЛАМЕНТ

## НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
СЁМАГА СКЛІКАННЯ

## НАЦИОНАЛЬНОЕ СОБРАНИЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
СЕДЬМОГО СОЗЫВА

МІНСК • БЕЛТА • 2023

УДК 328(476)
ББК 66.3(4Беи)68
П18

Пад агульнай рэдакцыяй старшынь палат
Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
У.П. Андрэйчанкі і Н.І. Качанавай

У падрыхтоўцы выдання прымалі ўдзел:
К.В. Рэчыц, С.А. Бервін, А.А. Мааль, А.А. Яшкова,
В.В. Ермаловіч, К.У. Праяненкаў, А.У. Чупракоў, Т.М. Селядзеўская, А.С. Шагун

У кнізе выкарыстаны здымкі фотахронікі УП «БЕЛТА»,
сакратарыятаў палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

**Парламент – Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь сёмага склікання** =
П18 Парламент – Национальное собрание Республики Беларусь седьмого созыва / пад агул. рэд. У.П. Андрэйчанкі, Н.І. Качанавай. – Мінск : БЕЛТА, 2023. – 304 с. : іл.

ISBN 978-985-7064-54-0.

У кнізе ідзе гаворка аб ролі Парламента ў забеспячэнні канстытуцыйнай рэформы, умацаванні суверэнітэту і нацыянальнай бяспекі, падтрымцы сацыяльна-эканамічнай стабільнасці ў краіне на адным з самых адказных этапаў яе гісторыі.

Выданне дае магчымасць атрымаць поўнае ўяўленне аб структуры, парадку фарміравання, кампетэнцыі і прававых асновах работы прадстаўнічага і заканадаўчага органа. Прыводзяцца біяграфіі парламентарыяў, звесткі аб складзе кіруючых органаў палат Парламента сёмага склікання. Асобны раздзел прысвечаны вынікам дзейнасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Змешчаная ў кнізе інфармацыя дае магчымасць атрымаць поўнае ўяўленне аб структуры, парадку фарміравання, кампетэнцыі і прававых асновах работы прадстаўнічага і заканадаўчага органа.

**УДК 328(476)**
**ББК 66.3(4Беи)68**

ISBN 978-985-7064-54-0

© Палата прадстаўнікоў, 2023
© Савет Рэспублікі, 2023
© Афармленне. УП «БелТА», 2023

Дзяржаўная ўлада ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца на аснове падзелу яе на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. Дзяржаўныя органы ў межах сваіх паўнамоцтваў самастойныя: яны ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, стрымліваюць і ўраўнаважваюць адзін аднаго.

Артыкул 6 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь

Парламент – Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь з'яўляецца прадстаўнічым і заканадаўчым органам Рэспублікі Беларусь.
Парламент складаецца з дзвюх палат – Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі.

Артыкул 90 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь

Государственная власть в Республике Беларусь осуществляется на основе разделения ее на законодательную, исполнительную и судебную. Государственные органы в пределах своих полномочий самостоятельны: они взаимодействуют между собой, сдерживают и уравновешивают друг друга.

Статья 6 Конституции Республики Беларусь

Парламент – Национальное собрание Республики Беларусь является представительным и законодательным органом Республики Беларусь.
Парламент состоит из двух палат – Палаты представителей и Совета Республики.

Статья 90 Конституции Республики Беларусь






Сумеснае пасяджэнне дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання. 2023 г.

Совместное заседание депутатов Палаты представителей и членов Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь седьмого созыва. 2023 г.



...Усе дасягненні і высокія вынікі дзейнасці дэпутацкага корпуса сталі магчымы перш за ўсё дзякуючы адсутнасці палітычных рознагалоссяў і настроенасці парламентарыяў на канструктыўнае супрацоўніцтва з іншымі галінамі ўлады. Нацыянальны сход заўсёды выбудоўваў сваю работу такім чынам, што прымаемыя законапраекты сапраўды адпавядалі інтарэсам грамадства і дзяржавы.

...Парламент – гэта пляцоўка для прафесійнай, аргументаванай дыскусіі. Усе мы цудоўна разумеем, што бачанне адных і тых жа праблем рознымі людзьмі можа істотна адрознівацца. І ваша задача – у мностве меркаванняў знайсці найбольш правільнае і ўзважанае рашэнне.

**Са звароту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі**
**да дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі**
**Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага і сёмага скліканняў**
**5 снежня 2019 года**

...Все достижения и высокие результаты деятельности депутатского корпуса стали возможны прежде всего благодаря отсутствию политических разногласий и настроенности парламентариев на конструктивное сотрудничество с другими ветвями власти. Национальное собрание всегда выстраивало свою работу таким образом, что принимаемые законопроекты действительно отвечали интересам общества и государства.

...Парламент – это площадка для профессиональной, аргументированной дискуссии. Все мы прекрасно понимаем, что видение одних и тех же проблем разными людьми может существенно различаться. И ваша задача – во множестве мнений найти наиболее правильное и взвешенное решение.

**Из обращения Президента Республики Беларусь А.Г. Лукашенко**
**к депутатам Палаты представителей и членам Совета Республики**
**Национального собрания Республики Беларусь шестого и седьмого созывов**
**5 декабря 2019 года**



## Паважаныя чытачы!

Кніга, якую вы трымаеце ў руках, дае ўяўленне пра няпросты і насычаны падзеямі шлях, які прайшлі беларускія парламентарыі разам з усёй краінай за апошнія чатыры гады.

Гэта быў адзін з самых цяжкіх перыядаў у гісторыі суверэннай Беларусі. Рэспубліка апынулася ў эпіцэнтры бязлітаснай барацьбы за перадзел свету, што суправаджалася рэзкім абвастрэннем эканамічнага, палітычнага і ваеннага процістаяння паміж найбуйнейшымі геапалітычнымі іграками.

Аднак ні беспрэцэдэнтны санкцыйны націск, ні маштабная інфармацыйная агрэсія, ні нагнятанне ваенных пагроз непасрэдна паблізу нашых граніц не дазволілі калектыўнаму Захаду дасягнуць сваіх мэт.

Захаваць суверэнітэт і незалежнасць, адстаяць нацыянальныя інтарэсы і абараніць нашых грамадзян дапамаглі непахісная пазіцыя Кіраўніка дзяржавы, з'яднанне народа вакол спрадвечных каштоўнасцей і правядзенне шырокага грамадскага дыялогу аб будучыні краіны.

Рашэнні VI Усебеларускага народнага сходу і вынікі канстытуцыйнага рэферэндуму замацавалі ў якасці мадэлі развіцця Беларусі моцную дзяржаву, заснаваную на нацыянальных традыцыях народаўладдзя, ідэалах міру, гуманізму і сацыяльнай справядлівасці.

## Уважаемые читатели!

Книга, которую вы держите в руках, дает представление о непростом и насыщенном событиями пути, который прошли белорусские парламентарии вместе со всей страной за последние четыре года.

Это был один из самых сложных периодов в истории суверенной Беларуси. Республика оказалась в эпицентре ожесточенной борьбы за передел мира, сопровождавшейся резким обострением экономического, политического и военного противостояния между крупнейшими геополитическими игроками.

Однако ни беспрецедентное санкционное давление, ни масштабная информационная агрессия, ни нагнетание военных угроз в непосредственной близи от наших границ не позволили коллективному Западу достичь своих целей.

Сохранить суверенитет и независимость, отстоять национальные интересы и защитить наших граждан помогли непреклонная позиция Главы государства, сплочение народа вокруг исконных ценностей и проведение широкого общественного диалога о будущем страны.

Решения VI Всебелорусского народного собрания и результаты конституционного референдума закрепили в качестве модели развития Беларуси сильное государство, основанное на национальных традициях народовластия, идеалах мира, гуманизма и социальной справедливости.





Рэалізацыя намечаных эканамічных і грамадска-палітычных пераўтварэнняў запатрабавала павышэння адказнасці і мабілізацыі намаганняў усіх галін улады. Важная роля ў выкананні пастаўленых задач была адведзена Парламенту.

Безумоўнымі прыярытэтамі ў дзейнасці дэпутацкага корпуса сёмага склікання сталі заканадаўчае суправаджэнне канстытуцыйнай рэформы, умацаванне нацыянальнай бяспекі, падтрымка эканомікі, забеспячэнне сацыяльнай стабільнасці і захаванне належнага ўзроўню жыцця грамадзян.

Галоўныя намаганні парламенцкай дыпламатыі ў гэты перыяд былі сканцэнтраваны на паглыбленні супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы, развіцці інтэграцыйных працэсаў і захаванні бяспекі на еўразійскай прасторы, актыўным пошуку партнёраў, якія падзяляюць нашы погляды на справядлівае светаўладкаванне.

Найважнейшымі напрамкамі нашай дзейнасці ўсе гэтыя гады заставаліся работа непасрэдна з выбаршчыкамі, аказанне садзейнічання ў вырашэнні іх надзённых праблем, рэалізацыя патрыятычных ініцыятыў па падтрыманні народнага адзінства, абароне гістарычнай памяці, захаванні сувязі пакаленняў.

Фотаматэрыялы, выкарыстаныя ў кнізе, дапамогуць чытачам выразна ўявіць сабе ўсю складанасць парламенцкага працэсу і тую ролю, якую адыгрывае Нацыянальны сход у рэалізацыі палітычнага курсу суверэннай беларускай дзяржавы.

**У.П. Андрэйчанка,**
**Старшыня Палаты прадстаўнікоў**
**Нацыянальнага сходу**
**Рэспублікі Беларусь**

Реализация намеченных экономических и общественно-политических преобразований потребовала повышения ответственности и мобилизации усилий всех ветвей власти. Важная роль в выполнении поставленных задач была отведена Парламенту.

Безусловными приоритетами в деятельности депутатского корпуса седьмого созыва стали законодательное сопровождение конституционной реформы, укрепление национальной безопасности, поддержка экономики, обеспечение социальной стабильности и сохранение достойного уровня жизни граждан.

Главные усилия парламентской дипломатии в этот период были сосредоточены на углублении сотрудничества в рамках Союзного государства, развитии интеграционных процессов и обеспечении безопасности на евразийском пространстве, активном поиске партнеров, разделяющих наши взгляды на справедливое мироустройство.

Важнейшими направлениями нашей деятельности все эти годы оставались непосредственная работа с избирателями, оказание содействия в решении их насущных проблем, реализация патриотических инициатив по поддержанию народного единства, защите исторической памяти, сохранению связи поколений.

Фотоматериалы, использованные в книге, помогут читателям более отчетливо представить себе всю сложность парламентского процесса и ту роль, которую играет Национальное собрание в реализации политического курса суверенного белорусского государства.

**В.П. Андрейченко,**
**Председатель Палаты представителей**
**Национального собрания**
**Республики Беларусь**



Работа Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання прыпадала на асаблівы перыяд не толькі ў сучаснай гісторыі беларускай дзяржаўнасці, але і ўсяго чалавецтва. Гэта час змены геапалітычных эпох: канца аднапалярнай сістэмы міжнародных каардынат і фарміравання новага, больш справядлівага і збалансаванага, шматпалярнага парадку, заснаванага на ўзаемнай павазе, даверы і супрацоўніцтве раўнапраўных незалежных дзяржаў.

У гэтых беспрэцэдэнтных геапалітычных умовах пад кіраўніцтвам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, нашага нацыянальнага Лідара, глыбокапаважанага Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, краіна прадоўжыла цвёрта прытрымлівацца свайго цывілізацыйнага выбару. Справай удзельнічаць у вырашэнні глабальных праблем светаўладкавання, падтрымліваць добрыя дружалюбныя адносіны з усімі народамі і садзейнічаць дээскалацыі існуючых канфліктаў, жыць уласным розумам на роднай зямлі, клапаціцца пра людзей, помніць урокі гісторыі і паважаць закон – гэта сутнасць палітыкі суверэннай Беларусі і тое, што было асноватворным у нашай рабоце.

За перыяд сёмага склікання дзякуючы зладжанай, сістэмнай і актыўнай рабоце членаў Савета Рэспублікі ў цесным узаемадзеянні з дэпутатамі ўсіх узроўняў, рэспубліканскімі органамі кіравання, мясцовымі органамі ўлады, грамадскімі арганізацыямі, навуковай і экспертна-аналітычнай супольнасцю, сродкамі масавай інфармацыі вырашаліся пытанні стратэгічнай важнасці, ад якіх непасрэдна залежыць далейшае мірнае бяспечнае і ўстойлівае развіццё Беларусі.

Пры непасрэдным удзеле членаў Савета Рэспублікі ў рабоце Канстытуцыйнай камісіі паспяхова ажыццёўлены канстытуцыйныя пераўтварэнні, якія азнаменавалі сабой пачатак новай гістарычнай вяхі ў развіцці беларускага дзяржаўнага будаўніцтва і айчыннага парламентарызму. Праведзена значная работа па прывядзенні ў адпаведнасць з абноўленым Асноўным Законам нацыянальнага заканадаўства, прыняты шэраг абсалютна ўнікальных, лёсавызначальных для нашага народа і краіны законаў. Паспяхова рэалізуецца механізм незалежнай экспертнай ацэнкі запатрабаванасці нарматворчых навацый, ключавая роля ў якім па праву адведзена рабоце экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі.

Прыярытэтным напрамкам нязменна з'яўлялася маштабная сістэмная работа з насельніцтвам ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны. Вырашэнню найбольш актуальных пытанняў сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця садзейнічала работа створаных пры Савеце Рэспублікі экспертна-кансультатыўнага савета, Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, кансультатыўнага савета па пытаннях сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Намаганні парламенцкай дыпламатыі былі засяроджаны на паглыбленні інтэграцыі ў рамках Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, умацаванні стратэгічнага супрацоўніцтва краін – удзельніц Еўразійскага эканамічнага саюза, Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Міжпарламенцкае супрацоўніцтва з Кітаем, Узбекістанам, Кыргызстанам, Кубай выведзена на якасна новы ўзровень. Істотна актывізавана міжнародная дзейнасць у рэгіёнах Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі.

Члены Савета Рэспублікі паслядоўна пашыралі нацыянальныя інтарэсы нашай краіны, даносілі свету голас разважлівасці, прымалі заявы і звароты. Мы рашуча абаранялі неад'емнае права беларускага народа на праўду, справядлівасць і самастойны шлях развіцця.

Многае зроблена, але яшчэ больш трэба зрабіць. Упэўнена, што роля парламенцкага корпуса як рэальнай і аўтарытэтнай грамадска-палітычнай сілы будзе толькі ўзрастаць.

Для Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь адкрываецца чарговая старонка парламенцкага летапісу, напоўненая новымі магчымасцямі для далейшага паступальнага развіцця моцнай, незалежнай і квітнеючай Рэспублікі Беларусь.

**Н.І. Качанава,**
**Старшыня Савета Рэспублікі**
**Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

Работа Национального собрания Республики Беларусь седьмого созыва приходилась на особенный период не только в современной истории белорусской государственности, но и всего человечества. Это время смены геополитических эпох: заката однополярной системы международных координат и формирования нового, более справедливого и сбалансированного, многополярного порядка, основанного на взаимном уважении, доверии и сотрудничестве равноправных независимых государств.

В этих беспрецедентных геополитических условиях под руководством Президента Республики Беларусь, нашего национального Лидера, глубокоуважаемого Александра Григорьевича Лукашенко, страна продолжила твердо следовать своему цивилизационному выбору. Делом участвовать в решении глобальных проблем мироустройства, поддерживать добрые дружественные отношения со всеми народами и способствовать деэскалации существующих конфликтов, жить собственным умом на родной земле, заботиться о людях, помнить уроки истории и уважать закон – это суть политики суверенной Беларуси и то, что было основополагающим в нашей работе.

За период седьмого созыва благодаря слаженной, системной и активной работе членов Совета Республики в тесном взаимодействии с депутатами всех уровней, республиканскими органами управления, местными органами власти, общественными организациями, научным и экспертно-аналитическим сообществом, средствами массовой информации решались вопросы стратегической важности, от которых напрямую зависит дальнейшее мирное безопасное и устойчивое развитие Беларуси.

При непосредственном участии членов Совета Республики в работе Конституционной комиссии успешно осуществлены конституционные преобразования, ознаменовавшие собой начало новой исторической вехи в развитии белорусского государственного строительства и отечественного парламентаризма. Проделана значительная работа по приведению в соответствие с обновленным Основным Законом национального законодательства, принят ряд абсолютно уникальных, судьбоносных для нашего народа и страны законов. Успешно реализуется механизм независимой экспертной оценки востребованности нормотворческих новаций, ключевая роль в котором по праву отведена работе экспертного совета при Совете Республики.

Приоритетным направлением неизменно являлась масштабная системная работа с населением во всех регионах нашей страны. Решению наиболее актуальных вопросов социально-экономического и общественно-политического развития способствовала работа созданных при Совете Республики экспертно-консультативного совета, Совета по взаимодействию органов местного самоуправления, консультативного совета по вопросам социальной адаптации и интеграции детей с особенностями психофизического развития.

Усилия парламентской дипломатии были сосредоточены на углублении интеграции в рамках Союзного государства Беларуси и России, укреплении стратегического сотрудничества стран – участниц Евразийского экономического союза, Содружества Независимых Государств. Межпарламентское сотрудничество с Китаем, Узбекистаном, Кыргызстаном, Кубой выведено на качественно новый уровень. Существенно активизирована международная деятельность в регионах Азии, Африки, Латинской Америки.

Члены Совета Республики последовательно продвигали национальные интересы нашей страны, доносили миру голос здравого смысла, принимали заявления и обращения. Мы решительно защищали неотъемлемое право белорусского народа на правду, справедливость и самостоятельный путь развития.

Многое сделано, но еще больше предстоит сделать. Уверена, что роль парламентского корпуса как реальной и авторитетной общественно-политической силы будет только возрастать.

Для Национального собрания Республики Беларусь открывается очередная страница парламентской летописи, наполненная новыми возможностями для дальнейшего поступательного развития сильной, независимой и процветающей Республики Беларусь.

**Н.И. Кочанова,**
**Председатель Совета Республики**
**Национального собрания Республики Беларусь**



# КАНСТЫТУЦЫЙНАЯ РЭФОРМА ЯК НОВЫ ЭТАП ДЗЯРЖАЎНАГА БУДАЎНІЦТВА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 24 лістапада 1996 года і 17 кастрычніка 2004 года у поўнай меры забяспечыла станаўленне маладой суверэннай дзяржавы, заклала фундамент стабільнага развіцця дзяржавы і грамадства, сфарміравала сацыяльна-эканамічную мадэль краіны, аснову якой склалі стварэнне сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі, захаванне гістарычнай праўды, прыхільнасць да агульначалавечых каштоўнасцей і прадастаўленне дадатковай падтрымкі слабаабароненым слаям насельніцтва.

# КОНСТИТУЦИОННАЯ РЕФОРМА КАК НОВЫЙ ЭТАП ГОСУДАРСТВЕННОГО СТРОИТЕЛЬСТВА В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

Конституция Республики Беларусь 1994 года с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 года и 17 октября 2004 года в полной мере обеспечила становление молодого суверенного государства, заложила фундамент стабильного развития государства и общества, сформировала социально-экономическую модель страны, основу которой составили создание социально ориентированной рыночной экономики, сохранение исторической правды, приверженность общечеловеческим ценностям и предоставление дополнительной поддержки уязвимым слоям населения.





Разам з тым паступальнае развіццё інстытутаў дзяржавы і грамадства пакідала пытанні далейшага канстытуцыйнага будаўніцтва, павышэння ролі прадстаўнічай дэмакратыі, эфектыўнасці галін улады, сістэмы і кампетэнцыі дзяржаўных органаў у фокусе ўвагі Кіраўніка дзяржавы і парламентарыяў.

Аб'ектыўная патрэба «асучасніць» асобныя раздзелы Канстытуцыі, вызначыць перспектывы развіцця беларускай дзяржавы і грамадства ў сучасных сацыяльна-эканамічных і геапалітычных рэаліях абумовіла неабходнасць абнаўлення канстытуцыйных норм.

Падрыхтоўка змяненняў і дапаўненняў у Асноўны Закон стала магутным фактарам для кансалідацыі грамадства і арыенцірам для далейшага развіцця краіны.

Прынятыя 27 лютага 2022 года на рэспубліканскім рэферэндуме папраўкі ў Канстытуцыю замацавалі якасна новую сістэму дзяржаўнай улады, у якой роля вышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя адведзена Усебеларускаму народнаму сходу, які павінен вызначаць стратэгічныя напрамкі развіцця грамадства і дзяржавы,

Вместе с тем поступательное развитие институтов государства и общества оставляло вопросы дальнейшего конституционного строительства, повышения роли представительной демократии, эффективности ветвей власти, системы и компетенции государственных органов в фокусе внимания Главы государства и парламентариев.

Объективная потребность «осовременить» отдельные разделы Конституции, определить перспективы развития белорусского государства и общества в современных социально-экономических и геополитических реалиях обусловила необходимость обновления конституционных норм.

Подготовка изменений и дополнений в Основной Закон стала мощным фактором для консолидации общества и ориентиром для дальнейшего развития страны.

Принятые 27 февраля 2022 года на республиканском референдуме поправки в Конституцию закрепили качественно новую систему государственной власти, в которой роль высшего представительного органа народовластия отведена Всебелорусскому народному собранию, призванному определять стратегические направления развития





забяспечваць непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадскую згоду.

Змяненні Асноўнага Закона, захоўваючы канстытуцыйны статус Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь як Кіраўніка дзяржавы, істотна павысілі ролю Парламента і Урада, іх адказнасць за вырашэнне задач, што стаяць перад дзяржавай і грамадствам.

Прыняцце змяненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь стала вынікам сумеснай карпатлівай работы дзяржаўных органаў, грамадзян, вучоных і экспертаў. Гэта дазволіла прыняць сапраўды народную Канстытуцыю, здольную стаць стратэгічным арыенцірам для далейшага ўстойлівага развіцця беларускага грамадства і дзяржавы.

общества и государства, обеспечивать незыблемость конституционного строя, преемственность поколений и гражданское согласие.

Изменения Основного Закона, сохраняя конституционный статус Президента Республики Беларусь как Главы государства, существенно повысили роль Парламента и Правительства, их ответственность за решение стоящих перед государством и обществом задач.

Принятие изменений в Конституцию Республики Беларусь явилось результатом совместной кропотливой работы государственных органов, граждан, ученых и экспертов. Это позволило принять поистине народную Конституцию, способную стать стратегическим ориентиром для дальнейшего устойчивого развития белорусского общества и государства.




# СТРУКТУРА, ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ, КАМПЕТЭНЦЫЯ І ФОРМЫ РАБОТЫ ПАРЛАМЕНТА

# СТРУКТУРА, ПОРЯДОК ФОРМИРОВАНИЯ, КОМПЕТЕНЦИЯ И ФОРМЫ РАБОТЫ ПАРЛАМЕНТА



Дзейнасць Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь як прадстаўнічага і заканадаўчага органа грунтуецца на прынцыпах:

- дэмакратычнасці;
- галоснасці;
- падзелу дзяржаўнай улады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую;
- вяршэнства права і законнасці;
- прыярытэту агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права;
- роўнасці грамадзян перад законам, павагі іх правоў і законных інтарэсаў;
- свабоднага абмеркавання і прыняцця рашэнняў;
- удзелу грамадзян у вырашэнні і абмеркаванні пытанняў дзяржаўнага жыцця.

Прававую аснову дзейнасці Парламента складаюць Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь», іншыя заканадаўчыя акты, а таксама рэгламенты палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Склад Палаты прадстаўнікоў — 110 дэпутатаў. Выбранне дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ажыццяўляецца на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага, прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Дэпутатам Палаты прадстаўнікоў можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 21 года. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы ў Парламенце на прафесійнай аснове. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў не можа быць членам Урада, дэпутатам мясцовага Савета дэпутатаў.

Савет Рэспублікі з'яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Ад кожнай вобласці і горада Мінска тайным галасаваннем выбіраюцца на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню кожнай вобласці і горада Мінска па восем членаў Савета Рэспублікі. Восем членаў Савета Рэспублікі назначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Членам Савета Рэспублікі пажыццёва з яго згоды з'яўляецца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, які спыніў выкананне сваіх паўнамоцтваў у сувязі са сканчэннем тэрміну яго знаходжання на пасадзе або датэрмінова ў выпадку яго адстаўкі.

Членам Савета Рэспублікі можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 30 гадоў і пражывае на тэрыторыі адпаведнай вобласці, горада Мінска не менш за пяць гадоў. Член Савета Рэспублікі не можа быць адначасова членам Урада Рэспублікі Беларусь.

Адна і тая ж асоба не можа адначасова з'яўляцца членам дзвюх палат Парламента. Не дапускаецца сумяшчэнне абавязкаў дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі

Деятельность Национального собрания Республики Беларусь как представительного и законодательного органа основывается на принципах:

- демократичности;
- гласности;
- разделения государственной власти на законодательную, исполнительную и судебную;
- верховенства права и законности;
- приоритета общепризнанных принципов международного права;
- равенства граждан перед законом, уважения их прав и законных интересов;
- свободного обсуждения и принятия решений;
- участия граждан в решении и обсуждении вопросов государственной жизни.

Правовую основу деятельности Парламента составляют Конституция Республики Беларусь, Закон Республики Беларусь «О Национальном собрании Республики Беларусь», иные законодательные акты, а также регламенты палат Национального собрания Республики Беларусь.

Состав Палаты представителей — 110 депутатов. Избрание депутатов Палаты представителей осуществляется на основе всеобщего, свободного, равного, прямого избирательного права при тайном голосовании.

Депутатом Палаты представителей может быть гражданин Республики Беларусь, достигший 21 года. Депутаты Палаты представителей осуществляют свои полномочия в Парламенте на профессиональной основе. Депутат Палаты представителей не может быть членом Правительства, депутатом местного Совета депутатов.

Совет Республики является палатой территориального представительства. От каждой области и города Минска тайным голосованием избираются на заседаниях депутатов местных Советов депутатов базового уровня каждой области и города Минска по восемь членов Совета Республики. Восемь членов Совета Республики назначаются Президентом Республики Беларусь.

Членом Совета Республики пожизненно с его согласия является Президент Республики Беларусь, прекративший исполнение своих полномочий в связи с истечением срока его пребывания в должности либо досрочно в случае его отставки.

Членом Совета Республики может быть гражданин Республики Беларусь, достигший 30 лет и проживающий на территории соответствующей области, города Минска не менее пяти лет. Член Совета Республики не может быть одновременно членом Правительства Республики Беларусь.

Одно и то же лицо не может одновременно являться членом двух палат Парламента. Не допускается совмещение обязанностей депутата Палаты представителей, члена Совета Республики

з адначасовым заняццем пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь або суддзі.

Тэрмін паўнамоцтваў Нацыянальнага сходу — пяць гадоў, калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь. Ён можа быць прадоўжаны на падставе закона толькі ў выпадку вайны.

Выбары новага складу палат Нацыянальнага сходу назначаюцца не пазней як за тры месяцы да адзінага дня галасавання. Нечарговыя выбары палат Парламента праводзяцца на працягу трох месяцаў з дня датэрміновага спынення іх паўнамоцтваў.

Першая пасля выбараў сесія палат Нацыянальнага сходу склікаецца Цэнтральнай выбарчай камісіяй і пачынае сваю работу не пазней як праз 30 дзён пасля выбараў.

Палаты збіраюцца на сесію, якая адкрываецца ў трэці аўторак верасня і закрываецца ў апошні працоўны дзень чэрвеня наступнага года.

Палата прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі ў выпадку асаблівай неабходнасці склікаюцца на нечарговую сесію старшынямі палат па ініцыятыве Прэзідэнта або большасці дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі ад поўнага складу кожнай з палат па парадку дня і ў тэрмін, вызначаныя ініцыятарам.

Кампетэнцыя Парламента рэалізуецца праз ажыццяўленне прадстаўнічых, заканадаўчых і іншых паўнамоцтваў палат Нацыянальнага сходу, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Кампетэнцыю Палаты прадстаўнікоў складаюць:

- разгляд па прапанове Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Усебеларускага народнага сходу, не менш як адной трэці ад поўнага складу кожнай з палат Парламента або па ініцыятыве не менш як 150 тысяч грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць выбарчым правам, праектаў законаў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь;
- разгляд праектаў законаў аб ратыфікацыі і дэнансацыі міжнародных дагавораў; аб асноўным змесце і прынцыпах ажыццяўлення правоў, свабод і абавязкаў грамадзян; аб грамадзянстве, статусе іншаземцаў і асоб без грамадзянства; аб правах нацыянальных меншасцей; аб устанаўленні рэспубліканскіх падаткаў і збораў; аб прынцыпах ажыццяўлення адносін уласнасці; аб асновах сацыяльнай абароны; аб прынцыпах рэгулявання працы і занятасці; аб шлюбе, сям'і, дзяцінстве, мацярынстве, бацькоўстве, выхаванні, адукацыі, культуры і ахове здароўя; аб ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў; аб вызначэнні парадку вырашэння пытанняў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржавы; аб мясцовым самакіраванні; аб судовым ладзе, судаводстве і статусе суддзяў; аб крымінальнай адказнасці; аб амністыі; аб абвяшчэнні вайны і заключэнні міру; аб прававых рэжымах надзвычайнага і ваеннага становішчаў; аб устанаўленні дзяржаўных узнагарод; аб тлумачэнні законаў; праектаў іншых законаў;
- разгляд праектаў законаў аб рэспубліканскім бюджэце і аб зацвярджэнні справаздачы аб яго выкананні.

Палата прадстаўнікоў назначае выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і ажыццяўляе шэраг паўнамоцтваў, звязаных з назначэннем Прэм'ер-міністра і дзейнасцю Урада Рэспублікі Беларусь. У прыватнасці, дэпутаты даюць папярэднюю згоду Кіраўніку дзяржавы на назначэнне Прэм'ер-міністра, заслухоўваюць даклад Прэм'ер-міністра аб праграме дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусь і адабраюць або адхіляюць праграму, разглядаюць па ініцыятыве Прэм'ер-міністра пытанне аб даверы Ураду, а таксама па ініцыятыве не менш як адной трэці ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў могуць выказаць вотум недаверу Ураду Рэспублікі Беларусь.

Па ініцыятыве не менш як адной трэці ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў уносіцца Усебеларускаму народнаму сходу прапанова аб выстаўленні абвінавачання Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і зняцці яго з пасады.

У кампетэнцыю Савета Рэспублікі ўваходзяць:

- адабрэнне або адхіленне прынятых Палатай прадстаўнікоў праектаў законаў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, праектаў іншых законаў;
- дача папярэдняй згоды Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь на назначэнне на пасаду і вызваленне ад пасады Генеральнага пракурора, Старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю, Старшыні і членаў Праўлення Нацыянальнага банка;
- аналіз дзейнасці мясцовых Саветаў дэпутатаў, прыняцце мер па развіцці мясцовага самакіравання; адмена рашэнняў мясцовых Саветаў дэпутатаў, якія не адпавядаюць заканадаўству;
- прыняцце рашэння аб роспуску мясцовага Савета дэпутатаў у выпадку сістэматычнага або грубага парушэння ім патрабаванняў заканадаўства і ў іншых выпадках, прадугледжаных законам;
- разгляд указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб увядзенні надзвычайнага становішча, ваеннага становішча, поўнай або частковай мабілізацыі і не пазней як у трохдзённы тэрмін пасля іх унясення прыняцце адпаведнага рашэння.

С одновременным занятием должности Президента Республики Беларусь либо судьи.

Срок полномочий Национального собрания — пять лет, если иное не предусмотрено Конституцией Республики Беларусь. Он может быть продлен на основании закона только в случае войны.

Выборы нового состава палат Национального собрания назначаются не позднее трех месяцев до единого дня голосования. Внеочередные выборы палат Парламента проводятся в течение трех месяцев со дня досрочного прекращения их полномочий.

Первая после выборов сессия палат Национального собрания созывается Центральной избирательной комиссией и начинает свою работу не позднее чем через 30 дней после выборов.

Палаты собираются на сессию, которая открывается в третий вторник сентября и закрывается в последний рабочий день июня следующего года.

Палата представителей, Совет Республики в случае особой необходимости созываются на внеочередную сессию председателями палат по инициативе Президента или большинства депутатов Палаты представителей и членов Совета Республики от полного состава каждой из палат по повестке дня и в срок, определенные инициатором.

Компетенция Парламента реализуется посредством осуществления представительных, законодательных и иных полномочий палат Национального собрания, предусмотренных Конституцией Республики Беларусь.

Компетенцию Палаты представителей составляют:

- рассмотрение по предложению Президента Республики Беларусь, Всебелорусского народного собрания, не менее одной трети от полного состава каждой из палат Парламента либо по инициативе не менее 150 тысяч граждан Республики Беларусь, обладающих избирательным правом, проектов законов о внесении изменений и дополнений в Конституцию Республики Беларусь;
- рассмотрение проектов законов о ратификации и денонсации международных договоров; об основном содержании и принципах осуществления прав, свобод и обязанностей граждан; о гражданстве, статусе иностранцев и лиц без гражданства; о правах национальных меньшинств; об установлении республиканских налогов и сборов; о принципах осуществления отношений собственности; об основах социальной защиты; о принципах регулирования труда и занятости; о браке, семье, детстве, материнстве, отцовстве, воспитании, образовании, культуре и здравоохранении; об охране окружающей среды и рациональном использовании природных ресурсов; об определении порядка решения вопросов административно-территориального устройства государства; о местном самоуправлении; о судоустройстве, судопроизводстве и статусе судей; об уголовной ответственности; об амнистии; об объявлении войны и о заключении мира; о правовых режимах чрезвычайного и военного положений; об установлении государственных наград; о толковании законов; проектов иных законов;
- рассмотрение проектов законов о республиканском бюджете и об утверждении отчета о его исполнении.

Палата представителей назначает выборы Президента Республики Беларусь и осуществляет ряд полномочий, связанных с назначением Премьер-министра и деятельностью Правительства Республики Беларусь. В частности, депутаты дают предварительное согласие Главе государства на назначение Премьер-министра, заслушивают доклад Премьер-министра о программе деятельности Правительства Республики Беларусь и одобряют или отклоняют программу, рассматривают по инициативе Премьер-министра вопрос о доверии Правительству, а также по инициативе не менее одной трети от полного состава Палаты представителей могут выразить вотум недоверия Правительству Республики Беларусь.

По инициативе не менее одной трети от полного состава Палаты представителей вносится Всебелорусскому народному собранию предложение о выдвижении обвинения Президенту Республики Беларусь и смещении его с должности.

В компетенцию Совета Республики входят:

- одобрение или отклонение принятых Палатой представителей проектов законов о внесении изменений и дополнений в Конституцию Республики Беларусь, проектов иных законов;
- дача предварительного согласия Президенту Республики Беларусь на назначение на должность и освобождение от должности Генерального прокурора, Председателя Комитета государственного контроля, Председателя и членов Правления Национального банка;
- анализ деятельности местных Советов депутатов, принятие мер по развитию местного самоуправления; отмена решений местных Советов депутатов, не соответствующих законодательству;
- принятие решения о роспуске местного Совета депутатов в случае систематического или грубого нарушения им требований законодательства и в иных случаях, предусмотренных законом;
- рассмотрение указов Президента Республики Беларусь о введении чрезвычайного положения, военного положения, полной или частичной мобилизации и не позднее чем в трехдневный срок после их внесения принятие соответствующего решения.

Совет Республики в случаях, предусмотренных Конституцией Республики Беларусь, вправе

Савет Рэспублікі ў выпадках, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, мае права звярнуцца да Усебеларускага народнага сходу з ініцыятывай аб увядзенні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь надзвычайнага або ваеннага становішча.

Палаты Нацыянальнага сходу прымаюць рашэнні і па іншых пытаннях, калі гэта прадугледжана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Да агульнай кампетэнцыі палат Парламента адносяцца ініцыяванне склікання нечарговага пасяджэння Усебеларускага народнага сходу, унясенне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь прапановы аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму, заслухоўванне штогадовых пасланняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Парламенту, заслухоўванне інфармацыі Генеральнага пракурора, Старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю і Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка аб выніках іх дзейнасці.

Да пытанняў раздзельнай кампетэнцыі Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі адносяцца:

- пасяджэнні палат для пытанняў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі і адказаў Урада Рэспублікі Беларусь;
- разгляд запытаў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі;
- зварот палат Нацыянальнага сходу ў Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь;
- атрыманне палатамі Нацыянальнага сходу інфармацыі аб выкананні законаў і аб ходзе выканання рэспубліканскага бюджэту;
- узгадненне кандыдатур для назначэння на пасады паслоў Рэспублікі Беларусь у замежных дзяржавах і пастаянных прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь пры міжнародных арганізацыях.

Работа палат Парламента ажыццяўляецца ў форме пасяджэнняў, сумесных пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі, парламенцкіх слуханняў, дзейнасці пастаянных і часовых камісій, іншых органаў Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі, а таксама ў іншых формах у адпаведнасці з заканадаўствам.

У мэтах арганізацыі законапраектнай работы, папярэдняга разгляду і падрыхтоўкі пытанняў, аднесеных да кампетэнцыі палат Нацыянальнага сходу, арганізацыі работы пастаянных камісій і іншых органаў Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі ўтвараюцца Савет Палаты прадстаўнікоў і Прэзідыум Савета Рэспублікі, якія з'яўляюцца пастаянна дзеючымі калегіяльнымі органамі палат Парламента і падсправаздачныя адпаведна Палаце прадстаўнікоў і Савету Рэспублікі.

Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі выбіраюць пастаянныя камісіі палат Нацыянальнага сходу для вядзення законапраектнай работы, папярэдняга разгляду і падрыхтоўкі

обратиться к Всебелорусскому народному собранию с инициативой о введении на территории Республики Беларусь чрезвычайного или военного положения.

Палаты Национального собрания принимают решения и по другим вопросам, если это предусмотрено Конституцией Республики Беларусь.

К общей компетенции палат Парламента относятся инициирование созыва внеочередного заседания Всебелорусского народного собрания, внесение Президенту Республики Беларусь предложения о проведении республиканского референдума, заслушивание ежегодных посланий Президента Республики Беларусь к Парламенту, заслушивание информации Генерального прокурора, Председателя Комитета государственного контроля и Председателя Правления Национального банка о результатах их деятельности.

К вопросам раздельной компетенции Палаты представителей и Совета Республики относятся:

- заседания палат для вопросов депутатов Палаты представителей и членов Совета Республики и ответов Правительства Республики Беларусь;
- рассмотрение запросов депутатов Палаты представителей, членов Совета Республики;
- обращение палат Национального собрания в Конституционный Суд Республики Беларусь;
- получение палатами Национального собрания информации об исполнении законов и о ходе исполнения республиканского бюджета;
- согласование кандидатур для назначения на должности послов Республики Беларусь в иностранных государствах и постоянных представителей Республики Беларусь при международных организациях.

Работа палат Парламента осуществляется в форме заседаний, совместных заседаний Палаты представителей и Совета Республики, парламентских слушаний, деятельности постоянных и временных комиссий, других органов Палаты представителей и Совета Республики, а также в иных формах в соответствии с законодательством.

В целях организации законопроектной работы, предварительного рассмотрения и подготовки вопросов, отнесенных к компетенции палат Национального собрания, организации работы постоянных комиссий и иных органов Палаты представителей и Совета Республики создаются Совет Палаты представителей и Президиум Совета Республики, которые являются постоянно действующими коллегиальными органами палат Парламента и подотчетны соответственно Палате представителей и Совету Республики.

Палата представителей и Совет Республики избирают постоянные комиссии палат Национального собрания для ведения законопроектной

пытанняў, якія адносяцца да кампетэнцыі палат Парламента.

Пастаянныя камісіі з'яўляюцца пастаянна дзеючымі органамі палат Нацыянальнага сходу і выбіраюцца з ліку дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі адпаведнай палатай Парламента на тэрмін паўнамоцтваў палаты ў складзе старшыні, намесніка (намеснікаў) старшыні і членаў пастаянных камісій.

Кожны дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі ўваходзіць у склад толькі адной з пастаянных камісій. Старшыні палат Парламента і іх намеснікі не могуць уваходзіць у склад пастаянных камісій.

Заканатворчасць – асноўная функцыя Парламента Рэспублікі Беларусь. Права заканадаўчай ініцыятывы належыць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Усебеларускаму народнаму сходу, дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, Савету Рэспублікі, Ураду Рэспублікі Беларусь, а таксама грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць выбарчым правам, у колькасці не менш за 50 тысяч чалавек і рэалізуецца шляхам унясення адпаведнага законапраекта ў Палату прадстаўнікоў.

Права заканадаўчай ініцыятывы па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь належыць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Усебеларускаму народнаму сходу, не менш як адной трэці ад поўнага складу кожнай з палат Парламента або не менш як 150 тысячам грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць выбарчым правам.

Законапраекты, вынікам прыняцця якіх можа быць скарачэнне дзяржаўных сродкаў, стварэнне або павелічэнне расходаў, уносяцца ў Палату прадстаўнікоў пры наяўнасці заключэння Урада Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнні Урад маюць права ўносіць у Палату прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі прапановы аб абвяшчэнні разгляду праекта закона тэрміновым. Палаты ў гэтым выпадку павінны разгледзець законапраект на працягу 10 дзён з дня ўнясення на іх разгляд.

Пасяджэнні палат Нацыянальнага сходу, як правіла, з'яўляюцца адкрытымі. Палаты, калі гэтага патрабуюць інтарэсы дзяржавы, могуць прыняць рашэнне аб правядзенні закрытага пасяджэння.

Рашэнні Палаты прадстаўнікоў прымаюцца ў форме законаў і пастаноў. Пастановы Палаты прадстаўнікоў прымаюцца па пытаннях распарадчага і кантрольнага характару. Рашэнні Савета Рэспублікі прымаюцца ў форме пастаноў.

Рашэнні палат лічацца прынятымі пры ўмове, што за іх прагаласавала большасць ад поўнага

работы, предварительного рассмотрения и подготовки вопросов, относящихся к ведению палат Парламента.

Постоянные комиссии являются постоянно действующими органами палат Национального собрания и избираются из числа депутатов Палаты представителей, членов Совета Республики соответствующей палатой Парламента на срок полномочий палаты в составе председателя, заместителя (заместителей) председателя и членов постоянных комиссий.

Каждый депутат Палаты представителей, член Совета Республики входит в состав только одной из постоянных комиссий. Председатели палат Парламента и их заместители не могут входить в состав постоянных комиссий.

Законотворчество – основная функция Парламента Республики Беларусь. Право законодательной инициативы принадлежит Президенту Республики Беларусь, Всебелорусскому народному собранию, депутатам Палаты представителей, Совету Республики, Правительству Республики Беларусь, а также гражданам Республики Беларусь, обладающим избирательным правом, в количестве не менее 50 тысяч человек и реализуется путем внесения соответствующего законопроекта в Палату представителей.

Право законодательной инициативы по внесению изменений и дополнений в Конституцию Республики Беларусь принадлежит Президенту Республики Беларусь, Всебелорусскому народному собранию, не менее одной трети от полного состава каждой из палат Парламента или не менее чем 150 тысячам граждан Республики Беларусь, обладающих избирательным правом.

Законопроекты, следствием принятия которых может быть сокращение государственных средств, создание или увеличение расходов, вносятся в Палату представителей при наличии заключения Правительства Республики Беларусь.

Президент Республики Беларусь либо по его поручению Правительство имеют право вносить в Палату представителей и Совет Республики предложения об объявлении рассмотрения проекта закона срочным. Палаты в этом случае должны рассмотреть законопроект в течение 10 дней со дня внесения на их рассмотрение.

Заседания палат Национального собрания, как правило, являются открытыми. Палаты, если этого требуют интересы государства, могут принять решение о проведении закрытого заседания.

Решения Палаты представителей принимаются в форме законов и постановлений. Постановления Палаты представителей принимаются по вопросам распорядительного и контрольного характера. Решения Совета Республики принимаются в форме постановлений.

складу палат, калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Большасцю не менш як дзве трэці галасоў ад поўнага складу кожнай з палат Нацыянальнага сходу прымаюцца:

- законы аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь;
- законы аб увядзенні ў дзеянне законаў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь;
- законы, вернутыя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь з яго пярэчаннямі для паўторнага разгляду і галасавання, у выпадку пераадолення гэтых пярэчанняў;
- законы аб змяненненні закона, асобныя палажэнні якога вернуты Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь з яго пярэчаннямі для паўторнага разгляду і галасавання, у выпадку пераадолення гэтых пярэчанняў.

Таксама большасцю не менш як дзве трэці галасоў ад поўнага складу кожнай з палат прымаецца рашэнне аб датэрміновым вызваленні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад пасады.

Палаты Нацыянальнага сходу ажыццяўляюць супрацоўніцтва з парламентамі замежных дзяржаў, міжнароднымі парламенцкімі і іншымі міжнароднымі арганізацыямі.

Решения палат считаются принятыми при условии, что за них проголосовало большинство от полного состава палат, если иное не предусмотрено Конституцией Республики Беларусь.

Большинством не менее двух третей голосов от полного состава каждой из палат Национального собрания принимаются:

- законы о внесении изменений и дополнений в Конституцию Республики Беларусь;
- законы о введении в действие законов о внесении изменений и дополнений в Конституцию Республики Беларусь;
- законы, возвращенные Президентом Республики Беларусь с его возражениями для повторного рассмотрения и голосования, в случае преодоления этих возражений;
- законы об изменении закона, отдельные положения которого возвращены Президентом Республики Беларусь с его возражениями для повторного рассмотрения и голосования, в случае преодоления этих возражений.

Также большинством не менее двух третей голосов от полного состава каждой из палат принимается решение о досрочном освобождении Президента Республики Беларусь от должности.

Палаты Национального собрания осуществляют сотрудничество с парламентами иностранных государств, международными парламентскими и иными международными организациями.

Для ажыццяўлення кантактаў з парламентамі замежных дзяржаў і міжнароднымі парламенцкімі арганізацыямі палатамі Парламента з ліку дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі фарміруюцца пастаянна дзеючыя дэлегацыі і рабочыя групы.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі могуць таксама дэлегавацца адпаведна Палатай прадстаўнікоў (Саветам Палаты прадстаўнікоў), Саветам Рэспублікі (Прэзідыумам Савета Рэспублікі) у склад аб'яднаных пастаянна дзеючых дэлегацый і рабочых груп Нацыянальнага сходу, якія прадстаўляюць Парламент пры ажыццяўленні двухбаковых ці шматбаковых парламенцкіх кантактаў або ў міжнародных парламенцкіх арганізацыях.

Статус дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі вызначаецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законам Рэспублікі Беларусь «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь», іншымі заканадаўчымі актамі.

Для осуществления контактов с парламентами иностранных государств и международными парламентскими организациями палатами Парламента из числа депутатов Палаты представителей, членов Совета Республики формируются постоянно действующие делегации и рабочие группы.

Депутаты Палаты представителей и члены Совета Республики могут также делегироваться соответственно Палатой представителей (Советом Палаты представителей), Советом Республики (Президиумом Совета Республики) в состав объединенных постоянно действующих делегаций и рабочих групп Национального собрания, представляющих Парламент при осуществлении двусторонних либо многосторонних парламентских контактов или в международных парламентских организациях.

Статус депутата Палаты представителей, члена Совета Республики определяется Конституцией Республики Беларусь, Законом Республики Беларусь «О статусе депутата Палаты представителей, члена Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь», иными законодательными актами.





# ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СЁМАГА СКЛІКАННЯ

# ДЕПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ НАЦИОНАЛЬНОГО СОБРАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ СЕДЬМОГО СОЗЫВА





## АДАМЕНКА
### Яўгеній Бунiслававіч

Член Пастаяннай камісіі
па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве.
Калінкавіцкая выбарчая акруга № 41

Нарадзіўся 26 жніўня 1960 года ў вёсцы Лубень Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці.

Скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі (электрыфікацыя сельскай гаспадаркі); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Працаваў інжынерам-электрыкам, дырэктарам саўгаса «Завалочыцы» Глускага раёна Магілёўскай вобласці; інструктарам арганізацыйнага аддзела Глускага КПБ; першым намеснікам старшыні, начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Глускага райвыканкама; намеснікам старшыні — начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, старшынёй Калінкавіцкага райвыканкама; старшынёй Мазырскага райвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, быў старшынёй Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Гомельскага аблвыканкама, Калінкавіцкага райвыканкама, ордэнам святіцеля Кірылы Тураўскага I ступені, юбілейнымі медалямі.

Удастоены звання «Ганаровы грамадзянін Мазырскага раёна».



## АДЗІНЦОВА
### Святлана Уладзіміраўна

Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.
Полацкая гарадская выбарчая акруга № 27

Нарадзілася 8 лістапада 1964 года на станцыі Ксты Полацкага раёна Віцебскай вобласці.

Скончыла Віцебскі медыцынскі інстытут (лячэбная справа); клінічную ардынатуру пры Віцебскім медыцынскім інстытуце (хірургія). Кандыдат медыцынскіх навук.

Працавала медсястрой хірургічнага аддзялення Полацкай цэнтральнай раённай бальніцы; урачом-хірургам па аказанні экстраннай дапамогі хірургічнага аддзялення Полацкай цэнтральнай гарадской бальніцы; загадчыкам хірургічнага аддзялення, намеснікам галоўнага ўрача па лячэбнай рабоце, галоўным урачом Полацкай гарадской паліклінікі; намеснікам галоўнага ўрача па амбулаторна-паліклінічнай службе, загадчыкам Полацкай цэнтральнай гарадской паліклінікі, намеснікам галоўнага ўрача па амбулаторна-паліклінічнай рабоце Полацкай цэнтральнай гарадской бальніцы.

Выбіралася дэпутатам Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў 25, 27 і 28-га скліканняў, Полацкага гарадскога Савета дэпутатаў 25-га і 26-га скліканняў. Дэлегат другога — шостага Усебеларускіх народных сходаў.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Полацкага гарадскога Савета дэпутатаў, Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, Віцебскага аблвыканкама, нагрудным знакам Міністэрства аховы здароўя «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь», юбілейнымі медалямі «70 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», «75 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», медалямі Міжнароднага дабрачыннага фонду «Сям'я — Яднанне — Айчына», «За заслугі». Удастоена звання «Жанчына года Віцебшчыны» і ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны».



## АЗАРАНКА
### *Уладзімір Мікалаевіч*

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы.
Крычаўская выбарчая акруга № 83

Нарадзіўся 29 жніўня 1962 года ў вёсцы Алесенкава Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

Скончыў Бранскую дзяржаўную інжынерна-тэхналагічную акадэмію (лясная і лесапаркавая гаспадарка).

Працаваў майстрам лесу, ляснічым, дырэктарам дзяржаўнай лесагаспадарчай установы «Клімавіцкі лясгас».

Выбіраўся дэпутатам Клімавіцкага раённага Савета дэпутатаў 26, 27 і 28-га скліканняў.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, нагруднымі знакамі Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь «30 гадоў бездакорнай службы ў дзяржаўнай лясной ахове Рэспублікі Беларусь», «Ганаровы лесавод».



## АМЕЛЬЯНЮК
### *Аляксандр Паўлавіч*

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве.
Пінская гарадская выбарчая акруга № 14

Нарадзіўся 6 сакавіка 1964 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці.

Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (правазнаўства); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (міжнароднае права).

Працаваў памочнікам пракурора горада Пінска; суддзёй, намеснікам старшыні суда, старшынёй суда горада Пінска; старшынёй суда Пінскага раёна і горада Пінска.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.







## АНАНІЧ
### *Лілія Станіславаўна*

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.
Барысаўская сельская выбарчая акруга № 63

Нарадзілася 2 студзеня 1960 года ў вёсцы Леванова Барысаўскага раёна Мінскай вобласці.

Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І. Леніна (журналістыка); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзелавое адміністраванне).

Працавала фотакарэспандэнтам у мінскай раённай газеце «Шлях камунізму», рэдактарам, старшым рэдактарам у НДІ сродкаў аўтаматызацыі, на розных пасадах у Дзяржаўным камітэце па друку, Міністэрстве культуры і друку, намеснікам, першым намеснікам Міністра інфармацыі, Міністрам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Аўтар Закона Рэспублікі Беларусь «Аб генацыдзе беларускага народа».

Старшыня Рэспубліканскай камісіі па правядзенні ацэнкі сімволікі і атрыбутыкі, інфармацыйнай прадукцыі на прадмет наяўнасці (адсутнасці) у іх прыкмет экстрэмізму. Выдатнік друку Беларусі.

Член праўлення ГА «Беларускі саюз журналістаў», узначальвала Саюз выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў друку, была намеснікам старшыні ГА «Беларускі саюз жанчын». Член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі АДКБ па палітычных пытаннях і міжнародным супрацоўніцтве.

Мае дзяржаўныя ўзнагароды: ордэн Пашаны, Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ганаровыя граматы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджана шэрагам галіновых, грамадскіх і міжнародных узнагарод: медалём «За ўмацаванне парламенцкага супрацоўніцтва ў АДКБ», медалём Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў «МПА СНД. 30 гадоў» і інш.



## АНДРЭЙЧАНКА
### *Уладзімір Паўлавіч*

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.
Докшыцкая выбарчая акруга № 22

Нарадзіўся 2 студзеня 1949 года ў вёсцы Мар'янова Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці.

Скончыў Вялікалуцкі сельскагаспадарчы інстытут (вучоны аграном); Мінскую вышэйшую партыйную школу (палітолаг).

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў аграномам калгаса «Перамога сацыялізму» Верхнядзвінскага раёна, старшым аграномам Лёзненскай райсельгастэхнікі. Быў інструктарам, загадчыкам арганізацыйнага аддзела Лёзненскага райкама ЛКСМБ, інструктарам Лёзненскага райкама КПБ. Працаваў сакратаром парткама саўгаса «Адаменкі», старшынёй калгаса імя Данукалава Лёзненскага раёна. Займаў пасады старшыні Лёзненскага райвыканкама, першага сакратара Верхнядзвінскага райкама КПБ, намесніка старшыні, старшыні Віцебскага аблвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага, другога і трэцяга скліканняў, быў Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага, пятага і шостага скліканняў.

Першы намеснік Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Член Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы, член Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, член Савета Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Мае падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнамі Айчыны II і III ступені (Рэспубліка Беларусь), Дружбы (Расійская Федэрацыя), ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Удастоены ганаровага звання «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь».



## АУТКА
### Аляксандр Віктаравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы.
Гродзенская сельская выбарчая акруга № 53

Нарадзіўся 16 студзеня 1972 года ў вёсцы Гліняны Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці.

Скончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут (заатэхнія).

Працаваў слесарам-рамонтнікам 2-га разраду, памочнікам загадчыка свінафермы, спецыялістам па кормавытворчасці, вядучым заатэхнікам калгаса «Скідзельскі»; галоўным заатэхнікам СВК «Скідзельскі»; начальнікам службы па ўзнаўленні агракамбіната «Ждановічы»; вядучым заатэхнікам-селекцыянерам Гродзенскага племпрадпрыемства; дырэктарам Гродзенскай кантрольна-выпрабавальнай станцыі па свінагадоўлі; першым намеснікам начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Гродзенскага райвыканкама; намеснікам старшыні па жывёлагадоўлі СВК «Скідзельскі»; дырэктарам прыватнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Скідзельскае»; дырэктарам філіяла «Скідзельскі» прыватнага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Скідзельаграпрадукт»; дырэктарам філіяла «Скідзельскі», першым намеснікам генеральнага дырэктара агракамбіната «Скідзельскі».

Выбіраўся дэпутатам Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў 26, 27 і 28-га скліканняў.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## АЎТУХОВА
### Таццяна Анатольеўна

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.
Віцебская-Чкалаўская выбарчая акруга № 18

Нарадзілася 24 верасня 1965 года ў вёсцы Застадолле Сенненскага раёна Віцебскай вобласці.

Скончыла Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя С.М. Кірава (педагогіка і методыка пачатковага навучання).

Працавала настаўнікам у СШ № 21, намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце СШ № 24 і 32 горада Віцебска, дырэктарам ДУА «Сярэдняя школа № 45 горада Віцебска».

Выбіралася дэпутатам Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў 26-га і 27-га скліканняў, Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Мае Падзяку Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Віцебскага аблвыканкама, Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў.



## БАБАЛОВІЧ
### Аляксандр Сяргеевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве.
Столінская выбарчая акруга № 16

Нарадзіўся 24 верасня 1964 года ў рабочым пасёлку Рэчыца Столінскага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыў Ленінградскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчы інстытут, інжынер-механік.

Працаваў старшым дыспетчарам аўтатранспарту Столінскай райсельгастэхнікі; загадчыкам абменнага пункта ААТ «Столінскае райагразабеспячэнне»; начальнікам перасоўнай механізаванай калоны ААТ «Столінрайаграсэрвіс»; начальнікам філіяла КУП «Брэстаблдарбуд» Столінскага дарожнага рамонтна-будаўнічага ўпраўлення № 141.

Выбіраўся дэпутатам Столінскага раённага Савета дэпутатаў 26-га і 27-га скліканняў.

З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, быў членам Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве.

Мае Падзячнае пісьмо Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалямі «Абаронцу Айчыны», «За заслугі» I ступені, юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## БАРТАШ
### Святлана Уладзіміраўна

Член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах.
Днепра-Бугская выбарчая акруга № 10

Нарадзілася 4 мая 1969 года ў вёсцы Салава Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыла Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (эканоміка і кіраванне ў галінах аграпрамысловага комплексу).

Працавала эканамістам па працы, галоўным эканамістам калгаса «Іскра» Драгічынскага раёна; на розных пасадах у эканамічным аддзеле ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Драгічынскага райвыканкама, намеснікам начальніка, начальнікам эканамічнага аддзела ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Драгічынскага райвыканкама; старшынёй Драгічынскай раённай прафсаюзнай арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў аграпрамысловага комплексу; старшынёй Драгічынскага раённага Савета дэпутатаў.

Выбіралася дэпутатам Драгічынскага раённага Савета дэпутатаў 26, 27 і 28-га скліканняў.

Член Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці, ГА «Беларускі саюз жанчын».

Мае Падзячнае пісьмо Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Драгічынскага райвыканкама, Драгічынскага раённага Савета дэпутатаў, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, юбілейнымі і памятнымі медалямі.



## БЕГЕБА
### Валянціна Канстанцінаўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы. Пінская сельская выбарчая акруга № 15

Нарадзілася 18 мая 1968 года ў вёсцы Лунін Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыла Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.С. Пушкіна (руская мова і літаратура); УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна» (правазнаўства).

Працавала арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай работы Язвінскай СШ Лунінецкага раёна; сакратаром Лунінецкага гаркама ВЛКСМ; служыла ў органах унутраных спраў Брэсцкага аблвыканкама; працавала вядучым спецыялістам па жыллёвых пытаннях, вядучым спецыялістам аддзела па працы, сацыяльнай абароне насельніцтва, якое пацярпела ад катастрофы на ЧАЭС, намеснікам начальніка па вучэбнай рабоце аддзела адукацыі, начальнікам аддзела адукацыі Пінскага райвыканкама; дырэктарам КУП «Дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Світанак».

З'яўлялася дэпутатам Пінскага раённага Савета дэпутатаў 25-га і 26-га скліканняў.

Член РГА «Белая Русь», ГА «Беларускі саюз жанчын».

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі, Пінскага райвыканкама, Дэпартамента па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС МНС Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва, галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама, граматай Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Мае падзяку Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.



## БЕЛАКОНЕЎ
### Алег Аляксеевіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы. Пухавіцкая выбарчая акруга № 65

Нарадзіўся 15 мая 1965 года ў пасёлку Барабаш Хасанскага раёна Прыморскага краю (Расійская Федэрацыя) у сям'і ваеннаслужачага.

Скончыў Омскае вышэйшае агульнавайсковае каманднае двойчы Чырванасцяжнае вучылішча імя М.В. Фрунзэ; камандна-штабны факультэт Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь; факультэт Генеральнага штаба Узброеных Сіл Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь. Генерал-маёр.

Праходзіў службу на асноўных камандных пасадах — камандзіра ўзвода, камандзіра роты, камандзіра батальёна, начальніка штаба палка, камандзіра брыгады, намесніка камандуючага войскамі Заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, камандуючага сіламі спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першага намесніка Міністра абароны Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» II і III ступені, 25 медалямі, у тым ліку «За адзнаку ў воінскай службе» I ступені, «За бездакорную службу» I, II і III ступені, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## БРЫЧ
### Леанід Рыгоравіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы. Брэсцкая-Заходняя выбарчая акруга № 1

Нарадзіўся 12 снежня 1958 года ў вёсцы Заплессе Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыў Магілёўскі тэхналагічны інстытут, інжынер-тэхнолаг.

Працаваў тэхнолагам, начальнікам аддзела грамадскага харчавання ўпраўлення працоўнага забеспячэння «Галоўпалессеводбуд» горада Пінска, дырэктарам Пінскага трэста сталовых і рэстаранаў, дырэктарам ААТ «Надзея-Пінск», генеральным дырэктарам ААТ «Берасцейскі пекар» горада Брэста.

Выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў 26-га і 27-га скліканняў.

З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, быў намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы.

З'яўляецца намеснікам старшыні Камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па эканамічнай палітыцы, прамысловасці і гандлі.

Мае падзячныя пісьмы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць», юбілейнымі медалямі, ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, Брэсцкага аблвыканкама, Брэсцкага гарвыканкама, Брэсцкага абласнога і Брэсцкага гарадскога Саветаў дэпутатаў, граматамі адміністрацыі Ленінскага раёна горада Брэста.



## ВАБІШЧЭВІЧ
### Пётр Андрэевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах. Лагойская выбарчая акруга № 75

Нарадзіўся 18 красавіка 1963 года ў вёсцы Рубель Столінскага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага (настаўнік фізікі і матэматыкі).

Працаваў настаўнікам фізікі і матэматыкі, намеснікам дырэктара па навучальна-выхаваўчым працэсе Астрашыцкай школы; дырэктарам Крамянецкай базавай школы; старшынёй Янушкавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Лагойскага раёна; начальнікам аддзела культуры Лагойскага райвыканкама; старшынёй Лагойскага раённага Савета дэпутатаў.

Выбіраўся дэпутатам Лагойскага раённага Савета дэпутатаў 25, 26 і 27-га скліканняў.

З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, быў членам Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах.

Член Камуністычнай партыі Беларусі.

Мае падзячныя пісьмы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Падзякай Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, падзякай старшыні Мінскага аблвыканкама.



## ВАРАНЕЦКІ
### Валерый Іосіфавіч

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.
Свіслацкая выбарчая акруга № 94

Нарадзіўся 14 кастрычніка 1963 года ў горадзе Мінску.

Скончыў Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт; аспірантуру гэтага ўніверсітэта; Дыпламатычную акадэмію Міністэрства замежных спраў Расійскай Федэрацыі (міжнародныя эканамічныя адносіны). Кандыдат эканамічных навук.

Працаваў Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Славацкай Рэспубліцы, намеснікам Міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Аўстрыйскай Рэспубліцы і Рэспубліцы Харватыя па сумяшчальніцтве, Пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры міжнародных арганізацыях у Вене, Пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе.

З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, быў старшынёй Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.

Мае дыпламатычны ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны Аўстрыйскай Рэспублікі (Вялікі Крыж І ступені), медалямі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў «За ўмацаванне парламенцкага супрацоўніцтва», Беларускага фонду міру «Заслужаны міратворац», «100 год дыпламатычнай службе Беларусі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



## ВАСІЛЕВІЧ
### Марыя Віктараўна

Член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.
Кальварыйская выбарчая акруга № 104

Нарадзілася 9 красавіка 1997 года ў горадзе Мінску.

Скончыла Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (дзяржаўнае кіраванне); магістратуру Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта (эканоміка); Маскоўскі інстытут псіхааналізу па праграме «Асновы псіхалагічнай навукі і практыкі».

Працавала спецыялістам па развіцці бізнесу ТАА «ТДИ Промоивент», рэдактарам аддзела рэдактараў галоўнай дырэкцыі падрыхтоўкі тэлепраграм генеральнага прадзюсарскага цэнтра Белтэлерадыёкампаніі.

У 2019 годзе атрымала спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за значны ўклад у развіццё міжнароднага культурнага супрацоўніцтва, актыўную дабрачынную дзейнасць.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь.



## ВАСІЛЬКОЎ
### Мікалай Андрэевіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы.
Буда-Кашалёўская выбарчая акруга № 38

Нарадзіўся 1 красавіка 1958 года ў вёсцы Бярозаўка Кармянскага раёна Гомельскай вобласці.

Скончыў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (лячэбная справа); Беларускую медыцынскую акадэмію паслядыпломнай адукацыі (грамадскае здароўе і ахова здароўя).

Працаваў участковым тэрапеўтам, загадчыкам тэрапеўтычнага аддзялення, намеснікам галоўнага ўрача, загадчыкам паліклінікі тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання горада Гомеля, галоўным урачом Гомельскай абласной клінічнай паліклінікі, начальнікам упраўлення аховы здароўя Гомельскага аблвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў 23-га склікання, Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў 25-га і 26-га скліканняў.

З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, быў намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы.

Старшыня Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па прыродных рэсурсах, экалогіі і ахове навакольнага асяроддзя.

Ганаровы грамадзянін Кармянскага раёна Гомельскай вобласці.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



## ВАСЬКО
### Марына Віктараўна

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.
Брэсцкая-Цэнтральная выбарчая акруга № 2

Нарадзілася 1 мая 1975 года ў горадзе Брэсце.

Скончыла Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна (беларуская мова, літаратура і гісторыя); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай сферай).

Працавала настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце ДУА «Гімназія № 2 горада Брэста».

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, упраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама, прэзідыума Брэсцкага гаркама Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі, граматай і падзячным пісьмом Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.



## ВАСЮКОЎ
### Віталій Міхайлавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах.
Аршанская-Дняпроўская выбарчая акруга № 26

Нарадзіўся 13 лістапада 1974 года ў горадзе Віцебску.

Скончыў Беларускі камерцыйны ўніверсітэт кіравання (эканоміка і кіраванне вытворчасцю); магістратуру Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта (фінансы і крэдыт); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае рэгуляванне нацыянальнай эканомікі).

Працаваў інжынерам, інспектарам Віцебскага цэнтра па налічэнні і выплаце пенсій і дапамог; эканамістам, вядучым эканамістам, намеснікам начальніка аддзела па рабоце з юрыдычнымі асобамі, начальнікам аддзела рэсурсаў і каштоўных папер, начальнікам аддзела карпаратыўнага бізнесу філіяла № 200 Віцебскага абласнога ўпраўлення ААТ «ААБ Беларусбанк»; дырэктарам філіяла № 215 ААТ «ААБ Беларусбанк» у горадзе Оршы.

Выбіраўся дэпутатам Аршанскага раённага Савета дэпутатаў 26-га і 27-га скліканняў, дэпутатам Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Віцебскага аблвыканкама, Аршанскага раённага Савета дэпутатаў, падзякай і Ганаровай граматай ААТ «ААБ Беларусбанк».



## ВОЛКАЎ
### Ігар Уладзіміравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.
Жлобінская выбарчая акруга № 40

Нарадзіўся 12 студзеня 1970 года ў вёсцы Капцэвічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці.

Скончыў Гомельскі дзяржуніверсітэт імя Ф. Скарыны (фізіка); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай сферай).

Служыў у радах Узброеных Сіл.

Працаваў выкладчыкам агульнатэхнічных дысцыплін тэхнікума; дырэктарам сярэдняй школы № 2 горада Жлобіна; загадчыкам аддзела адукацыі, спорту і турызму Жлобінскага райвыканкама; старшынёй Жлобінскага раённага Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Выбіраўся дэпутатам Чырвонабярэжскага сельскага Савета дэпутатаў, намеснікам старшыні Чырвонабярэжскага сельскага Савета дэпутатаў 24-га склікання, дэпутатам Жлобінскага раённага Савета дэпутатаў 26, 27 і 28-га скліканняў.

З'яўляецца членам рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Чэшскай Рэспублікі, Каралеўства Швецыя і з асобнымі дзяржавамі Азіі (Народная Рэспубліка Бангладэш, Федэратыўная Дэмакратычная Рэспубліка Непал, Дэмакратычная Сацыялістычная Рэспубліка Шры-Ланка).

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Жлобінскага раённага Савета дэпутатаў, Жлобінскага райвыканкама, упраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама, юбілейнымі медалямі «100 гадоў Камуністычнай партыі Беларусі і Беларускай ССР», «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў».





## ГАЙДУК
### Аксана Вячаславаўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве.
Ясенінская выбарчая акруга № 100

Нарадзілася 6 лютага 1974 года ў вёсцы Зорная Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыла Беларускую дзяржаўную політэхнічную акадэмію (будаўніцтва аўтамабільных дарог і аэрадромаў); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне дзяржаўнага кіравання.

Працавала першым намеснікам генеральнага дырэктара дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама».

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, адміністрацый Маскоўскага і Фрунзенскага раёнаў горада Мінска, нагрудным знакам Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь «За заслугі», нагрудным знакам «Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі».



## ГАЙДУКЕВІЧ
### Алег Сяргеевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.
Калінаўская выбарчая акруга № 108

Нарадзіўся 26 сакавіка 1977 года ў горадзе Мінску.

Скончыў Акадэмію Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь (правазнаўства); Інстытут дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (міжнародныя адносіны).

Працаваў оперупаўнаважаным, старшым оперупаўнаважаным АБЭЗ Фрунзенскага РУУС горада Мінска, старшым оперупаўнаважаным аддзела цяжкіх злачынстваў УБЭЗ ГУУС Мінгарвыканкама, намеснікам начальніка АБЭЗ Партызанскага РУУС горада Мінска, начальнікам АБЭЗ Фрунзенскага РУУС горада Мінска, першым намеснікам начальніка, начальнікам Партызанскага РУУС горада Мінска, начальнікам Фрунзенскага РУУС горада Мінска; намеснікам старшыні, першым намеснікам старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі.

Член Вышэйшага савета ЛДПБ, старшыня ЛДПБ на грамадскіх пачатках.

Уваходзіць у склад дэпутацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкім Сходзе Саюза Беларусі і Расіі, дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленні кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы, кіраўнік рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Літвы і Нідэрландаў.

Узнагароджаны медалямі «За бездакорную службу» III ступені, «За працоўныя заслугі», «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў», Парламенцкай асамблеі АДКБ «За ўмацаванне парламенцкага супрацоўніцтва ў АДКБ», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў». Мае падзякі Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.



## ГАНЧУК
### Андрэй Аляксандравіч

Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.
Шклоўская выбарчая акруга № 90

Нарадзіўся 20 сакавіка 1979 года ў гарадскім пасёлку Бялынічы Магілёўскай вобласці.

Скончыў Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова (гісторыя і сацыяльна-палітычныя дысцыпліны); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Працаваў настаўнікам, дырэктарам базавай і сярэдняй школ; начальнікам аддзела па справах моладзі, намеснікам начальніка і начальнікам аддзела адукацыі, спорту і турызму, намеснікам старшыні Бялыніцкага райвыканкама; старшынёй Бялыніцкага раённага Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Выбіраўся дэпутатам Бялыніцкага раённага Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў.

Узнагароджаны юбілейным медалём «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ГАРДЗЕЙЧЫК
### Іван Аркадзьевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях.
Уруцкая выбарчая акруга № 109

Нарадзіўся 20 кастрычніка 1957 года ў вёсцы Вясея Слуцкага раёна Мінскай вобласці.

Скончыў Разанскае вышэйшае паветрана-дэсантнае каманднае вучылішча імя Ленінскага камсамола (камандная тактычная, інжынер па эксплуатацыі бранятанкавай тэхнікі); Ваенную акадэмію імя М.В. Фрунзэ (камандна-штабная аператыўна-тактычная паветрана-дэсантных войскаў); Ваенную акадэмію Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі (вайсковае і дзяржаўнае кіраванне); генерал-маёр.

Праходзіў службу на асноўных камандных пасадах – камандзіра разведвальнага ўзвода, роты, намесніка камандзіра, камандзіра парашутна-дэсантнага батальёна, камандзіра парашутна-дэсантнага палка, камандзіра асобнай гвардзейскай мабільнай брыгады, намесніка камандуючага войскамі, начальніка штаба – першага намесніка камандуючага войскамі Заходняга аператыўнага камандавання; першага намесніка начальніка Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь. Звольнены з Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь у запас у 2015 годзе.

Намеснік кіраўніка рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Рэспублікі Узбекістан.

Старшыня Рэспубліканскага савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.

Узнагароджаны 39 ордэнамі і медалямі, у тым ліку ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За бездакорную службу» І і ІІ ступені, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ГАЦКО
### Уладзімір Уладзіміравіч

Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.
Бабруйская сельская выбарчая акруга № 80

Нарадзіўся 11 верасня 1970 года ў вёсцы Цялуша Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці.

Скончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (лячэбная справа); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай сферай).

Працаваў загадчыкам прыёмнага аддзялення, загадчыкам пульманалагічнага аддзялення Бабруйскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі; галоўным урачом Бабруйскай цэнтральнай бальніцы.

Выбіраўся дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў 26, 27 і 28-га скліканняў.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам Міністэрства аховы здароўя «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



## ГОЛУБ
### Наталля Грыгор'еўна

Член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах.
Івацэвіцкая выбарчая акруга № 11

Нарадзілася 21 чэрвеня 1987 года ў горадзе Бабруйску Магілёўскай вобласці.

Скончыла Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію (бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне і права), магістратуру Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне і права).

Працавала намеснікам галоўнага бухгалтара, сакратаром-юрысконсультам ААТ «Вінец»; першым сакратаром Бярозаўскай раённай арганізацыі ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Выбіралася дэпутатам Сігневіцкага сельскага Савета дэпутатаў.

Член Камуністычнай партыі Беларусі, ГА «Беларускі саюз жанчын», РГА «Белая Русь», ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў».

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, граматамі Брэсцкага абласнога камітэта ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», Цэнтральнага камітэта ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», юбілейнымі і памятнымі медалямі.



## ГОРВАЛЬ
### Святлана Аляксандраўна

Член Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы.
Віцебская-Чыгуначная выбарчая акруга № 19

Нарадзілася 25 жніўня 1986 года ў горадзе Валожыне Мінскай вобласці.

Скончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы, эканаміст.

Працавала спецыялістам аддзела рознічнага гандлю, начальнікам аддзела рознічнага гандлю ў ААТ «Гандлёвы дом «Нёман» горада Гродна; намеснікам дырэктара, дырэктарам ААТ «Віцебскі ўнівермаг».

Выбіралася дэпутатам Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

З'яўлялася кіраўніком маладзёжнай парламенцкай дэлегацыі Рэспублікі Беларусь для ўдзелу ў дзейнасці маладзёжнай Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў, Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь, ганаровым знакам Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў «За ўклад у міжнароднае маладзёжнае супрацоўніцтва».

Занесена на Дошку гонару адміністрацыі Чыгуначнага раёна горада Віцебска. Удастоена ганаровага звання «Віцябчанін года — 2018».



## ГРАНКОЎСКІ
### Аляксандр Аляксандравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі.
Аўтазаводская выбарчая акруга № 92

Нарадзіўся 9 лістапада 1963 года ў гарадскім пасёлку Наваельня Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці.

Скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, інжынер-механік.

Працаваў майстрам, начальнікам участка, начальнікам цэха, галоўным інжынерам інструментальна-штампавай вытворчасці, намеснікам генеральнага дырэктара ААТ «Мінскі аўтамабільны завод» — кіруючая кампанія холдынга «БЕЛАЎТАМАЗ» — тэхнічным дырэктарам.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленні кантактаў з Лацінаамерыканскім парламентам.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.







## ДАВЫДЗЬКА
### Генадзь Браніслававіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.
Усходняя выбарчая акруга № 107

Нарадзіўся 29 верасня 1955 года ў горадзе Сянно Віцебскай вобласці.

Скончыў Далёкаўсходні педагагічны інстытут мастацтваў, акцёр драматычнага тэатра і кіно; Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, рэжысёр драмы. Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Працаваў акцёрам у Арэнбургскім абласным драматычным тэатры імя М. Горкага і Магілёўскім абласным тэатры драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча, артыстам драмы, дырэктарам, генеральным дырэктарам Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы; старшынёй Белтэлерадыёкампаніі. З'яўляўся аўтарам праграм і вядучым на Беларускім тэлебачанні.

Быў старшынёй РГА «Белая Русь».

З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга і чацвёртага скліканняў.

Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ДАЛГАШЭЙ
### Тамара Сяргееўна

Член Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы.
Гродзенская-Ленінская выбарчая акруга № 52

Нарадзілася 27 ліпеня 1960 года ў вёсцы Савічы Брагінскага раёна Гомельскай вобласці.

Скончыла Гродзенскі медыцынскі інстытут, урач-кардыёлаг.

Прайшла шлях ад урача-кардыёлага Гомельскага абласнога кардыялагічнага дыспансера да галоўнага ўрача ўстановы аховы здароўя «Гродзенскі абласны клінічны кардыялагічны цэнтр».

З'яўлялася членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання, была намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была членам Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, медалём Еўфрасінні Полацкай, юбілейнымі медалямі. Удастоена звання «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



## ДАНЧАНКА
### Аляксандр Міхайлавіч

Член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы.
Гомельская-Сельмашаўская выбарчая акруга № 32

Нарадзіўся 18 чэрвеня 1964 года ў пасёлку Бабакі Навазыбкаўскага раёна Бранскай вобласці (Расійская Федэрацыя).

Скончыў Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.В. Сухога.

Працаваў электразваршчыкам; начальнікам атрада ваенізаванай аховы Гомельскага завода ліцця і нармалей; начальнікам аддзела Гомельскай мытні; начальнікам аддзела Камітэта дзяржаўнага кантролю Гомельскай вобласці; намеснікам начальніка аддзела Гомельскага аблвыканкама; намеснікам дырэктара па эканамічнай бяспецы, начальнікам упраўлення бяспекі Гомельскага завода ліцця і нармалей.

З 1983 па 1985 год праходзіў ваенную службу на тэрыторыі Рэспублікі Афганістан.

З'яўляецца намеснікам старшыні Гомельскай абласной арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане».

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны медалём «За адвагу», Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР воіну-інтэрнацыяналісту, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ДАЎГАЛА
### Ірына Віктараўна

Член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве.
Гомельская-Савецкая выбарчая акруга № 34

Нарадзілася 8 сакавіка 1967 года ў горадзе Крычаве Магілёўскай вобласці.

Скончыла Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны (руская мова і літаратура, правазнаўства); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Працавала піянерважатай сярэдняй школы № 21; сакратаром камітэта камсамола Гомельскага музычнага вучылішча мастацтваў імя Н.Ф. Сакалоўскага; на розных пасадах у камісіі па справах непаўналетніх Цэнтральнага раёна горада Гомеля і камісіі па справах непаўналетніх горада Гомеля, аддзеле па справах моладзі Гомельскага гарвыканкама; намеснікам кіраўніка адміністрацыі Навабеліцкага раёна горада Гомеля; начальнікам галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама.

З'яўляецца старшынёй пярвічнай арганізацыі ГА «Белая Русь» Палаты прадстаўнікоў.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Гомельскага аблвыканкама, Гомельскага гарвыканкама, нагруднымі знакамі «Выдатнік друку Беларусі», «За ўклад у развіццё культуры Беларусі». Мае падзякі Гомельскага аблвыканкама, Міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь і шэраг іншых узнагарод.



## ДАШКО
### Анатолій Міхайлавіч

Член Пастаяннай камісіі па працы
і сацыяльных пытаннях.
Брэсцкая-Усходняя выбарчая акруга № 3

Нарадзіўся 25 студзеня 1960 года ў горадзе Нясвіжы Мінскай вобласці.

Скончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, урач-лячэбнік; Беларускую медыцынскую акадэмію паслядыпломнай адукацыі (арганізацыя аховы здароўя).

Працаваў урачом-акушэрам-гінеколагам, раённым гінеколагам Ганцавіцкай цэнтральнай бальніцы Брэсцкай вобласці; клінічным ардынатарам кафедры акушэрства і гінекалогіі Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута; урачом-акушэрам-гінеколагам Брэсцкага радзільнага дома; загадчыкам 1-га гінекалагічнага аддзялення, галоўным урачом Брэсцкага абласнога радзільнага дома.

Выбіраўся дэпутатам Брэсцкага гарадскога Савета дэпутатаў 27-га склікання.

З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, быў членам Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, упраўлення аховы здароўя Брэсцкага аблвыканкама.



## ДЗЕМІДОВІЧ
### Васілій Мікалаевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі
па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве.
Кобрынская выбарчая акруга № 12

Нарадзіўся 24 снежня 1961 года ў вёсцы Пузі Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыў Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя С.М. Кірава, настаўнік выяўленчага мастацтва і чарчэння.

Служыў у радах Савецкай арміі.

Занесены ў Кнігу гонару вайсковай часці.

Працаваў майстрам вытворчага навучання, старшым майстрам, намеснікам дырэктара, дырэктарам УА «Кобрынскі дзяржаўны мастацкі каледж»; дырэктарам УА «Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж».

З'яўляўся дэпутатам Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў 26-га склікання, дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў 25, 26 і 27-га скліканняў.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, быў членам Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве.

Мае падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны сярэбраным медалём лаўрэата ВДНГ СССР, медалём Францыска Скарыны, ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, нагруднымі знакамі «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» і «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», ганаровым знакам «За заслугі ў развіцці сістэмы прафтэхадукацыі».



## ДЗІК
### Сяргей Канстанцінавіч

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.
Коласаўская выбарчая акруга № 106

Нарадзіўся 10 сакавіка 1956 года ў горадзе Жодзіна Мінскай вобласці.

Скончыў Мінскі радыётэхнічны інстытут (радыётэхніка). Кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт.

Працаваў у Інстытуце электронікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыеэлектронікі. Прайшоў працоўны шлях ад дацэнта да першага прарэктара ўніверсітэта.

Аўтар каля 300 навуковых прац, сярод якіх манаграфіі, 17 вучэбна-метадычных дапаможнікаў, 2 вучэбныя дапаможнікі з грыфам Міністэрства адукацыі і 21 патэнт на вынаходствы.

Член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па палітычных пытаннях і міжнародным супрацоўніцтве, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Фінляндскай Рэспублікі, намеснік кіраўніка рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, нагрудным знакам Міністэрства адукацыі «Выдатнік адукацыі». Мае Падзяку Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ДУБАЎ
### Аляксандр Васільевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы.
Сенненская выбарчая акруга № 30

Нарадзіўся 11 красавіка 1955 года ў горадзе Вязнікі Уладзімірскай вобласці (Расійская Федэрацыя).

Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

Працаваў на розных пасадах у органах пракуратуры Віцебскай вобласці, Віцебскім транспартным пракурорам, Мінскім транспартным пракурорам, першым намеснікам Беларускага транспартнага пракурора, намеснікам Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў 22-га склікання.

Мае ганаровае званне «Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь». Ганаровы работнік пракуратуры.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.



## ДУМБАДЗЕ
### Тэнгіз Шукрыевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.
Партызанская выбарчая акруга № 110

Нарадзіўся 7 ліпеня 1964 года ў пасёлку Энергетыкаў Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці.

Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (гісторыя).

Працаваў настаўнікам гісторыі ў Негарэльскай сярэдняй школе; рэдактарам, галоўным рэдактам рускай рэдакцыі Дэпартамента па тэлебачанні і радыёвяшчанні Аджарскай Аўтаномнай Рэспублікі; палітычным аглядальнікам, намеснікам дырэктара дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАТ «Другі нацыянальны канал»; кіраўніком Прадстаўніцтва ТРА Саюза ў горадзе Мінску ДУ «Тэлерадыёвяшчальная арганізацыя Саюзнай дзяржавы»; прадзюсарам выканаўчай дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАТ «Другі нацыянальны канал».

Неаднаразова прызнаваўся найлепшым рэпарцёрам, вядучым і аўтарам у намінацыі «Лепшая грамадска-палітычная праграма» Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу «Тэлевяршыня».

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па палітычных пытаннях і міжнародным супрацоўніцтве, кіраўнік рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Грузіі, асобных дзяржаў Цэнтральнай Афрыкі (Габонская Рэспубліка, Рэспубліка Камерун, Рэспубліка Конга, Рэспубліка Чад).

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў і Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» «Дрэва дружбы», юбілейнымі медалямі, ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



## ЖАЛНЕРЧЫК
### Людміла Мікалаеўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве.
Баранавіцкая сельская выбарчая акруга № 7

Нарадзілася 30 красавіка 1964 года ў вёсцы Леснікі Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (правазнаўства).

Праходзіла службу на пасадах следчага, старшага следчага следчага аддзела Асіповіцкага гарадскога і раённага выканкамаў Магілёўскай вобласці; старшага следчага па асабліва важных справах следчага ўпраўлення УУС Брэсцкага аблвыканкама. Узначальвала ўпраўленне занальна-лінейнага кантролю папярэдняга расследавання, штаб УУС Брэсцкага аблвыканкама. Закончыла службу на пасадзе намесніка начальніка ўпраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Брэсцкай вобласці.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана медалём «За бездакорную службу» I, II і III ступені, нагрудным знакам Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь «За заслугі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, Брэсцкага аблвыканкама, Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў.

Удастоена ганаровага звання «Чалавек года — 2007» у праваахоўнай сферы.



## ЗАВАЛЕЙ
### Ігар Уладзіміравіч

Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.
Гомельская сельская выбарчая акруга № 37

Нарадзіўся 15 лютага 1985 года ў горадзе Сургуце Цюменскай вобласці (Расійская Федэрацыя).

Скончыў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны (фізічная культура); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне і права), магістратуру (дзяржаўнае кіраванне і права).

Працаваў інструктарам-метадыстам спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву № 1 горада Гомеля; інструктарам-метадыстам установы «Школа вышэйшага спартыўнага майстэрства» горада Гомеля; вядучым спецыялістам, галоўным спецыялістам упраўлення спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама; першым сакратаром Гомельскага абкама ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Кандыдат у майстры спорту па лёгкай атлетыцы.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, упраўлення спорту і турызму Гомельскага аблвыканкама, юбілейным медалём «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў», памятным знакам «МПА СНД. 30 гадоў».



## ЗАЙЦАЎ
### Яўгеній Станіслававіч

Член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы.
Брэсцкая-Пагранічная выбарчая акруга № 4

Нарадзіўся 2 чэрвеня 1970 года ў горадзе Мсціславе Магілёўскай вобласці.

Скончыў Харкаўскае вышэйшае ваеннае камандна-інжынернае вучылішча ракетных войскаў імя Маршала Савецкага Саюза М.І. Крылова; камандна-штабны факультэт Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь; Беларускі інстытут правазнаўства; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Палкоўнік.

З 1992 года праходзіў ваенную службу на розных пасадах — ад інжынера аддзялення ракетнага палка да камандзіра артылерыйскай брыгады. З 2012 па 2019 год — ваенны камісар Брэсцкай вобласці, начальнік Брэсцкага гарнізона.

Выбіраўся дэпутатам Брэсцкага гарадскога Савета дэпутатаў 26-га склікання, дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў.

Узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені, медалямі «За бездакорную службу» II і III ступені, ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь.



## ЗДОРЫКАВА
### Людміла Яўгеньеўна

Член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.
Магілёўская-Цэнтральная выбарчая акруга № 85

Нарадзілася 9 мая 1973 года ў вёсцы Сялец Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці.

Скончыла Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.А. Куляшова (руская мова і літаратура).

Працавала настаўнікам рускай мовы і літаратуры, намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце, дырэктарам ДУА «Сярэдняя школа № 27 горада Магілёва».

Выбіралася дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

З'яўляецца членам Камуністычнай партыі Беларусі.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, аддзела адукацыі Магілёўскага гарвыканкама, Магілёўскага гарвыканкама, упраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама, аддзела адукацыі, спорту і турызму адміністрацыі Ленінскага раёна горада Магілёва, галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага гарвыканкама, юбілейным медалём «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў».



## ЗЛОТНІКАЎ
### Андрэй Анатольевіч

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы (2019–2023).
Гомельская-Цэнтральная выбарчая акруга № 33

Нарадзіўся 27 красавіка 1970 года ў горадзе Ленінградзе, памёр 7 сакавіка 2023 года.

Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, сацыёлаг. Кандыдат сацыялагічных навук, дацэнт.

Працаваў спецыялістам па маркетынгу КМП «Галактыка» (г. Гомель); галоўным эканамістам ТАА «Зеўс» (г. Гомель); вядучым спецыялістам сакратарыята Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў; выконваючым абавязкі старшыні Прыбарскага сельскага выканаўчага камітэта Гомельскага раёна; выкладчыкам, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры «Філасофія і сацыялогія» ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.В. Сухога»; дацэнтам кафедры паліталогіі і сацыялогіі, намеснікам дэкана юрыдычнага факультэта ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны».

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## КАЛЯСНЁВА
### Алена Пятроўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.
Горацкая выбарчая акруга № 82

Нарадзілася 7 жніўня 1967 года ў горадзе Горкі Магілёўскай вобласці.

Скончыла Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-эканаміст; аспірантуру (эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай). Кандыдат эканамічных навук, дацэнт.

Працавала эканамістам Віцебскага ВА «Маналіт»; асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры маркетынгу, дэканам факультэта бізнесу і права, прарэктарам па вучэбнай рабоце (завочным навучанні) УА «Беларуская дзяржаўная ордэнаў Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчая акадэмія».

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была членам Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.

Член Пастаяннай камісіі па навуцы і адукацыі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Магілёўскага аблвыканкама, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, памятным знакам Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД «МПА СНД. 30 гадоў».



## КАМАРОЎСКІ
### Ігар Сяргеевіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі.
Паўднёва-Заходняя выбарчая акруга № 99

Нарадзіўся 7 студзеня 1971 года ў горадзе Мінску.

Скончыў Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, інжынер-механік; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, эканаміст-менеджар.

Працаваў інжынерам-канструктарам, намеснікам начальніка, начальнікам тэхнічнага аддзела, намеснікам дырэктара па вытворчасці, дырэктарам Мінскага вагонарамонтнага завода.

З'яўляўся дэпутатам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў 27-га склікання.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, быў намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па энергетыцы і транспарце.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, адміністрацыі Маскоўскага раёна горада Мінска, Беларускай чыгункі, нагрудным знакам «Выдатнік Беларускай чыгункі». Мае падзяку Беларускай чыгункі.



## КАНАНОВІЧ
### Людміла Мікалаеўна

Старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях.
Маладзечанская гарадская выбарчая акруга № 72

Нарадзілася 3 снежня 1966 года ў вёсцы Мясата Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці.

Скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага (матэматыка); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне і ідэалогія).

Працавала настаўнікам матэматыкі, намеснікам дырэктара, дырэктарам гімназіі № 3 горада Маладзечна; намеснікам старшыні Маладзечанскага райвыканкама.

Выбіралася дэпутатам Маладзечанскага раённага Савета дэпутатаў 27-га склікання.

З'яўлялася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па працы, сацыяльнай палітыцы і ахове здароўя.

Намеснік кіраўніка рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Рэспублікі Індыя.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Мінскага аблвыканкама, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, граматамі Маладзечанскага райвыканкама.

Заносілася на Дошку гонару Маладзечанскага раёна.



## КАРАСЬ
### Дзяніс Мікалаевіч

Член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі.
Наваполацкая выбарчая акруга № 24

Нарадзіўся 18 жніўня 1978 года ў горадзе Наваполацку Віцебскай вобласці.

Скончыў Наваполацкі політэхнічны тэхнікум, тэхнік-электрык; Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, інжынер-механік; факультэт павышэння кваліфікацыі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, інжынер-хімік-тэхнолаг; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, ідэолаг.

Працаваў электраманцёрам па рамонце электраабсталявання ВА «Палімір»; машыністам тэхналагічных помпаў, апэратарам тэхналагічных установак, начальнікам установы «Ізамерызацыі ксілолаў — нетыповай» вытворчасці «Нафтавыя паліва і араматыка» ААТ «Нафтан».

Быў старшым грамадскім інспектарам па ахове працы пярвічнай арганізацыі Белхімпрафсаюза, намеснікам старшыні цэхавага камітэта вытворчасці «Нафтавыя паліва і араматыка» ААТ «Нафтан».

З'яўляўся дэпутатам Наваполацкага гарадскога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Дэлегат ад Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе.

Член РГА «Белая Русь».

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, ААТ «Нафтан», Рэспубліканскага камітэта Белхімпрафсаюза, граматай Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, памятным нагрудным знакам «65 год Дэпартаменту па нагляду за бяспечным вядзеннем работ у прамысловасці МНС Рэспублікі Беларусь», ганаровым знакам Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў «За ўклад у міжнароднае маладзёжнае супрацоўніцтва», юбілейнымі медалямі.



## КІР'ЯК
### Лілія Вацлаваўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.
Гродзенская-Цэнтральная выбарчая акруга № 51

Нарадзілася 4 снежня 1967 года ў горадзе Шчучыне Гродзенскай вобласці.

Скончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, настаўнік рускай мовы і літаратуры.

Працавала настаўнікам рускай мовы і літаратуры, намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце СШ № 13 горада Гродна, дырэктарам ДУА «Сярэдняя школа № 13 горада Гродна».

Выбіралася дэпутатам Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў 27-га склікання.

З'яўлялася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была членам Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гродзенскага гарадскога і Гродзенскага абласнога Саветаў дэпутатаў, упраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама.



## КЛІШЭВІЧ
### Сяргей Міхайлавіч

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.
Кастрычніцкая выбарчая акруга № 97

Нарадзіўся 23 верасня 1990 года ў горадзе Мінску.

Скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (гісторыя (паліталогія)); магістратуру гістарычнага факультэта БДУ (кіраванне дакументамі і архіўная справа); аспірантуру гістарычнага факультэта БДУ (айчынная гісторыя); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне і права).

Працаваў сакратаром пярвічнай арганізацыі БДУ Мінскай гарадской арганізацыі ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», галоўным спецыялістам аддзела па справах моладзі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага гарвыканкама, другім сакратаром Цэнтральнага камітэта ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», першым сакратаром Мінскага гаркама ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## КРАЛЕВІЧ
### Ірына Мікалаеўна

Член Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы.
Жыткавіцкая выбарчая акруга № 39

Нарадзілася 12 мая 1965 года ў горадзе Мазыры Гомельскай вобласці.

Скончыла Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт, матэматык, выкладчык. Кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Аўтар больш чым 100 навуковых і вучэбна-метадычных публікацый.

Працавала настаўнікам матэматыкі СШ № 2 горада Мазыра, асістэнтам кафедры алгебры і матэматычнага аналізу, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры матэматыкі і методыкі выкладання матэматыкі, дэканам фізіка-матэматычнага факультэта, прарэктарам па навуковай рабоце УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна».

З'яўлялася членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была членам Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскага абласнога і Мазырскага раённага Саветаў дэпутатаў, УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна», юбілейнымі медалямі. Мае падзякі Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Гомельскага аблвыканкама.



## КРАЎЦОЎ
### Сяргей Уладзіміравіч

Член Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы.
Рагачоўская выбарчая акруга № 45

Нарадзіўся 12 чэрвеня 1975 года ў вёсцы Сычман Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці.

Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (аграномія); Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы (эканамічная тэорыя); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне дзяржаўнага кіравання. Кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт.

Працаваў аграномам, малодшым навуковым супрацоўнікам, навуковым супрацоўнікам, старшым навуковым супрацоўнікам, вядучым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам аддзела насенняводства і тэхналогіі вытворчасці кармавых культур, дырэктарам Гомельскай абласной сельскагаспадарчай доследнай станцыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Выбіраўся дэпутатам Рагачоўскага раённага Савета дэпутатаў 26-га і 27-га скліканняў, дэпутатам Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Намеснік кіраўніка рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Рэспублікі Балгарыя, член рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентамі Рэспублікі Казахстан, Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам, Каралеўства Тайланд, Фінляндскай Рэспублікі.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, юбілейнымі медалямі. Мае падзякі старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Рагачоўскага раённага Савета дэпутатаў.



## КРАЧАК
### Іна Юр'еўна

Член Пастаяннай камісіі па працы
і сацыяльных пытаннях.
Аршанская гарадская выбарчая акруга № 25

Нарадзілася 18 ліпеня 1964 года ў горадзе Оршы Віцебскай вобласці.

Скончыла Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі інстытут (лячэбная справа); Беларускую акадэмію медыцынскай паслядыпломнай адукацыі (арганізацыя аховы здароўя).

Працавала ўрачом-акушэрам-гінеколагам, загадчыкам аддзялення паталогіі цяжарнасці, урачом-акушэрам-гінеколагам 1-га радзільнага аддзялення, галоўным урачом, загадчыкам Аршанскага гарадскога радзільнага дома.

Выбіралася дэпутатам Аршанскага раённага Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў.

З'яўляецца старшынёй савета Аршанскай раённай арганізацыі РГА «Белая Русь».

Узнагароджана Падзякай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, граматамі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, Аршанскага райвыканкама, упраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама, установы аховы здароўя «Аршанская цэнтральная паліклініка», Аршанскага благачыння Беларускай праваслаўнай царквы, юбілейным медалём «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў». З'яўляецца лаўрэатам звання «Жанчына года – 2014» у намінацыі «За лідарства і паспяховае кіраўніцтва», «Чалавек года Віцебшчыны – 2017», узнагароджана нагрудным знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



## КРЭЧ
### Вольга Зенонаўна

Член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве.
Гомельская-Навабеліцкая выбарчая акруга № 36

Нарадзілася 25 красавіка 1969 года ў вёсцы Жупраны Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці.

Скончыла Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (педыятрыя); клінічную ардынатуру Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта (педыятрыя).

Працавала ўрачом-неанатолагам Полацкага радзільнага дома; участковым урачом-педыятрам Маладзечанскай цэнтральнай раённай бальніцы; загадчыкам дзіцячага аддзялення Акцябрскай цэнтральнай раённай бальніцы Гомельскай вобласці; урачом-педыятрам, урачом-неанатолагам (загадчыкам) педыятрычнага аддзялення для неданошаных дзяцей Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы № 3.

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.



## КУРСЕВІЧ
### Валянціна Вацлаваўна

Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.
Заслаўская выбарчая акруга № 77

Нарадзілася 13 мая 1965 года ў вёсцы Суботнікі Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці.

Скончыла Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (лячэбная справа); Беларускую медыцынскую акадэмію паслядыпломнай адукацыі (арганізацыя аховы здароўя); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне). Аўтар больш чым 20 навуковых артыкулаў па праблемах кардыялогіі і рэўматалогіі.

Працавала ўрачом выязной брыгады станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Мінскага раёна; урачом-кардыёлагам Мінскага раённага тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання; урачом-кардыёлагам, урачом-рэўматолагам, намеснікам галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Мінскай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга абласной клінічнай бальніцы; загадчыкам кардыялагічнага аддзялення 2-й гарадской клінічнай бальніцы горада Мінска.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Мінскага аблвыканкама, Мінскага райвыканкама, нагрудным знакам Міністэрства аховы здароўя «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



## ЛАГУНОВА
### Галіна Мікалаеўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі
па эканамічнай палітыцы.
Шабаноўская выбарчая акруга № 91

Нарадзілася 22 лістапада 1964 года ў горадзе Слаўгарадзе Магілёўскай вобласці.

Скончыла Мінскі дзяржаўны інстытут імя А.М. Горкага, настаўнік матэматыкі сярэдняй школы.

Працавала выхавальнікам прышкольнага інтэрната, настаўнікам матэматыкі Маляціцкай сярэдняй школы Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці; намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце Купішскай няпоўнай сярэдняй школы, загадчыкам Вайнюнскай пачатковай школы, дырэктарам Купішскай базавай школы Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці; намеснікам дырэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце, дырэктарам Мінскага гандлёвага каледжа Белкаапсаюза; дырэктарам Мінскага філіяла Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі.

Мае Падзячнае пісьмо Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Мінгарвыканкама, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, Белкаапсаюза, Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў спажыўкааперацыі, адміністрацыі Заводскага раёна горада Мінска, упраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама, аддзела народнай адукацыі Браслаўскага райвыканкама, нагруднымі знакамі «Выдатнік адукацыі», «Выдатнік спажывецкай кааперацыі Беларусі», «За прафсаюзныя заслугі», медалямі «Заслужаны міратворац» і «110 гадоў прафсаюзнаму руху Беларусі».



## ЛАЎРЫНЕНКА
### Ігар Уладзіміравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы (2019–2021).
Бярэзінская выбарчая акруга № 61

Нарадзіўся 17 красавіка 1961 года ў горадзе Мінску, памёр 14 мая 2021 года.

Скончыў Кастрамское вышэйшае ваеннае камандНае вучылішча хімічнай абароны; Ваенную акадэмію хімічнай абароны імя Маршала Савецкага Саюза С.К. Цімашэнкі; Ваенную акадэмію Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі. Генерал-маёр.

Праходзіў ваенную службу на розных пасадах ва Узброеных Сілах СССР і Рэспублікі Беларусь, у тым ліку на пасадах першага намесніка начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, аташэ па пытаннях абароны пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі.

З 1983 па 1985 год праходзіў ваенную службу на тэрыторыі Рэспублікі Афганістан.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, медалём «За бездакорную службу» I, II і III ступені, іншымі дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ЛЕНЧЭЎСКАЯ
### Марына Аляксандраўна

Член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы.
Заходняя выбарчая акруга № 102

Нарадзілася 12 сакавіка 1971 года ў вёсцы Еўдакімавічы Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці.

Скончыла Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.А. Куляшова; Беларускі інстытут правазнаўства; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Працавала памочнікам пракурора Ленінскага раёна горада Магілёва, старшым пракурорам аддзела пракуратуры Магілёўскай вобласці, старшым памочнікам пракурора Магілёўскай вобласці, начальнікам аддзела пракуратуры Магілёўскай вобласці, старшым пракурорам аддзела Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, начальнікам сакратарыята старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк».

З'яўляецца членам праўлення ГА «Беларускі саюз жанчын», старшынёй пярвічнай арганізацыі ГА «Беларускі саюз жанчын» Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.







## ЛУКАНСКАЯ
### Ірына Эдуардаўна

Член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве.
Гродзенская-Занёманская выбарчая акруга № 49

Нарадзілася 21 мая 1965 года ў горадзе Гродне.

Скончыла Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут; Беларускую медыцынскую акадэмію паслядыпломнай адукацыі (кіраванне ахавай здароўя).

Працавала ўрачом-педыятрам участковым, пульманолагам, загадчыкам аддзялення, намеснікам галоўнага ўрача па медыцынскай частцы, галоўным урачом дзіцячай паліклінікі № 1 горада Гродна. Урач вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі.

Выбіралася дэпутатам Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў 26-га і 27-га скліканняў, Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Старшыня праўлення Гродзенскай гарадской арганізацыі ГА «Беларускі саюз жанчын».

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ЛЮБЕЦКАЯ
### Святлана Анатольеўна

Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве.
Старавіленская выбарчая акруга № 105

Нарадзілася 3 чэрвеня 1971 года ва Украіне.

Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (руская мова і літаратура, правазнаўства); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне); аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Працавала суддзёй суда Фрунзенскага раёна горада Мінска, намеснікам старшыні суда Партызанскага раёна горада Мінска, старшынёй суда Маскоўскага раёна горада Мінска. Займала пасаду суддзі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Мае Падзяку Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Удастоена ганаровага звання «Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь».



## ЛЯЎЧУК
### Аляксандр Георгіевіч

Член Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы.
Пружанская выбарчая акруга № 9

Нарадзіўся 9 жніўня 1985 года ў вёсцы Востраў Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыў Віцебскую дзяржаўную акадэмію ветэрынарнай медыцыны (ветэрынарная медыцына); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Працаваў ветфельчарам ААТ «Радзіма» Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці; галоўным ветэрынарным урачом ААТ «Стрыгава» Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці; галоўным ветэрынарным урачом ААТ «Аранчыцкая птушкафабрыка» Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці.



## МАКАРЫНА-КІБАК
### Людміла Эдуардаўна

Старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.
Грушаўская выбарчая акруга № 98

Нарадзілася 20 красавіка 1967 года ў горадзе Хойнікі Гомельскай вобласці.

Скончыла Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (лячэбная справа); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай сферай). Доктар медыцынскіх навук, прафесар. Аўтар 183 навуковых публікацый, 16 патэнтаў.

Галоўны рэдактар навуковага часопіса «Оториноларингология. Восточная Европа».

Працавала ўрачом-отарыналарынголагам, загадчыкам отарыналарынгалагічнага аддзялення Брэсцкай абласной бальніцы; галоўным урачом Рэспубліканскай бальніцы паталогіі слыху, голасу і маўлення; дырэктарам Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра отарыналарынгалогіі.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была старшынёй Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.

Мае значную колькасць ганаровых грамат, падзяк, адзначана Падзячным пісьмом Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», нагрудным знакам Міністэрства аховы здароўя «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь». Удастоена звання «Жанчына года – 2013» у намінацыі «За прафесіяналізм і актыўную грамадскую дзейнасць».



## МАМАЙКА
### Іван Андрэевіч

Член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы.
Стаўбцоўская выбарчая акруга № 70

Нарадзіўся 12 красавіка 1974 года ў вёсцы Белямічы Столінскага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыў Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна; Магілёўскі каледж Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь; магістратуру Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Палкоўнік міліцыі.

Праходзіў службу на пасадах сярэдняга і старшага кіруючага складу органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь; працаваў першым намеснікам начальніка Стаўбцоўскага раённага аддзела ўнутраных спраў – начальнікам крымінальнай міліцыі, начальнікам Стаўбцоўскага раённага аддзела ўнутраных спраў.

Выбіраўся дэпутатам Мінскага абласнога Савета дэпутатаў і Стаўбцоўскага раённага Савета дэпутатаў 26-га і 27-га скліканняў.

Узнагароджаны медалём «За бездакорную службу» I, II і III ступені, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Уручана вышэйшая ўзнагарода Міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь – халодная зброя (корцік).



## МАРЗАЛЮК
### Ігар Аляксандравіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.
Магілёўская-Ленінская выбарчая акруга № 84

Нарадзіўся 11 верасня 1968 года ў гарадскім пасёлку Краснаполле Магілёўскай вобласці.

Скончыў Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.А. Куляшова, гісторык.

Член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар. Аўтар 140 навуковых прац, у іх ліку 18 кніг.

Працаваў археолагам архітэктурна-рэстаўрацыйнай фірмы «АРТ-М»; старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры філасофіі, дацэнтам кафедры археалогіі, дацэнтам кафедры ўсеагульнай гісторыі, загадчыкам кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін УА «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова».

Член савета УА «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова».

Кіраўнік і выканаўца дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава» на 2011–2015 гады.

Двойчы лаўрэат стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Маладыя дактары навук».

З'яўляўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання; дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, быў старшынёй Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За працоўныя заслугі», нагрудным знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік адукацыі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц СНД, ордэнам «Садружнасць», медалём «За ўмацаванне парламенцкага супрацоўніцтва» Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц СНД.



## МАРКЕВІЧ
### Аляксандр Іванавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі
па нацыянальнай бяспецы.
Іўеўская выбарчая акруга № 54

Нарадзіўся 9 мая 1968 года ў горадзе Шчучыне Гродзенскай вобласці.

Скончыў Ленінградскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча СПА імя Ю.У. Андропава; Маскоўскую дзяржаўную юрыдычную акадэмію; Пагранічную акадэмію ФСБ Расійскай Федэрацыі. Палкоўнік.

Праходзіў ваенную службу на пасадах намесніка камандзіра роты, камандзіра роты, інжынера аддзела вайсковай часці 1725 (г. Нагінск); намесніка камандзіра вайсковай часці 1234 (г. Ліда); першага намесніка камандзіра — начальніка аператыўнага ўпраўлення вайсковай часці 2034 (г. Полацк); намесніка начальніка першага ўпраўлення — начальніка першага аддзела галоўнага аператыўнага ўпраўлення Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь; начальніка Смаргонскай пагранічнай групы.

З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, быў намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве.

Узнагароджаны медалём «За бездакорную службу» I, II і III ступені, ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



## МАРТЫНАЎ
### Ігар Феліксавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі
па нацыянальнай бяспецы.
Лепельская выбарчая акруга № 23

Нарадзіўся 26 снежня 1965 года ў горадзе Віцебску.

Скончыў Алма-Ацінскае вышэйшае агульнавайсковае каманднае вучылішча імя Маршала Савецкага Саюза І.С. Конева; каманда-штабны факультэт Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь. Палкоўнік.

Праходзіў ваенную службу на пасадах камандзіра разведвальнага ўзвода, разведвальнай роты, начальніка штаба — намесніка камандзіра асобнага разведвальнага батальёна, камандзіра асобнага разведвальнага батальёна, начальніка аддзела Галоўнага разведвальнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, ваеннага камісара Віцебскай вобласці.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, быў членам Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы.

З'яўляецца членам ГА «Беларускі саюз афіцэраў» і РГА «Белая Русь».

Узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені, 15 медалямі СССР і Рэспублікі Беларусь, у тым ліку медалём «За бездакорную службу» II і III ступені, ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Віцебскага аблвыканкама, начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першага намесніка Міністра абароны Рэспублікі Беларусь, Міністра абароны Рэспублікі Беларусь, Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



## МАСЕЙКАЎ
### Аляксандр Анатольевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя,
фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.
Магілёўская-Прамысловая выбарчая акруга № 87

Нарадзіўся 26 ліпеня 1971 года ў горадзе Магілёве.

Скончыў Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут (фізічная культура).

Працаваў трэнерам-выкладчыкам па веславанні на байдарках і каноэ Магілёўскага аблсавета «Дынама»; інструктарам фізкультуры Магілёўскага абласнога спартыўнага камітэта; спартсменам-інструктарам зборнай каманды СССР па веславанні на байдарках і каноэ; спартсменам-інструктарам зборнай каманды рэспублікі па веславанні на байдарках і каноэ Дзяржкамспорту; спартсменам-інструктарам зборнай каманды рэспублікі па веславанні на байдарках і каноэ Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь; загадчыкам вяслярнай базы дзяржаўнай спецыялізаванай вучэбна-спартыўнай установы «Абласная школа вышэйшага спартыўнага майстэрства» горада Магілёва; дырэктарам дзяржаўнай спецыялізаванай вучэбна-спартыўнай установы «Магілёўская абласная дзіцяча-юнацкая спартыўная школа па вяслярных відах спорту»; дырэктарам дзяржаўнай спецыялізаванай вучэбна-спартыўнай установы «Магілёўскі абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па вяслярных відах спорту».

Выбіраўся дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў.

Чэмпіён Алімпійскіх гульняў, трохразовы чэмпіён свету, сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы.

Заслужаны майстар спорту СССР па веславанні на байдарках і каноэ.

Ганаровы грамадзянін горада Магілёва.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## МАШКАРОЎ
### Аляксандр Валер'евіч

Член Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы.
Гомельская-Прамысловая выбарчая акруга № 35

Нарадзіўся 14 чэрвеня 1963 года на станцыі Мажэеўка Аршанскага раёна Віцебскай вобласці.

Скончыў Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Н.К. Крупскай, настаўнік агульнатэхнічных дысцыплін і фізікі.

Працаваў кіраўніком тэхнічнага гуртка Гомельскай станцыі юных тэхнікаў, настаўнікам, намеснікам дырэктара сярэдняй школы № 51, дырэктарам сярэдняй школы № 69 горада Гомеля.

Выбіраўся дэпутатам Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў, нагрудным знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік адукацыі», мае падзякі Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі.



## МІХАЛЮК
### Павел Рышардавіч

Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.
Шчучынская выбарчая акруга № 60

Нарадзіўся 29 лістапада 1983 года ў вёсцы Капачы Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці.

Скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы (гісторыя са спецыялізацыяй «Гісторыя Беларусі XIX–XX стст.»); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (інавацыйны менеджмент).

Працаваў настаўнікам гісторыі вучэбна-педагагічнага комплексу «Князікаўскі дзіцячы сад — базавая агульнаадукацыйная школа»; галоўным спецыялістам Кастрычніцкага раённага горада Гродна камітэта ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі»; выконваючым абавязкі першага сакратара Ленінскага раённага горада Гродна камітэта ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі»; начальнікам аддзела па справах моладзі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна горада Гродна; галоўным спецыялістам аддзела арганізацыйнай работы галоўнага ўпраўлення арганізацыйна-кадравай работы Гродзенскага аблвыканкама; першым сакратаром Гродзенскага абласнога камітэта ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Гродзенскага гарвыканкама, юбілейным медалём «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў».



## МІЦКЕВІЧ
### Валерый Вацлавіч

Намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў.
Лідская выбарчая акруга № 55

Нарадзіўся 24 лютага 1964 года ў горадзе Лідзе Гродзенскай вобласці.

У 1989 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І. Леніна (правазнаўства).

Служыў у радах Савецкай арміі ў войсках СПА на Далёкім Усходзе.

Працоўную дзейнасць пачаў у 1989 годзе з пасады стажора суддзі, працаваў суддзёй народнага суда Мінскага раёна і горада Заслаўя, старшынёй суда Мінскага раёна і горада Заслаўя.

З 2001 па 2009 год — намеснік Міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь, член Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, дырэктар Нацыянальнага цэнтра законапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь.

З 2009 па 2019 год — Намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

З'яўляецца старшынёй ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў».

Мае падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь «Ганаровы работнік юстыцыі».

Удастоены ганаровага звання «Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь».



## МУРЫНА
### Юлія Георгіеўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах.
Салігорская сельская выбарчая акруга № 69

Нарадзілася 21 лютага 1979 года ў вёсцы Ісдрашава Салігорскага раёна Мінскай вобласці.

Скончыла Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны інстытут псіхалогіі і сацыяльнай работы, псіхолаг, выкладчык псіхалогіі; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст па кіраванні персаналам.

Працавала першым сакратаром Салігорскага гаркама, першым сакратаром Салігорскага райкама ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі»; дырэктарам ДУ «Салігорскі раённы тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва».

Выбіралася дэпутатам Салігорскага раённага Савета дэпутатаў 25, 26 і 27-га скліканняў.

З'яўлялася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была членам Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях.

Член ГА «Беларускі саюз жанчын».

Мае падзячныя пісьмы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, ганаровымі граматамі і падзякамі Мінскага аблвыканкама, Салігорскага гарадскога і раённага выканкамаў, падзякай Міністра працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, залатым значком ГА «БРСМ», юбілейнымі медалямі, заносілася на Дошку гонару Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

Мае ганаровае званне «Чалавек года Міншчыны — 2014».



## НАЗАРАНКА
### Валянціна Аляксееўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.
Мазырская выбарчая акруга № 42

Нарадзілася 17 сакавіка 1964 года ў сяле Лебядзёўка Сахнаўшчынскага раёна Харкаўскай вобласці (Украіна).

Скончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У. Куйбышава (таваразнаўства і арганізацыя гандлю харчовымі таварамі); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве).

Працавала таваразнаўцам Мазырскага гархарчпрамгандлю; сакратаром камітэта камсамола Мазырскай швейнай фабрыкі Мазырскага гаркама ЛКСМБ; інструктарам Мазырскага гаркама КПБ; эканамістам Мазырскага гархарчпрамгандлю; таваразнаўцам сумеснай вытворча-камерцыйнай фірмы «Данка»; таваразнаўцам Мазырскага аптова-рознічнага аб'яднання; начальнікам аддзела эканомікі і прыватызацыі, начальнікам упраўлення эканомікі Мазырскага гарвыканкама; начальнікам аддзела эканомікі, намеснікам старшыні, першым намеснікам старшыні Мазырскага райвыканкама; старшынёй Мазырскага раённага Савета дэпутатаў.

Выбіралася дэпутатам Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў і Мазырскага раённага Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Член Камуністычнай партыі Беларусі. Намеснік старшыні Кантрольна-бюджэтнай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Кіраўнік рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Рэспублікі Сінгапур і Рэспублікі Філіпіны.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў, Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь, Гомельскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў, Мазырскага райвыканкама, юбілейным медалём «МПА СНД. 30 гадоў».



## НАСЕНЯ
### Анатолій Васільевіч

Член Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы.
Лунінецкая выбарчая акруга № 13

Нарадзіўся 28 сакавіка 1979 года ў вёсцы Любань Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыў Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію, эканаміст; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, эканаміст-менеджар. Атрымаў дыплом бізнес-адукацыі ў рамках сумеснага праекта Controller Akademie AG (Германія) і Бізнес-школы ІПМ «Акадэмія кантролінгу» (Беларусь).

Працаваў бухгалтарам, эканамістам па аналізе гаспадарчай дзейнасці, галоўным эканамістам, начальнікам планава-эканамічнага аддзела ААТ «Спецжалезабетон» горада Мікашэвічы Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, граматай Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь. Мае падзячнае пісьмо старшыні Лунінецкага райвыканкама.



## НІЖЭВІЧ
### Людміла Іванаўна

Старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах.
Капыльская выбарчая акруга № 66

Нарадзілася 3 мая 1964 года ў горадзе Капылі Мінскай вобласці.

Скончыла Гомельскі кааператыўны інстытут Цэнтрасаюза (бухгалтарскі ўлік і аналіз гаспадарчай дзейнасці).

Працавала бухгалтарам, загадчыкам сектара Капыльскага раённага спажывецкага таварыства; эканамістам, галоўным бухгалтарам аддзела культуры Капыльскага райвыканкама; галоўным кантралёрам-рэвізорам кантрольна-рэвізійнага ўпраўлення Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь па Капыльскім раёне, намеснікам начальніка аддзела кантролю за бюджэтнымі сродкамі і пазабюджэтнымі фондамі кантрольна-рэвізійнага ўпраўлення Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь па Мінскай вобласці; начальнікам аддзела фінансаў АПК фінансавага ўпраўлення, намеснікам старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага аблвыканкама; загадчыкам сектара галоўнага ўпраўлення эканомікі і фінансаў Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; начальнікам галоўнага ўпраўлення эканомікі і фінансаў Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, намеснікам Міністра сельскай гаспадаркі і харчавання.

З'яўлялася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах.

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, граматамі Мінскага аблвыканкама, Капыльскага райвыканкама, юбілейнымі медалямі.







## НІКАЛАЙКІН
### Віктар Паўлавіч

Старшыня Пастаяннай камісіі
па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве.
Віцебская-Горкаўская выбарчая акруга № 17

Нарадзіўся 19 верасня 1961 года ў вёсцы Сівенка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці.

Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут (арганізацыя і бяспека дарожнага руху); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Працаваў інжынерам, начальнікам калоны № 5 аўтакалоны № 2459 Віцебскага аблаўтаўпраўлення; другім сакратаром Чыгуначнага райкама ЛКСМБ горада Віцебска, сакратаром, другім сакратаром Віцебскага гаркама камсамола; загадчыкам аддзела, намеснікам старшыні, першым намеснікам старшыні Віцебскага гарвыканкама; кіраўніком адміністрацыі Кастрычніцкага раёна горада Віцебска; намеснікам старшыні Віцебскага аблвыканкама; старшынёй Віцебскага гарвыканкама.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.



## ПАДЛУЖНАЯ
### Людміла Браніславаўна

Член Пастаяннай камісіі
па адукацыі, культуры і навуцы.
Сеніцкая выбарчая акруга № 76

Нарадзілася 22 чэрвеня 1964 года ў вёсцы Стайкі Вілейскага раёна Мінскай вобласці.

Скончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка, псіхолаг; Акадэмію паслядыпломнай адукацыі, менеджар у галіне адукацыі.

Працавала выхавальнікам, настаўнікам па выяўленчай дзейнасці, педагогам-псіхолагам дзіцячага сада № 56 Мінскага раёна; загадчыкам ДУА «Дзіцячы яслі-сад п. Юбілейны»; дырэктарам ДУА «Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці «Каласок».

З'яўлялася членам Рэспубліканскага савета кіраўнікоў устаноў дашкольнай адукацыі.

Выбіралася дэпутатам Мінскага раённага Савета дэпутатаў 25-га і 26-га скліканняў, дэпутатам Мінскага абласнога Савета дэпутатаў 27-га склікання, дэпутатам Сеніцкага сельскага Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Мінскага аблвыканкама, Мінскага райвыканкама, упраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама, упраўлення па адукацыі Мінскага райвыканкама, граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.



## ПАКАНЕЧНЫ
### Павел Леанідавіч

*Член Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы.*
*Ваўкавыская выбарчая акруга № 48*

Нарадзіўся 28 чэрвеня 1971 года ў вёсцы Ашмянцы Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці.

Скончыў каманднa-інжынерны інстытут МНС Рэспублікі Беларусь (пажарная тэхніка і бяспека); ДУА «Каманднa- інжынерны інстытут» МНС Рэспублікі Беларусь (кіраванне абаронай ад надзвычайных сітуацый); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Праходзіў службу пажарным, камандзірам аддзялення, начальнікам каравула, намеснікам начальніка часці, намеснікам начальніка аддзела, начальнікам Ваўкавыскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях установы «Гродзенскае абласное ўпраўленне МНС Рэспублікі Беларусь».

Выбіраўся дэпутатам Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў, дэпутатам Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Узнагароджаны медалём «За бездакорную службу» III ступені, ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, Ваўкавыскага райвыканкама, граматамі ўпраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь па Гродзенскай вобласці, Гродзенскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў. Мае падзякі Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь па Гродзенскай вобласці.



## ПАЛЯКОВА
### Ірына Міхайлаўна

*Член Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы.*
*Гарадоцкая выбарчая акруга № 21*

Нарадзілася 4 сакавіка 1979 года ў гарадскім пасёлку Карма Гомельскай вобласці.

Скончыла Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава (гісторыя і беларуская мова і літаратура); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Працавала асістэнтам кафедры эканамічнай тэорыі і гісторыі Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны; выхавальнікам Бабініцкага дзіцячага сада Віцебскага раёна; намеснікам старшыні па ідэалагічнай рабоце СВК «Альгоўскае» Віцебскага раёна; старшынёй Віцебскай раённай прафсаюзнай арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў аграпрамысловага комплексу.

Выбіралася дэпутатам Бабініцкага сельскага Савета дэпутатаў 26, 27 і 28-га скліканняў, дэпутатам Віцебскага раённага Савета дэпутатаў 27-га і 28-га склікання.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.







## ПАНАСЮК
### Васілій Васільевіч

*Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі.*
*Пушкінская выбарчая акруга № 103*

Нарадзіўся 13 лютага 1966 года ў пасёлку Мухавец Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут, інжынер-электрык; Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, эканаміст-менеджар.

Працаваў электраслесарам па рамонце электрычных машын, інжынерам, майстрам вытворчага ўчастка, старшым майстрам электрычнага цэха, намеснікам начальніка вытворча-тэхнічнага аддзела, намеснікам дырэктара, дырэктарам Мінскай ЦЭЦ-4. Выбіраўся старшынёй прафсаюзнага камітэта станцыі.

З'яўляўся дэпутатам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў 24-га і 25-га скліканняў, старшынёй Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў 26, 27 і 28-га скліканняў.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па эканоміцы і фінансах.

Мае падзякі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Мінскага гарвыканкама, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, канцэрна «Белэнерга», граматай Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, медалём «115 гадоў прафсаюзнаму руху Беларусі», юбілейнымі медалямі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў «МПА СНД. 25 гадоў» і «МПА СНД. 30 гадоў».

Прысвоена ганаровае званне «Выдатнік Беларускай энергасістэмы».



## ПАПКО
### Павел Іванавіч

*Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.*
*Баранавіцкая-Усходняя выбарчая акруга № 6*

Нарадзіўся 11 верасня 1983 года ў горадзе Баранавічы Брэсцкай вобласці.

Скончыў Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт (замежная мова (англійская), беларуская мова і літаратура); магістратуру Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка (тэорыя і методыка навучання і выхавання (навучэнцаў і студэнцкай моладзі)); Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы (менеджмент устаноў прафесійнай адукацыі); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Магістр педагагічных навук.

Працаваў выкладчыкам-стажорам, выкладчыкам кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы, намеснікам дэкана па выхаваўчай рабоце, начальнікам аддзела выхаваўчай работы з моладдзю, прарэктарам па выхаваўчай рабоце Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

З'яўляўся дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Намеснік кіраўніка дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленні кантактаў з Лацінаамерыканскім парламентам, кіраўнік рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі асобных дзяржаў Лацінскай Амерыкі (Рэспубліка Калумбія, Рэспубліка Нікарагуа, Рэспубліка Панама, Усходняя Рэспубліка Уругвай, Рэспубліка Эквадор), асобных дзяржаў Паўднёвай Афрыкі (Рэспубліка Ангола, Рэспубліка Зімбабвэ, Рэспубліка Мазамбік, Рэспубліка Намібія).

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Брэсцкага аблвыканкама, Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, Баранавіцкага гарадскога Савета дэпутатаў, упраўлення адукацыі Баранавіцкага гарвыканкама, аддзела па справах моладзі Баранавіцкага гарвыканкама, граматай Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.



## ПАТАПАВА
### Алена Станіслаўна

Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.
Гродзенская-Кастрычніцкая выбарчая акруга № 50

Нарадзілася 27 сакавіка 1978 года ў горадзе Скідзелі Гродзенскай вобласці.

Скончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы (філалогія, правазнаўства).

Працавала настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе № 28 горада Гродна; старшынёй пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі ТАА «ЗОЎ», намеснікам генеральнага дырэктара ТАА «Будаўнічамэблевае аб'яднанне «ЗОЎ».

Выбіралася дэпутатам Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў.

З'яўляецца членам Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях.

Узнагароджана юбілейнымі медалямі «100 гадоў прафсаюзнаму руху», «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Гродзенскага гарвыканкама, граматай Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.



## ПЕТРАШОВА
### Вольга Уладзіміраўна

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.
Магілёўская-Кастрычніцкая выбарчая акруга № 86

Нарадзілася 27 снежня 1968 года ў горадзе Кізел Пермскай вобласці (РСФСР).

Скончыла Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.А. Куляшова (руская мова і літаратура); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Працавала настаўнікам пачатковых класаў Батаеўскай пачатковай школы Хоцімскага раёна; настаўнікам рускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 2 горада Хоцімска; інспектарам школ аддзела адукацыі Хоцімскага райвыканкама; загадчыкам дзіцячага сада № 3 горада Хоцімска; намеснікам старшыні Хоцімскага райвыканкама па сацыяльных пытаннях і інфармаванні; намеснікам начальніка ўпраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама; намеснікам старшыні Магілёўскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў.

Выбіралася дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў 26-га і 27-га скліканняў. З'яўлялася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была членам Пастаяннай камісіі па міжнародных справах, старшынёй пярвічнай арганізацыі ГА «Беларускі саюз жанчын» Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшынёй пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Уваходзіла ў склад дэпутацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкім Сходзе Саюза Беларусі і Расіі.

Першы намеснік Адказнага сакратара Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Мае Падзяку і падзячныя пісьмы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, юбілейнымі медалямі. Удастоена ганаровага звання «Чалавек года Магілёўшчыны – 2021».





## ПІСАНІК
### Леанід Фёдаравіч

Член Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы (2019–2020).
Палеская выбарчая акруга № 43

Нарадзіўся 30 жніўня 1957 года ў горадзе Мазыры Гомельскай вобласці, памёр 5 кастрычніка 2020 года.

Скончыў Рыжскае вышэйшае ваенна-палітычнае Чырванасцяжнае вучылішча імя Маршала Савецкага Саюза С.С. Бірузова (ваенна-палітычная); Ваенна-палітычную акадэмію імя У.І. Леніна (ваенна-палітычная); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Праходзіў ваенную службу на пасадах намесніка камандзіра дывізіёна па палітычнай частцы, прапагандыста вайсковай часці, намесніка камандзіра палка па рабоце з асабовым складам, намесніка камандзіра палка, намесніка начальніка аддзела па выхаваўчай рабоце, намесніка камандзіра дывізіі па выхаваўчай рабоце. Працаваў загадчыкам агульнага аддзела кіраўніцтва справамі, першым намеснікам старшыні Мазырскага гарвыканкама; старшынёй Мазырскага гарадскога Савета дэпутатаў; старшынёй Мазырскага раённага Савета дэпутатаў; старшынёй Ельскага райвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, быў членам Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў, Мазырскага райвыканкама.



## РАЖАНЕЦ
### Валянціна Вітальеўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.
Слуцкая выбарчая акруга № 67

Нарадзілася 11 студзеня 1964 года ў горадзе Слуцку Мінскай вобласці.

Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І. Леніна, журналіст.

Працавала мастацкім кіраўніком Слуцкага раённага Дома культуры; настаўнікам беларускай мовы і літаратуры СШ № 12 горада Слуцка; карэктарам рэдакцыі любанскай раённай газеты «Будаўнік камунізму»; загадчыкам сельскагаспадарчага, аграпрамысловага аддзелаў, адказным сакратаром рэдакцыі газеты «Слуцкі край»; рэдактарам тэлепраграмы «Слуцк ТВ» ААТ «СлуцкАблГарант»; галоўным рэдактарам ДУ «Рэдакцыя газеты «Слуцкі край» і праграмы радыёвяшчання «Весткі Случчыны».

Член ГА «Беларускі саюз журналістаў», ГА «Беларускі саюз жанчын». Дэлегат пятага і шостага Усебеларускіх народных сходаў. Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па палітычных пытаннях і міжнародным супрацоўніцтве.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была намеснікам старшыні, старшынёй Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, МПА СНД, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, ГА «Беларускі саюз журналістаў», Слуцкага райвыканкама, медалём МПА СНД «За ўмацаванне парламенцкага супрацоўніцтва», сярэбраным медалём «Дрэва сяброўства» МПА СНД і міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір».



## РЫНЕЙСКАЯ
### Ірына Мікалаеўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі
па адукацыі, культуры і навуцы.
Бабруйская-Ленінская акруга № 78

Нарадзілася 6 жніўня 1972 года ў горадзе Бабруйску Магілёўскай вобласці.

Скончыла Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут, настаўнік хіміі і біялогіі; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (кіраванне дзяржаўнымі інфармацыйнымі рэсурсамі).

Працавала настаўнікам хіміі, намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце СШ № 9 горада Бабруйска; вядучым спецыялістам, галоўным спецыялістам аддзела ідэалагічнай работы, намеснікам начальніка, начальнікам аддзела адукацыі, начальнікам упраўлення адукацыі, спорту і турызму Бабруйскага гарвыканкама.

З'яўлялася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц СНД, юбілейнымі медалямі.



## САВІНЫХ
### Андрэй Уладзіміравіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.
Чкалаўская выбарчая акруга № 96

Нарадзіўся 21 снежня 1962 года ў горадзе Мінску.

Скончыў перакладчыцкі факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў (англійская і французская мовы); Міжгаліновы інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў пры БДІНГ імя В.У. Куйбышава (арганізацыя вытворчасці).

Працаваў перакладчыкам, рэферэнтам, загадчыкам аддзела ў маладзёжных грамадскіх арганізацыях; трэцім, другім, першым сакратаром, начальнікам упраўлення інфармацыі — прэс-сакратаром Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь; першым сакратаром Пасольства Рэспублікі Беларусь у Каралеўстве Нідэрландаў, намеснікам Пастаяннага прадстаўніка Рэспублікі Беларусь пры аддзяленні ААН і іншых міжнародных арганізацыях у горадзе Жэневе, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Турэцкай Рэспубліцы і Рэспубліцы Ірак.

Намеснік Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, кіраўнік рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Ірана, Ірака, Пакістана, Турцыі, Швейцарыі.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, медалём Парламенцкай асамблеі АДКБ «За ўмацаванне парламенцкага супрацоўніцтва ў АДКБ», юбілейнымі медалямі «100 гадоў дыпламатычнай службе Беларусі», «МПА СНД. 30 гадоў».



## САЙГАНАВА
### Таццяна Іванаўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі
па эканамічнай палітыцы.
Купалаўская выбарчая акруга № 95

Нарадзілася 7 снежня 1970 года ў вёсцы Валохі Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці.

Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, хімік, выкладчык; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, эканаміст-менеджар.

Працавала выкладчыкам у санаторнай школе-інтэрнаце № 2 горада Мінска, інжынерам-хімікам цэнтральнай лабараторыі, начальнікам вытворчага аддзела, намеснікам генеральнага дырэктара па вытворчасці СААТ «Камунарка».

Выбіралася дэпутатам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў 27-га склікання.

З'яўлялася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была членам Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, канцэрна «Белдзяржхарчпрам», адміністрацыі Ленінскага раёна горада Мінска, СААТ «Камунарка».



## САРАКАЧ
### Аляксандр Іванавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі
па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе,
транспарце і сувязі.
Дзяржынская выбарчая акруга № 71

Нарадзіўся 11 жніўня 1963 года ў вёсцы Леднікі Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці.

Скончыў Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, інжынер-электрык; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне дзяржаўнага кіравання.

Працоўную дзейнасць пачаў слесарам кантрольна-вымяральных прыбораў і аўтаматыкі на ВА «Інтэграл». Служыў у радах Савецкай арміі. З 1987 года працаваў на Мінскай нафтабазе ў горадзе Фаніпалі Дзяржынскага раёна. Прайшоў працоўны шлях ад слесара кантрольна-вымяральных прыбораў і аўтаматыкі 3-га разраду Мінскай нафтабазы да галоўнага інжынера РУП «Беларуснафта—Мінскаблнафтапрадукт» горада Фаніпаля Дзяржынскага раёна. Працаваў старшынёй Фаніпальскага гарвыканкама.

З'яўляўся дэпутатам Дзяржынскага раённага Савета дэпутатаў 26-га склікання, старшынёй Дзяржынскага раённага Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў, дэпутатам Мінскага абласнога Савета дэпутатаў.

Намеснік дэлегата дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленні кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Мінскага аблвыканкама, Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, Дзяржынскага райвыканкама.



## СВІЛА
### Віктар Збігневіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.
Смаргонская выбарчая акруга № 59

Нарадзіўся 10 студзеня 1963 года ў вёсцы Жарнэлі Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці.

Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут (арганізацыя дарожнага руху); Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (правазнаўства); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Працаваў майстрам вытворчага навучання; выбіраўся другім сакратаром, першым сакратаром Ашмянскага райкама ЛКСМБ; загадваў аддзелам Гродзенскага абкама ЛКСМБ; працаваў інспектарам, старшым інспектарам дзяржаўнай падатковай інспекцыі па Ашмянскім раёне; прайшоў шлях ад інспектара да намесніка начальніка Ашмянскай мытні; кіраваў Ашмянскім раённым вузлом паштовай сувязі; працаваў намеснікам старшыні Астравецкага райвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам, членам прэзідыума Ашмянскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.



## СЕМЯНЧУК
### Алег Аляксеевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях.
Маладзечанская сельская выбарчая акруга № 73

Нарадзіўся 20 снежня 1958 года ў вёсцы Мервіны Клецкага раёна Мінскай вобласці.

Скончыў Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Н.К. Крупскай (агульнатэхнічныя дысцыпліны з дадатковай спецыяльнасцю фізіка).

Працаваў майстрам вытворчага навучання, намеснікам дырэктара па вучэбна-вытворчай рабоце Заастравецкага вучэбна-вытворчага камбіната; намеснікам загадчыка аддзела народнай адукацыі Клецкага райвыканкама; настаўнікам СШ № 3 горада Клецка; дырэктарам Клецкага дзіцячага дома; намеснікам начальніка ўпраўлення адукацыі, старшынёй камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленні кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, Мінскага аблвыканкама, граматай Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік адукацыі», юбілейным медалём «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў». Мае падзякі Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністра працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.







## СЕМЯНЯКА
### Валянцін Міхайлавіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.
Слонімская выбарчая акруга № 58

Нарадзіўся 10 ліпеня 1963 года ў вёсцы Лыскава Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы (фізіка); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (кіраванне сацыяльнай сферай).

Працаваў настаўнікам, дырэктарам школы, начальнікам аддзела адукацыі, намеснікам старшыні Зэльвенскага райвыканкама, старшынёй Зэльвенскага раённага Савета дэпутатаў.

Выбіраўся дэпутатам Зэльвенскага раённага Савета дэпутатаў 25, 26 і 28-га скліканняў.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў», «МПА СНД. 30 гадоў», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік адукацыі». Мае Падзяку Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.



## СІЛЬЧОНАК
### Павел Мацвеевіч

Член Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях.
Пастаўская выбарчая акруга № 29

Нарадзіўся 11 лістапада 1963 года ў вёсцы Краснагорка Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці.

Скончыў Даўгаўпілскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае інжынернае вучылішча (авіяцыйныя радыёэлектронныя сродкі).

Праходзіў службу на розных пасадах ва Узброеных Сілах СССР і Рэспублікі Беларусь; працаваў спецыялістам Віцебскага абласнога ваеннага камісарыята; кіраўніком аддзела арганізацыйна-кадравай работы адміністрацыі Першамайскага раёна горада Віцебска; старшынёй Браслаўскага раённага аб'яднання прафсаюзаў.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Выбіраўся дэпутатам Браслаўскага раённага Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Узнагароджаны медалём «За бездакорную службу» II і III ступені, ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Віцебскага гарвыканкама.



## СІНЯК
### Уладзімір Аляксандравіч

Член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі.
Нёманская выбарчая акруга № 56

Нарадзіўся 1 снежня 1967 года ў вёсцы Лозкі Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці.

Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, інжынер-механік; Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, інжынер-будаўнік.

Працаваў загадчыкам майстэрняў калгаса «Іскра» Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці, дырэктарам вытворчага ўпраўлення «Дзятлаварайгаз» РУП «Гроднааблгаз», намеснікам генеральнага дырэктара па будаўніцтве УП «Гроднааблгаз».

З'яўляўся дэпутатам Дзятлаўскага раённага Савета дэпутатаў 26-га і 27-га скліканняў, дэпутатам Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў 27-га склікання.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, граматамі Дзятлаўскага райвыканкама, Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, Дзятлаўскага раённага Савета дэпутатаў, УП «Гроднааблгаз» і ДВА «Белпалівагаз».



## СОНГІН
### Аляксандр Генрыхавіч

Член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве.
Замкавая выбарчая акруга № 57

Нарадзіўся 12 кастрычніка 1969 года ў вёсцы Тарнова Лідскага раёна Гродзенскай вобласці.

Скончыў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка (гісторыя); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай сферай).

Працаваў настаўнікам Далецкай базавай школы; дырэктарам ДУА «Гудскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — базавая школа» Лідскага раёна; начальнікам упраўлення адукацыі Лідскага раённага выканаўчага камітэта; намеснікам дырэктара ААТ «Лідскія аўтобусы «Нёман»; начальнікам галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў 27-га склікання.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, юбілейнымі медалямі.



## СТАРАВОЙТАВА
### Ганна Валянцінаўна

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.
Каменнагорская выбарчая акруга № 101

Нарадзілася 8 жніўня 1966 года ў горадзе Салігорску Мінскай вобласці.

Скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага, настаўнік матэматыкі, інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі; саіскальнік Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Працавала настаўнікам матэматыкі сярэдняй школы № 158, намеснікам дырэктара па навукова-метадычнай рабоце гімназіі № 13 горада Мінска; намеснікам начальніка ўпраўлення адукацыі Фрунзенскага раёна горада Мінска; дырэктарам сярэдняй школы № 195 горада Мінска; дырэктарам дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 31 горада Мінска».

Выбіралася дэпутатам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў 26-га і 27-га скліканняў.

З'яўлялася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была членам Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.

Член дэпутацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкім Сходзе Саюза Беларусі і Расіі, намеснік кіраўніка дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленні кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва, кіраўнік рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Латвіі і Японіі.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі», юбілейнымі медалямі.



## СТАЦІЎКА
### Жанна Уладзіміраўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях.
Белавежская выбарчая акруга № 8

Нарадзілася 1 красавіка 1968 года ў вёсцы Макарава Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці.

Скончыла Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.С. Пушкіна (педагогіка і методыка пачатковага навучання); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (кіраванне персаналам).

Працавала кантралёрам-касірам харчовых тавараў Брэсцкага гархарчгандлю; старшынёй прафсаюзнага камітэта навучэнцаў, выхавальнікам, выкладчыкам, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Брэсцкага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа сферы абслугоўвання; дырэктарам тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна горада Брэста; намеснікам старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Брэсцкага аблвыканкама — начальнікам упраўлення занятасці насельніцтва.

Выбіралася дэпутатам Брэсцкага гарадскога Савета дэпутатаў 27-га склікання.

З'яўлялася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, была членам Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях.

Намеснік старшыні Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці, старшыня Брэсцкай абласной арганізацыі Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Мае Падзячнае пісьмо Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета МПА СНД, граматамі і падзякамі Брэсцкага аблвыканкама, Брэсцкага гарадскога Савета дэпутатаў, адміністрацыі Ленінскага раёна горада Брэста. Удастоена звання «Чалавек года — 2012».



## СТРАЛЬЧОНАК
### Валерый Іванавіч

*Член Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях.*
*Жодзінская выбарчая акруга № 64*

Нарадзіўся 15 верасня 1981 года ў горадзе Барысаве Мінскай вобласці.

Скончыў Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт (электразабеспячэнне); Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі (прафесійная адукацыя); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Працаваў электраманцёрам Сельэнерга, Барысаўскага малочнага камбіната; выкладчыкам спецдысцыплін, загадчыкам дзённага аддзялення Жодзінскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа; загадчыкам дзённага аддзялення, намеснікам дырэктара па вытворчым навучанні, кіраўніком практыкі, намеснікам дырэктара па вучэбна-вытворчай рабоце філіяла БНТУ «Жодзінскі дзяржаўны політэхнічны каледж».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленні кантактаў з Міжпарламенцкай Асамблеяй Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Жодзінскага гарвыканкама, граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, установы адукацыі «Жодзінскі дзяржаўны політэхнічны каледж», прафсаюзнага камітэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Мае падзякі Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыні Жодзінскага гарвыканкама.



## СТРУНЕЎСКІ
### Андрэй Мікалаевіч

*Член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі.*
*Салігорская гарадская выбарчая акруга № 68*

Нарадзіўся 4 мая 1972 года ў горадзе Салігорску Мінскай вобласці.

Скончыў Салігорскі горна-хімічны тэхнікум, горны тэхнік-электрамеханік; Маскоўскі дзяржаўны адкрыты ўніверсітэт, горны інжынер; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, эканаміст-менеджар.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў электраслесарам, слесарам дзяжурным па рамонце абсталявання, горнарабочым ачышчальнага забою, майстрам, намеснікам начальніка падземнага горнага ўчастка, намеснікам начальніка рудніка 3-га рудаўпраўлення ААТ «Беларуськалій» па агульных пытаннях, старшынёй прафкама пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі ААТ «Беларуськалій» Белхімпрафсаюза.

З'яўляўся дэпутатам Салігорскага раённага Савета дэпутатаў 26-га склікання, дэпутатам Мінскага абласнога Савета дэпутатаў 27-га склікання.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, Салігорскага райвыканкама, Рэспубліканскага камітэта Белхімпрафсаюза, Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Мінскай абласной арганізацыі Белхімпрафсаюза, ганаровым знакам Мінскай абласной арганізацыі Белхімпрафсаюза, юбілейным медалём «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў». Мае падзякі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Мінскай абласной арганізацыі Белхімпрафсаюза.

Прысвоена ганаровае званне «Ветэран працы ААТ «Беларуськалій».





## СУПРАНОВІЧ
### Ірына Аляксандраўна

*Член Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях.*
*Вілейская выбарчая акруга № 74*

Нарадзілася 16 кастрычніка 1973 года ў вёсцы Крывое Сяло Вілейскага раёна Мінскай вобласці.

Скончыла Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт (правазнаўства); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай сферай).

Працавала загадчыкам крамы; сакратаром, старшынёй Рабунскага сельскага выканаўчага камітэта; старшынёй Крывасельскага сельскага выканаўчага камітэта.

Выбіралася дэпутатам Рабунскага сельскага Савета дэпутатаў 24, 25 і 26-га скліканняў, Крывасельскага сельскага Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў, Вілейскага раённага Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленні кантактаў з Лацінаамерыканскім парламентам.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, мае падзякі Мінскага аблвыканкама, Вілейскага райвыканкама. Удастоена звання «Чалавек года Вілейшчыны – 2016», «Жанчына года Міншчыны» ў намінацыі «Гаспадыня сяла – 2018».

Заносілася на Дошку гонару Вілейскага раёна.



## СЦЕЛЬМАШОК
### Сяргей Пятровіч

*Член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах.*
*Рэчыцкая выбарчая акруга № 44*

Нарадзіўся 15 красавіка 1971 года ў горадзе Рэчыцы Гомельскай вобласці.

Скончыў Дзяржаўную акадэмію нафты і газу імя І.М. Губкіна (распрацоўка і эксплуатацыя нафтавых і газавых радовішчаў); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне нацыянальнай эканомікай).

Працаваў аператарам абясссольвальнай і абязводжвальнай устаноўкі, тэхнолагам, намеснікам начальніка цэха падрыхтоўкі і перапампоўвання нафты, намеснікам начальніка цэнтральнай інжынерна-тэхналагічнай службы па тэхналогіі, начальнікам цэха здабычы нафты і газу № 1, галоўным інжынерам нафтагазаздабыўнога ўпраўлення «Рэчыцанафта»; намеснікам галоўнага інжынера па перспектыўным развіцці, намеснікам галоўнага інжынера – начальнікам вытворчага аддзела па здабычы нафты і газу РУП «Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта», першым намеснікам начальніка нафтагазаздабыўнога ўпраўлення «Рэчыцанафта», начальнікам нафтагазаздабыўнога ўпраўлення «Рэчыцанафта» РУП «Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта».

Выбіраўся дэпутатам Рэчыцкага раённага Савета дэпутатаў 26-га склікання, Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў 27-га склікання.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэчыцкага райвыканкама, канцэрна «Белнафтахім».



## СЫРАНКОЎ
**Сяргей Аляксандравіч**

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах.
Быхаўская выбарчая акруга № 81

Нарадзіўся 14 жніўня 1983 года ў гарадскім пасёлку Краснаполле Магілёўскай вобласці.

Скончыў Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова (англійская мова, нямецкая мова); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне і ідэалогія).

Працаваў настаўнікам нямецкай мовы ў ДУА «Казельскі ВПК дзіцячы сад — сярэдняя школа» Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці, дырэктарам філіяла Гарадзецкая базавая агульнаадукацыйная школа ДУА «Сярэдняя школа г.п. Краснаполле»; галоўным спецыялістам аддзела ідэалагічнай работы, начальнікам аддзела па адукацыі, спорце і турызме Краснапольскага райвыканкама, першым намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам Краснапольскага раённага Савета дэпутатаў 26-га і 28-га скліканняў, Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Другі сакратар Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.

Намеснік кіраўніка дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленні кантактаў з Міжпарламенцкай Асамблеяй Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі, кіраўнік рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Каралеўства Камбоджа, Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў. Мае Падзячнае пісьмо Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, падзяку Краснапольскага райвыканкама.



## ТАРАСЕНКА
**Наталля Эдуардаўна**

Член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.
Магілёўская сельская выбарчая акруга № 88

Нарадзілася 21 мая 1970 года ў вёсцы Махава Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці.

Скончыла Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.А. Куляшова (педагогіка і методыка пачатковага навучання); Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова (практычная псіхалогія).

Працавала настаўнікам пачатковых класаў Камінтэрнаўскай, Раманавіцкай сярэдніх школ Магілёўскага раёна; настаўнікам пачатковых класаў, педагогам-псіхолагам, намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце, дырэктарам ДУА «Кадзінская сярэдняя школа» Магілёўскага раёна; начальнікам аддзела па адукацыі Магілёўскага райвыканкама.

Выбіралася дэпутатам Магілёўскага раённага Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, упраўлення адукацыі Магілёўскага аблвыканкама, граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, юбілейным медалём «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў».







## ТАЎТЫН
**Ігар Паўлавіч**

Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.
Светлагорская выбарчая акруга № 46

Нарадзіўся 11 лютага 1971 года ў горадзе Калінкавічы Гомельскай вобласці.

Скончыў Гомельскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (лячэбная справа); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай сферай).

Працаваў загадчыкам Казанскага фельчарска-акушэрскага пункта; медбратам тэрапеўтычнага аддзялення Брагінскай цэнтральнай раённай бальніцы; урачом-анестэзіёлагам-рэаніматолагам аддзялення рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі і анестэзіялогіі, галоўным урачом станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Калінкавіцкага тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання; намеснікам галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Калінкавіцкай цэнтральнай раённай бальніцы; галоўным урачом Светлагорскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Выбіраўся дэпутатам Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання, Светлагорскага раённага Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў, нагрудным знакам Міністэрства аховы здароўя «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



## УТКІН
**Віталій Юр'евіч**

Член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве.
Гомельская-Юбілейная выбарчая акруга № 31

Нарадзіўся 20 чэрвеня 1965 года ў горадзе Гомелі.

Скончыў Украінскую акадэмію ўнутраных спраў (праваазнаўства); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (міжнароднае права).

Праходзіў тэрміновую службу ва ўнутраных войсках Міністэрства ўнутраных спраў СССР, пасля яе заканчэння прадоўжыў службу ў органах МУС СССР. Працаваў на розных пасадах у Гомельскім аблвыканкаме; кіраўніком спраў Гомельскага гарвыканкама; начальнікам галоўнага ўпраўлення ведамаснага кантролю Гомельскага аблвыканкама; кіраўніком адміністрацыі Чыгуначнага раёна горада Гомеля.

Узнагароджаны медалём «За бездакорную службу» III ступені, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў СССР «За адзнаку ў службе» II ступені, нагрудным знакам унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь «За самаадданую службу» II ступені, іншымі ўзнагародамі.



## ХЛАБУКІН
### Ігар Канстанцінавіч

Член Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы.
Баранавіцкая-Заходняя выбарчая акруга № 5

Нарадзіўся 8 чэрвеня 1973 года ў горадзе Баранавічы Брэсцкай вобласці.

Скончыў Вышэйшае пажарна-тэхнічнае вучылішча МУС (інжынер пажарнай тэхнікі і бяспекі); Акадэмію грамадзянскай абароны МНС Расіі (каманднa-штабная, аператыўна-тактычная грамадзянскай абароны); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Праходзіў службу на пасадах намесніка начальніка ваенізаванай пажарнай часці, памочніка, старшага памочніка начальніка штаба пажаратушэння пры атрадзе ваенізаванай пажарнай службы, намесніка начальніка пажарнага аварыйна-выратавальнага атрада горада Баранавічы і Баранавіцкага раёна Брэсцкага абласнога ўпраўлення ваенізаванай пажарнай службы МНС Рэспублікі Беларусь па службе, падрыхтоўцы і пажаратушэнні; старшага інспектара па асаблівых даручэннях, галоўнага спецыяліста арганізацыйна-аналітычнага аддзела, намесніка начальніка па дзяржаўнай сістэме папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, начальніка Баранавіцкага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях установы «Брэсцкае абласное ўпраўленне МНС Рэспублікі Беларусь».

Выбіраўся дэпутатам Баранавіцкага гарадскога Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў, членам прэзідыума Баранавіцкага гарадскога Савета дэпутатаў, дэлегатам пятага Усебеларускага народнага сходу.

Узнагароджаны медалём «За бездакорную службу» II і III ступені, ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, установы «Брэсцкае абласное ўпраўленне МНС Рэспублікі Беларусь», Баранавіцкага гарвыканкама, Баранавіцкага райвыканкама, Баранавіцкага гарадскога Савета дэпутатаў, юбілейнымі медалямі.



## ЧАРНЯЎСКАЯ
### Жанна Мікалаеўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы.
Хойніцкая выбарчая акруга № 47

Нарадзілася 18 ліпеня 1971 года ў вёсцы Барысаўшчына Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці.

Скончыла Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт (прафесійнае навучанне са спецыялізацыяй «Аграінжынерыя»); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Працавала майстрам вытворчага навучання ў дзяржаўным прафесійна-тэхнічным вучылішчы горада Хойнікі, спецыялістам, начальнікам аддзела ідэалагічнай работы, намеснікам старшыні Хойніцкага райвыканкама.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Хойніцкага райвыканкама.





## ШАЎЧУК
### Мікалай Мікалаевіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы.
Полацкая сельская выбарчая акруга № 28

Нарадзіўся 24 жніўня 1959 года ў горадзе Драгічыне Брэсцкай вобласці.

Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (механізацыя сельскай гаспадаркі); Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт (эканоміка і кіраванне вытворчасцю); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Працаваў загадчыкам машыннага двара, галоўным інжынерам, дырэктарам саўгаса «Банонь» Полацкага раёна Віцебскай вобласці; першым намеснікам старшыні — начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, старшынёй Полацкага райвыканкама.

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання, з'яўляўся намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.

Старшыня камісіі па аграрных пытаннях Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Кыргызскай Рэспублікі.

Мае падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, старшыні Віцебскага аблвыканкама.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Віцебскага аблвыканкама, юбілейным медалём «МПА СНД. 30 гадоў».



## ШКРОБ
### Марына Аляксандраўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.
Васнявоўская выбарчая акруга № 93

Нарадзілася 13 жніўня 1967 года ў мястэчку Пухавічы Мінскай вобласці.

Скончыла Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны медыцынскі інстытут (лячэбная справа); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Працавала санітаркай, медыцынскай сястрой 5-й гарадской клінічнай бальніцы горада Мінска; урачом-акушэрам-гінеколагам радзільнага дома № 2 горада Мінска; урачом-акушэрам-гінеколагам, загадчыкам аддзялення 5-й гарадской клінічнай бальніцы горада Мінска; галоўным акушэрам-гінеколагам упраўлення аховы здароўя Мінскага аблвыканкама; намеснікам галоўнага ўрача па акушэрска-гінекалагічнай дапамозе 5-й гарадской клінічнай бальніцы горада Мінска.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, Мінскага аблвыканкама, Мінскага гарвыканкама, нагрудным знакам Міністэрства аховы здароўя «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



## ШУТАВА
### Святлана Аляксандраўна

Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.
Асіповіцкая выбарчая акруга № 89

Нарадзілася 1 чэрвеня 1967 года ў горадзе Магілёве.

Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (журналістыка).

Працавала рэдактарам, загадчыкам аддзела інфармацыі, галоўным рэдактарам Магілёўскага абласнога радыё РУП радыётэлецэнтр «Тэлекампанія «Магілёў»; галоўным рэдактарам абласной газеты «Магілёўскія ведамасці»; галоўным рэдактарам КВУП «Інфармацыйнае агенцтва «Магілёўскія ведамасці».

Выбіралася дэпутатам, намеснікам старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

З'яўляецца старшынёй Магілёўскай абласной арганізацыі ГА «Беларускі саюз журналістаў».

Узнагароджана медалём Францыска Скарыны, юбілейным медалём «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ШЫПУЛА
### Аляксандр Валер'евіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.
Барысаўская гарадская выбарчая акруга № 62

Нарадзіўся 15 жніўня 1972 года ў вёсцы Прыветак Сенненскага раёна Віцебскай вобласці.

Скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут (лячэбная справа); клінічную ардынатуру Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта (акушэрства і гінекалогія); Беларускую медыцынскую акадэмію паслядыпломнай адукацыі (арганізацыя аховы здароўя); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Працаваў санітарам Полацкай гарадской станцыі хуткай дапамогі; урачом-акушэрам-гінеколагам жаночай кансультацыі ўрачэбна-санітарнай службы аддзяленчай бальніцы на станцыі Баранавічы Беларускай чыгункі; клінічным ардынатарам клінічнай ардынатуры Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта; урачом-акушэрам-гінеколагам, намеснікам загадчыка радзільнага дома, загадчыкам радзільнага дома Барысаўскай цэнтральнай раённай бальніцы; галоўным урачом Барысаўскага радзільнага дома.

Выбіраўся дэпутатам Мінскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання, Барысаўскага раённага Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам Міністэрства аховы здароўя «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



## ШЫРОКАЯ
### Вера Уладзіміраўна

Член Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве.
Бабруйская-Першамайская выбарчая акруга № 79

Нарадзілася 25 красавіка 1985 года ў горадзе Бабруйску Магілёўскай вобласці.

Скончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка (руская мова і літаратура, беларуская мова і літаратура); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне і ідэалогія).

Працоўны шлях пачала на пасадзе сакратара пярвічнай арганізацыі з правамі райкама ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» Бабруйскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага мастацкага каледжа. Доўгі час узначальвала Бабруйскі гарком ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

З 2017 па 2019 год – дырэктар Бабруйскага дзяржаўнага каледжа імя А.Я. Ларына.

З'яўлялася дэпутатам Бабруйскага гарадскога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ЯГОРАЎ
### Аляксей Уладзіміравіч

Член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве.
Віцебская-Кастрычніцкая выбарчая акруга № 20

Нарадзіўся 16 снежня 1969 года ў горадзе Новасакольнікі Пскоўскай вобласці (Расійская Федэрацыя).

Скончыў Украінскую дзяржаўную юрыдычную акадэмію (правазнаўства); дактарантуру Маскоўскай дзяржаўнай юрыдычнай акадэміі імя А.Е. Кутафіна. Доктар юрыдычных навук.

Член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі параўнальнага права.

Працаваў старшым выкладчыкам, загадчыкам кафедры міжнароднага права, дэканам юрыдычнага факультэта Міжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных адносін (Віцебскі філіял); дэканам юрыдычнага факультэта Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта; рэктарам Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава. Рэктар УА «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт».

Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

# ЧЛЕНЫ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СЁМАГА СКЛІКАННЯ

# ЧЛЕНЫ СОВЕТА РЕСПУБЛИКИ НАЦИОНАЛЬНОГО СОБРАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ СЕДЬМОГО СОЗЫВА





## АБЕЛЬ
**Тацяна Валер'яўна**

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.
Выбрана ад Гомельскай вобласці (вылучана ад Веткаўскага, Гомельскага і Добрушскага раёнаў)

Нарадзілася 18 сакавіка 1964 года ў гарадскім пасёлку Касцюкоўка Гомельскай вобласці. Скончыла Мінскі інстытут культуры, культасветработнік, арганізатар-метадыст клубнай работы.

Працавала кіраўніком дзіцячай студыі, кіраўніком народнага цырка Палаца культуры Гомельскага ордэна Леніна шклозавода імя М.В. Ламаносава; рэжысёрам заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь цырка імя В. Абеля Палаца культуры ААТ «Гомельшкло».

Дэлегат пятага і шостага Усебеларускага народнага сходу.

Мастацкі кіраўнік заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь народнага цырка імя В. Абеля дзяржаўнай установы «Палац культуры «Касцюкоўка» (г. Гомель).

Член рэспубліканскага экспертнага савета па цыркавым мастацтве.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленні кантактаў з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора, Паўночным саветам; член рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Нарвегіі (кіраўнік), Брунея-Дарусалама (намеснік кіраўніка), Лаоса, Славакіі.

Узнагароджана медалём Ф. Скарыны, ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Прэзідыума Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, міністэрстваў культуры, архітэктуры і будаўніцтва, гомельскіх аблвыканкама, гарвыканкама, гарадскога Савета дэпутатаў, адміністрацыі Чыгуначнага раёна г. Гомеля. Мае падзякі Гомельскага гарвыканкама.



## АНАНІЧ
**Віктар Міхайлавіч**

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах.
Выбраны ад Магілёўскай вобласці (вылучаны ад Быхаўскага, Касцюковіцкага і Краснапольскага раёнаў)

Нарадзіўся 5 чэрвеня 1963 года ў горадзе Бабруйску Магілёўскай вобласці. Скончыў Беларускі тэхналагічны інстытут імя С.М. Кірава; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт.

Працаваў у г. Бабруйску ў ВА «Бабруйскдрэў»; АТ «ФанДАК»; філіяле № 4 АТ «Пріорбанк»; начальнікам аддзела касавых аперацый і інкасацыі аддзялення Галоўнага ўпраўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь па Магілёўскай вобласці; начальнікам упраўлення эканомікі Бабруйскага гарвыканкама; намеснікам кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна г. Бабруйска, дырэктарам філіяла № 703 ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк»; начальнікам філіяла № 700 Магілёўскага абласнога ўпраўлення ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк».

Дэпутат Бабруйскага гарадскога Савета дэпутатаў 26-га склікання. Дэлегат пятага і шостага Усебеларускага народнага сходу.

Старшыня праўлення ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк».

Член экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання. Член рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Аўстрыі, Бельгіі, Германіі, Славакіі, Швейцарскай Канфедэрацыі.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Магілёўскага абл- і гарвыканкамаў, адміністрацый Ленінскага раёна г. Магілёва і г. Бабруйска, Бабруйскага гарадскога Савета дэпутатаў і гарвыканкама. Заслужаны эканаміст Рэспублікі Беларусь. Ганаровы грамадзянін г. Бабруйска.



## АНЮХОЎСКІ
**Сяргей Анатольевіч**

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах.
Выбраны ад Магілёўскай вобласці (вылучаны ад горада Бабруйска і Слаўгарадскага, Асіповіцкага раёнаў)

Нарадзіўся 28 сакавіка 1980 года ў вёсцы Ляхаўка Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Працаваў намеснікам генеральнага дырэктара па эканоміцы камунальнага вытворчага прадпрыемства харчовай прамысловасці «Віцебскхарчпрам»; намеснікам генеральнага дырэктара па эканоміцы, намеснікам генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях і эканоміцы РУП «Віцебскі лікёра-гарэлачны завод «Прыдзвінне»; дырэктарам ААТ «Чырвоны харчавік».

Дэпутат Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Генеральны дырэктар сумеснага адкрытага акцыянернага таварыства «Камунарка» (г. Мінск).

Член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па сацыяльна-эканамічных і прававых пытаннях.

Узнагароджаны юбілейным медалём «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў», памятным медалём «100 гадоў Камсамолу Беларусі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Міністэрства культуры.



## БАЙКО
**Валянцін Валянцінавіч**

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах.
Выбраны ад Гродзенскай вобласці (вылучаны ад Ваўкавыскага, Мастоўскага і Шчучынскага раёнаў)

Нарадзіўся 30 лістапада 1969 года ў горадзе Гродна. Скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы.

Працаваў у Гродзенскім маладзёжным цэнтры; Гродзенскім раённым аддзеле народнай адукацыі; дырэктарам таварыства з абмежаванай адказнасцю «Плюс» (г. Гродна); дырэктарам сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Контэ» (г. Гродна).

Дэлегат пятага Усебеларускага народнага сходу.

Намеснік дырэктара па развіцці сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Контэ Спа» (г. Гродна).

Член Алімпійскага Нацыянальнага камітэта Рэспублікі Беларусь; Савета па развіцці прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь; праўлення ГА «Беларускі фонд міру». Старшыня ГА «Беларуская асацыяцыя каноэ», старшыня Прэзідыума ГА «Беларуская асацыяцыя каноэ».

Мае Падзяку Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалямі «За працоўныя заслугі», «Заслужаны міратворац» і «Каложскі крыж» III ступені, ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў, ГА «Беларускі фонд міру» і інш.



## БАСКАЎ
**Дзмітрый Юр'евіч**

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.
Назначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь

Нарадзіўся 25 жніўня 1978 года ў горадзе Мінску. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (правазнаўства); Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў фізічнай культуры, спорту і турызму Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры (трэнерская работа (па хакеі)).

Працаваў у ГА «Прафесійны ХК «Нёман»; СУ «Віцебскі ХК»; КСУП «Брэсцкі ХК»; ДУ «ХК «Юнацтва-Мінск»; камандзе МХЛ «Мінскія зубры» ЗАТ «ХК «Дынама-Мінск»; ва ўстанове «Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы»; дырэктарам установы «Мінская СДЮШАР па хакеі з шайбай» БФСТ «Дынама»; намеснікам старшыні Асацыяцыі «Федэрацыя хакея Рэспублікі Беларусь»; генеральным дырэктарам ЗАТ «ХК «Дынама-Мінск»; дырэктарам УП «Дырэкцыя па правядзенні чэмпіянату свету па хакеі з шайбай 2021»; старшынёй Асацыяцыі «Федэрацыя хакея Рэспублікі Беларусь».

Кіраўнік прадстаўніцтва ТАА «Акумулятарны Альянс».

Член Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь, БФСТ «Дынама», РГА «Патрыёты Беларусі».

Член Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве, Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па маладзёжнай палітыцы, спорце і турызме.

Мае падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, узнагароджаны медалямі «За працоўныя заслугі», «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку».



## БАЧЫЛА
**Аляксандр Аляксандравіч**

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.
Выбраны ад Мінскай вобласці (вылучаны ад Бярэзінскага, Крупскага і Чэрвеньскага раёнаў)

Нарадзіўся 26 лютага 1961 года ў горадзе Горкі Магілёўскай вобласці. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І. Леніна (правазнаўства); Акадэмію кіравання пры Кабінеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне).

Служыў у Савецкай арміі. Працаваў на Беларускім аўтамабільным заводзе; у пракуратуры Цэнтральнага раёна г. Мінска; пракуратуры г. Мінска; ва Урадавым сакратарыяце па справах тэрыторый Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь; галоўным спецыялістам упраўлення па справах тэрыторый, намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Цэнтральнага раённага Савета дэпутатаў г. Мінска. Дэлегат трэцяга і шостага Усебеларускага народнага сходу.

Начальнік галоўнага ўпраўлення юстыцыі Мінскага аблвыканкама.

Член ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў». Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленні кантактаў з Лацінаамерыканскім парламентам, рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі КНР (намеснік кіраўніка), Сербіі.

Мае тры падзячныя пісьмы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Мінскага аблвыканкама і Мінюста, нагруднымі знакамі Мінюста.



## БЕЛЬСКІ
### Валерый Іванавіч

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Назначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь

Нарадзіўся 30 кастрычніка 1968 года ў вёсцы Дзевашычы Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію; аспірантуру пры Беларускім НДІ эканомікі і інфармацыі АПК. Доктар эканамічных навук, прафесар.

Працаваў на рабочых спецыяльнасцях, служыў у Савецкай арміі, быў галоўным эканамістам саўгаса «Каліноўскі», навуковым супрацоўнікам Беларускага НДІ эканомікі і інфармацыі АПК, загадчыкам сектара цэнаўтварэння, намеснікам дырэктара па навуковай рабоце, першым намеснікам дырэктара НДРУ «БелНДІ аграрнай эканомікі», в.а. дырэктара ДНУ «Інстытут аграрнай эканомікі НАН Беларусі», першым намеснікам дырэктара ДНУ «Інстытут эканомікі НАН Беларусі» — дырэктарам Цэнтра аграрнай эканомікі, дырэктарам РНУП «Інстытут сістэмных даследаванняў у АПК НАН Беларусі»; памочнікам члена Калегіі (Міністра) па прамысловасці і аграрным комплексе ЕЭК; рэктарам ДУА «Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі», дырэктарам ДНУ «Інстытут эканомікі НАН Беларусі»; Намеснікам Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях развіцця фінансава-крэдытнай сістэмы.

24 студзеня 2023 года назначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання, 30 студзеня 2023 года выбраны намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі.

Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця.



## ВАРАНЮК
### Дзмітрый Сяргеевіч

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці. Выбраны ад Магілёўскай вобласці (вылучаны ад горада Магілёва)

Нарадзіўся 23 мая 1987 года ў горадзе Ташкенце (Рэспубліка Узбекістан). Скончыў установу адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова» (геаграфія, навукова-педагагічная дзейнасць); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае будаўніцтва).

Служыў ва Узброеных Сілах. Працаваў сакратаром пярвічнай арганізацыі з правамі раённага камітэта ГА «БРСМ» УА «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова»; першым сакратаром Ленінскага раённага камітэта ГА «БРСМ» г. Магілёва; Магілёўскага абласнога камітэта ГА «БРСМ»; Мінскага абласнога камітэта ГА «БРСМ»; сакратаром, першым сакратаром ЦК ГА «БРСМ».

Дэлегат пятага і шостага Усебеларускага народнага сходу.

Намеснік дырэктара — кіраўнік Прэс-цэнтра вытворча-выдавецкага РУП «ДОМ ПРЭСЫ».

Член ГА «БРСМ»; Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Намеснік дэлегата дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, член Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Сената Французскай Рэспублікі, рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Каралеўства Бахрэйн, Рэспублікі Балгарыя і Рэспублікі Узбекістан.

Мае падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры, Міністэрства гандлю.



## ГАЙДУКЕВІЧ
### Валерый Уладзіміравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. Выбраны ад Мінскай вобласці (вылучаны ад Пухавіцкага, Смалявіцкага і Уздзенскага раёнаў)

Нарадзіўся 19 студзеня 1953 года ў пасёлку Бягомль Мінскай вобласці. Скончыў Разанскае вышэйшае паветрана-дэсантнае каманднае вучылішча; Ваенную ордэнаў Леніна і Кастрычніцкай рэвалюцыі, Чырванасцяжную, ордэна Суворава акадэмію імя М.В. Фрунзэ; Ваенную акадэмію Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Служыў у дэсантных войсках. Прымаў удзел у баявых дзеяннях у Афганістане. З 1999 года — ва ўнутраных войсках Рэспублікі Беларусь, дзевяць гадоў камандуючым — намеснікам Міністра ўнутраных спраў.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага і шостага скліканняў. Дэлегат Усебеларускага народнага сходу (неаднаразова).

Старшыня Савета ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане».

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па бяспецы і абароне; намеснік кіраўнікоў рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Венесуэлы, Кубы, Малдовы, Каралеўства Тайланд.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, два падзячныя пісьмы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «За службу Радзіме» II і III ступені, медалём «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку», дваццаццю медалямі СССР і Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Удастоены звання «Ганаровы супрацоўнік МУС».



## ГАЛАВАТЫ
### Іван Іванавіч

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. Выбраны ад Мінскай вобласці (вылучаны ад Клецкага, Капыльскага і Салігорскага раёнаў)

Нарадзіўся 15 чэрвеня 1976 года ў мястэчку Пагост Салігорскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў Дзяржаўны горны інстытут імя Г.В. Пляханава ў г. Санкт-Пецярбургу.

Пачаў працоўную дзейнасць у ААТ «Беларуськалій» у 2000 годзе. Прайшоў працоўны шлях ад аборшчыка горных вырабатак на рудніку да галоўнага інжынера таварыства. У лістападзе 2014 года назначаны генеральным дырэктарам ААТ «Беларуськалій». Мае сем патэнтаў Рэспублікі Беларусь і шэсць патэнтаў Расійскай Федэрацыі на вынаходствы ў галіне горнай прамысловасці.

Член Салігорскага раённага выканаўчага камітэта.

Генеральны дырэктар ААТ «Беларуськалій».

Член прэзідыума Салігорскай раённай арганізацыі ГА «Белая Русь».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленні кантактаў з Лацінаамерыканскім парламентам; рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Рэспублікі Саюз М'янма (намеснік кіраўніка), Аўстрыі, Бразіліі, Ірана, КНР.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, канцэрна «Белнафтахім», Мінскага аблвыканкама, Салігорскага райвыканкама, Салігорскага раённага Савета дэпутатаў, ААТ «Беларуськалій», знакам «Шахцёрская слава» III, II і I ступені.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі (2020 год).



## ГЕДЗІЧ
### Ігар Мікалаевіч

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.
Выбраны ад Гродзенскай вобласці (вылучаны ад Воранаўскага, Іўеўскага і Ашмянскага раёнаў)

Нарадзіўся 9 студзеня 1971 года ў горадзе Гродна. Скончыў Мінскае вышэйшае ваеннае інжынернае вучылішча (радыётэхнічныя сродкі); установу адукацыі «Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь» (камандна-штабная аператыўна-тактычная сухапутных войскаў); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне і ідэалогія).

Служыў ва Узброеных Сілах. Прайшоў шлях ад камандзіра ўзвода да начальніка групы ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл. Займаўся пытаннямі будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл. Палкоўнік запасу.

Дэпутат Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Дырэктар дзяржаўнай установы культуры «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Гродзенскі абласны драматычны тэатр».

Член Пастаяннай камісіі ПА АДКБ па пытаннях абароны і бяспекі, Міжпарламенцкай камісіі па супрацоўніцтве Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Арменія, Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве, член рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Латвіі (намеснік кіраўніка), Аўстрыі, КНР, Польшчы і Сербіі.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём «За бездакорную службу» III ступені, ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, ПА АДКБ, нагрудным знакам «За ўклад у развіццё культуры Беларусі».



## ДЗЕРКАЧ
### Юрый Мікалаевіч

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.
Выбраны ад Віцебскай вобласці (вылучаны ад Аршанскага і Дубровенскага раёнаў)

Нарадзіўся 5 жніўня 1962 года ў вёсцы Магілёўцы Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (лячэбная справа); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне нацыянальнай эканомікай). Доктар медыцынскіх навук, прафесар.

Працаваў у камітэце ЛКСМБ Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута; Віцебскім дзяржаўным ордэна Дружбы народаў медыцынскім універсітэце; УА «Палескі дзяржаўны ўніверсітэт»; начальнікам галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Віцебскага аблвыканкама; урачом-педыятрам педыятрычнага аддзялення для дзяцей да года Віцебскай абласной клінічнай дзіцячай бальніцы УАЗ «Віцебскі абласны дзіцячы клінічны цэнтр».

Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання. Дэпутат Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў. Дэлегат пятага і шостага Усебеларускага народнага сходу.

Старшыня Віцебскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў.

Член рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Бахрэйна, Ірака, Ірана, Кыргызстана (намеснік кіраўніка), Бразіліі, Венгрыі, Карэі, Манголіі, Румыніі, Сінгапура, Таджыкістана, Швейцарыі.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Віцебскага аблвыканкама, Пінскага гарвыканкама, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь». Удастоены ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны — 2013».





## ДЗЯМІДАЎ
### Дзмітрый Уладзіміравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах.
Выбраны ад Віцебскай вобласці (вылучаны ад горада Наваполацка і Расонскага раёна)

Нарадзіўся 11 снежня 1975 года ў горадзе Полацку Віцебскай вобласці. Скончыў Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Працаваў супрацоўнікам упраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці; супрацоўнікам упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці; дырэктарам Наваполацкага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Жыллёва-рамонтная эксплуатацыйная арганізацыя»; першым намеснікам старшыні Наваполацкага гарвыканкама.

Дэлегат пятага і шостага Усебеларускага народнага сходу.

Старшыня Наваполацкага гарадскога выканаўчага камітэта.

Член кантрольна-бюджэтнай камісіі МПА СНД, Вышэйшага палітычнага Савета Беларускай партыі «Белая Русь», РГА «Белая Русь».

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, юбілейнымі медалямі.



## ДЗЯЧЭНКА
### Алег Віктаравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.
Выбраны членам ад Магілёўскай вобласці (вылучаны ад Магілёўскага і Чавускага раёнаў)

Нарадзіўся 14 чэрвеня 1971 года ў горадзе Канску Краснаярскага краю (Расійская Федэрацыя). Скончыў Магілёўскі будаўнічы тэхнікум, установу адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова» (гісторыя). Кандыдат філасофскіх навук, дацэнт.

Працаваў у сярэдняй школе в. Вялікія Бялевічы Магілёўскага раёна; Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А.А. Куляшова; Магілёўскім дзяржаўным абласным інстытуце развіцця адукацыі; загадчыкам кафедры грамадзянскага і гаспадарчага права факультэта эканомікі і права, прарэктарам па навучальнай рабоце Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова.

Дэлегат шостага Усебеларускага народнага сходу.

Рэктар ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі».

Член РГА «Белая Русь», старшыня Цэнтральнай кантрольна-рэвізійнай камісіі Беларускай партыі «Белая Русь». Старшыня экспертнага савета пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Член Пастаяннай камісіі па культуры, інфармацыі, турызме і спорце МПА СНД, рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Азербайджана, Балгарыі, Лівана і Сірыі.

Узнагароджаны медалём святцеля Кірылы Тураўскага, юбілейным медалём «МПА СНД. 30 гадоў», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета МПА СНД, Міністэрства адукацыі, Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Магілёўскага аблвыканкама, Магілёўскага гарвыканкама і інш.



## ДРАЗДОЎСКІ
### Канстанцін Вікенцьевіч

Член Пастаяннай камісіі
па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.
Выбраны ад горада Мінска

Нарадзіўся 26 мая 1974 года ў горадзе Мінску. Скончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (лячэбна-прафілактычная справа); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне нацыянальнай эканомікай). Кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт.

Працаваў у 1-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска; Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі; урачом-кардыёлагам, загадчыкам лабараторыі, намеснікам дырэктара па дзіцячай кардыяхірургіі ДУ «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Кардыялогія» Міністэрства аховы здароўя.

Дырэктар дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай хірургіі». Галоўны пазаштатны дзіцячы кардыяхірург Міністэрства аховы здароўя.

Намеснік дэлегатаў дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у ПА АБСЕ; член рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Іарданіі (кіраўнік), Лівана, Сірыі (намеснік кіраўніка), КНР, Карэі, Рэспублікі Саюз М'янма.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



## ЖЫНГЕЛЬ
### Алег Валянцінавіч

Член Пастаяннай камісіі
па эканоміцы, бюджэце і фінансах.
Выбраны ад Віцебскай вобласці (вылучаны ад Глыбоцкага, Докшыцкага, Лепельскага і Ушацкага раёнаў)

Нарадзіўся 19 сакавіка 1967 года ў горадзе Глыбокае Віцебскай вобласці. Скончыў Даўгаўпілскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае інжынернае вучылішча імя Я. Фабрыцыуса; Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт.

Служыў у Савецкай арміі. Працаваў у Віцебскім абласным упраўленні інкасацыі; начальнікам Глыбоцкага ўчастка інкасацыі Галоўнага ўпраўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці; старшым эканамістам, начальнікам крэдытнага аддзела аддзялення акцыянернага камерцыйнага банка «Белаграпрамбанк» (г. Глыбокае), кіраўніком аддзялення ААТ «Белаграпрамбанк» (г. Глыбокае), начальнікам філіяла ААТ «Белаграпрамбанк» — Віцебскае абласное ўпраўленне.

Дэпутат Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў.

Дэлегат шостага Усебеларускага народнага сходу.

Начальнік рэгіянальнай дырэкцыі па Віцебскай вобласці ААТ «Белаграпрамбанк».

Член Беларускага прафесійнага саюза банкаўскіх і фінансавых работнікаў, РГА «Белая Русь».

Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «110 гадоў прафсаюзнаму руху Беларусі», «100 год Узброеным сілам Рэспублікі Беларусь», «75 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў», «115 гадоў прафсаюзнаму руху Беларусі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, Віцебскага аблвыканкама, Лёзненскага райвыканкама, нагрудным знакам «Выдатнік Белаграпрамбанка», ганаровым знакам «За заслугі» Беларускага прафесійнага саюза банкаўскіх і фінансавых работнікаў і інш.







## ЗАЯЦ
### Леанід Канстанцінавіч

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2021–2022).
Назначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь

Нарадзіўся 30 верасня 1958 года ў вёсцы Гацук Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію.

Працаваў у саўгасах «50 гадоў БССР» і «Слуцк» Слуцкага раёна; старшынёй калгаса «Беларусь» Слуцкага раёна; дырэктарам Слуцкага камбіната хлебапрадуктаў; старшынёй Маладзечанскага райвыканкама; намеснікам старшыні Мінскага аблвыканкама, намеснікам старшыні Мінскага аблвыканкама — старшынёй Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні; генеральным дырэктарам ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі» Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці; Міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання; старшынёй Магілёўскага аблвыканкама.

13 снежня 2021 года назначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання, 17 снежня 2021 года выбраны намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 21 сакавіка 2022 года № 107 назначаны Намеснікам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнамі Пашаны і Айчыны III ступені, медалём «За працоўныя заслугі».



## ЗЯБЛІКАВА
### Алена Алегаўна

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах.
Выбрана ад Мінскай вобласці (вылучана ад Барысаўскага, Лагойскага раёнаў і горада Жодзіна)

Нарадзілася 11 лістапада 1967 года ў горадзе Почап Бранскай вобласці (Расійская Федэрацыя). Скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага (педагогіка і методыка выхаваўчай работы); Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі (практычная псіхалогія, менеджмент устаноў прафесійнай адукацыі).

Працавала ва ўстанове адукацыі «Дзіцячы сад № 8» (г. Барысаў); сярэдняй школе № 13 г. Барысава; кіраўніком комплексу педагагічнай рэабілітацыі пры дзяржаўнай установе адукацыі «Сярэдняя агульнаадукацыйная школа № 20 г. Барысава»; дырэктарам дзяржаўнай установы адукацыі «Сацыяльна-педагагічны цэнтр Барысаўскага раёна»; дырэктарам установы адукацыі «Барысаўскі дзяржаўны будаўнічы прафесійны ліцэй».

Дэпутат Мінскага абласнога Савета дэпутатаў 27-га склікання, Барысаўскага раённага Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Старшыня Барысаўскага раённага аб'яднання арганізацый прафсаюзаў.

Член РГА «Белая Русь»; каардынацыйнага савета па рэалізацыі Дэкрэта № 18 Барысаўскага райвыканкама, камісіі па прафілактыцы вытворчага траўматызму і прафесійных захворванняў, назіральнай камісіі пры Барысаўскім райвыканкаме.

Узнагароджана юбілейным медалём «115 гадоў прафсаюзнаму руху Беларусі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## ІВАНЕЦ
### Андрэй Іванавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці (2019–2022). Выбраны ад горада Мінска

Нарадзіўся 17 верасня 1984 года ў горадзе Мінску. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (хімія, навукова-вытворчая дзейнасць). Доктар хімічных навук. Прафесар. Член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам, старшым навуковым супрацоўнікам, загадчыкам лабараторыі, намеснікам дырэктара па навуковай рабоце дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут агульнай і неарганічнай хіміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»; галоўным вучоным сакратаром Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Міністр адукацыі.

Дэлегат пятага і шостага Усебеларускага народнага сходу.

Член РГА «Белая Русь», РДГА «Беларускае таварыства «Веды», Беларускай партыі «Белая Русь».

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства спорту і турызму, Граматай Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў. Мае Падзяку Старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, лаўрэат прэміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і фонду падтрымкі адукацыі і навукі (Алфёраўскага фонду) для маладых вучоных, лаўрэат конкурсу «100 маладых талентаў НАН Беларусі», лаўрэат прэміі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Расійскай акадэміі навук.



## ІЛЬІНА
### Марына Аляксандраўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні. Выбрана ад горада Мінска

Нарадзілася 30 лістапада 1970 года ў горадзе Віцебску. Скончыла Мінскі інстытут культуры; Акадэмію паслядыпломнай адукацыі.

Працавала ў гімназіях № 1 і № 12 г. Мінска; дырэктарам дзяржаўных устаноў адукацыі «Сярэдняя школа № 25 г. Мінска»; «Гімназія № 10 г. Мінска»; намеснікам начальніка Каардынацыйнага цэнтра «Адукацыя ў інтарэсах устойлівага развіцця» ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».

Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 13 г. Мінска».

Член савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў; Каардынацыйнага савета па пытаннях бесперапыннай педагагічнай адукацыі; Асацыяцыі кіраўнікоў устаноў адукацыі пры ГА «Беларускае педагагічнае таварыства»; РГА «Белая Русь»; праўлення ГА «Беларускі саюз жанчын».

Намеснік кіраўніка дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя; член Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве; рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Казахстана, КНР, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў і асобных дзяржаў Паўднёва-Усходняй Еўропы.

Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Мінска, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, Мінскага гарвыканкама, нагрудным знакам Міністэрства адукацыі «Выдатнік адукацыі».







## ІСАЧАНКА
### Анатолій Міхайлавіч

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2019–2021). Назначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь

Нарадзіўся 15 сакавіка 1966 года ў вёсцы Кузнец Клінцоўскага раёна Бранскай вобласці (Расійская Федэрацыя). Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (механізацыя сельскай гаспадаркі); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (эканоміка і кіраванне на прадпрыемствах АПК).

Працаваў у Горацкім раёне Магілёўскай вобласці ў калгасах «Савецкая Беларусь» і «40 гадоў Кастрычніка»; саўгасе «Усход»; дырэктарам саўгаса «Гарадзец» Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці; намеснікам старшыні, начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Шклоўскага райвыканкама; намеснікам старшыні Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама; старшынёй Кіраўскага райвыканкама; намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама; старшынёй Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў. Займаў пасады памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь – галоўнага інспектара па Мінскай вобласці; старшыні Мінскага аблвыканкама.

5 снежня 2019 года Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь назначаны членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання, 6 снежня 2019 года выбраны намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 2021 года № 490 назначаны старшынёй Магілёўскага аблвыканкама.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».



## КАПУЦКАЯ
### Каліна Віктараўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці. Выбрана ад Мінскай вобласці (выбарчая ад Вілейскага, Маладзечанскага і Мядзельскага раёнаў).

Нарадзілася 16 лютага 1975 года ў горадзе Слуцку Мінскай вобласці. Скончыла Салігорскае педагагічнае вучылішча (выкладанне ў пачатковых класах з дадатковай спецыяльнасцю «Музычнае выхаванне»); Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка (гісторыя); Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы (менеджмент устаноў прафесійнай адукацыі).

Працавала ў ДУА «Сярэдняя школа № 11 г. Слуцка»; ДУА «Маладзечанская сярэдняя школа № 1 імя Янкі Купалы»; дырэктарам ДУА «Сярэдняя школа № 9 г. Маладзечна».

Дэпутат Маладзечанскага раённага Савета дэпутатаў 27-га склікання.

Дэлегат шостага Усебеларускага народнага сходу.

Дырэктар ДУА «Сярэдняя школа № 14 г. Маладзечна».

Член Вышэйшага палітычнага савета БП «Белая Русь», ГА «Беларускі саюз жанчын».

Член Пастаяннай камісіі МПА СНД па навуцы і адукацыі, дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя, рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Азербайджана і Балгарыі.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, МПА СНД, Міністэрства адукацыі, упраўлення адукацыі Мінскага аблвыканкама, Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, Цэнтральнага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Адзначана падзякамі старшыні і начальніка ўпраўлення адукацыі Мінскага аблвыканкама.



## КАРПІЦКІ
### Аляксандр Сяргеевіч

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.
Выбраны ад Брэсцкай вобласці
(вылучаны ад горада Брэста і Камянецкага раёна)

Нарадзіўся 28 чэрвеня 1960 года ў горадзе Камянец Брэсцкай вобласці. Скончыў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (лячэбная справа). Доктар медыцынскіх навук, прафесар.

Працаваў у Камянецкай цэнтральнай раённай бальніцы Брэсцкай вобласці; Віцебскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце; загадчыкам аддзялення таракальнай хірургіі Віцебскага абласнога анкалагічнага дыспансера. Аўтар 20 вынаходстваў, 4 рацыяналізатарскіх прапаноў, 300 работ, надрукаваных у айчынных і замежных выданнях.

Дэпутат Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў 24, 25, 26 і 27-га скліканняў. Дэлегат Усебеларускага народнага сходу (неаднаразова).

Галоўны ўрач установы аховы здароўя «Брэсцкая абласная клінічная бальніца».

Член РГА «Белая Русь».

Член Пастаяннай камісіі МПА СНД па сацыяльнай палітыцы і правах чалавека; Міжпарламенцкай камісіі Савета Федэрацыі і Савета Рэспублікі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве, Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Сената Французскай Рэспублікі; рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Бельгіі (намеснік кіраўніка), Германіі, Ізраіля, Польшчы, Узбекістана, Францыі.

Мае два падзячныя пісьмы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейным медалём «МПА СНД. 30 гадоў», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета МПА СНД, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».

Заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь. Удастоены ганаровага звання «Чалавек года Брэстчыны – 2021» у галіне аховы здароўя. Ганаровы грамадзянін Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці.



## КАСКО
### Ігар Барысавіч

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.
Выбраны членам ад Магілёўскай вобласці
(вылучаны ад Клімавіцкага, Крычаўскага, Хоцімскага і Чэрыкаўскага раёнаў)

Нарадзіўся 13 лютага 1971 года ў горадзе Мінску. Скончыў Мінскі медыцынскі інстытут (педыятрыя); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай сферай).

Працаваў у 2-й гарадской дзіцячай клінічнай бальніцы г. Мінска; урачом-анестэзіёлагам-рэаніматолагам, намеснікам галоўнага ўрача па медыцынскай частцы ўстановы аховы здароўя «Магілёўская абласная дзіцячая бальніца».

Дэпутат Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў 27-га склікання, Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Дэлегат шостага Усебеларускага народнага сходу.

Галоўны ўрач установы аховы здароўя «Магілёўская абласная дзіцячая бальніца».

Член ГА «Белая Русь», праўлення Магілёўскага абласнога аддзялення РГА «Беларускі дзіцячы фонд».

Член Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Сената Парламента Рэспублікі Казахстан па супрацоўніцтве, рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Манголіі, Славакіі, Чэхіі.

Мае Падзячнае пісьмо Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалямі «За працоўныя заслугі», «Заслужаны міратворац», ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь», нагрудным знакам «За працу ў гонар жыцця».

Удастоены ганаровага звання «Чалавек года Магілёўшчыны – 2015», занесены ў Кнігу славы Магілёўшчыны за 2022 год.



## КАТОВІЧ
### Уладзімір Алегавіч

Член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.
Выбраны ад Гомельскай вобласці
(вылучаны ад Буда-Кашалёўскага, Жлобінскага і Светлагорскага раёнаў)

Нарадзіўся 8 снежня 1962 года ў вёсцы Бушыкі Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (лячэбная справа).

Працаваў у Гомельскай абласной клінічнай бальніцы; бальніцы хімічнага завода г. Гомеля; урачом-афтальмолагам аддзялення мікрахірургіі вока, загадчыкам аддзялення мікрахірургіі вока № 1 установы «Гомельская абласная спецыялізаваная клінічная бальніца»; галоўным пазаштатным спецыялістам па афтальмалогіі галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Гомельскага аблвыканкама.

Загадчык аддзялення ў г. Гомелі таварыства з абмежаванай адказнасцю «МедВайз». Урач-афтальмолаг вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі.

Член Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя.

Намеснік кіраўніка рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Швейцарскай Канфедэрацыі.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства аховы здароўя, знакам «Выдатнік аховы здароўя». Лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы аховы здароўя (2008 год).



## КАЧАНАВА
### Наталля Іванаўна

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.
Назначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь

Нарадзілася 25 верасня 1960 года ў горадзе Полацку Віцебскай вобласці. Скончыла Наваполацкі політэхнічны інстытут імя ЛКСМБ; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Працавала на Полацкім прадпрыемстве «Водаканал»; у Полацкім вытворчым аб'яднанні ЖКГ; намеснікам старшыні Полацкага гарвыканкама; старшынёй Наваполацкага гарвыканкама; Намеснікам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь; Кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання. Дэлегат чацвёртага, пятага і шостага Усебеларускага народнага сходу.

6 студзеня 2019 года назначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання, выбрана Старшынёй Савета Рэспублікі.

Член РГА «Белая Русь», ГА «БСЖ», Беларускага прафсаюза работнікаў дзяржаўных і іншых устаноў.

Кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай сетцы Руху недалучэння.

Мае дзве падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана ордэнамі Айчыны III ступені, Дружбы (Расія), Рускай праваслаўнай царквы святой роўнаапостальнай княгіні Вольгі II ступені, Беларускай праваслаўнай царквы свяціцеля Кірылы Тураўскага II ступені, святой праведнай Сафіі, княгіні Слуцкай, прападобнай Еўфрасінні Полацкай, медалямі «За працоўныя заслугі», «За заслугі», «За ўмацаванне парламенцкага супрацоўніцтва», прападобнай Еўфрасінні Полацкай, залатым медалём МПА СНД і Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» «Дрэва дружбы», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, міністэрстваў.

Удастоена званняў «Ганаровы грамадзянін горада Наваполацка», «Ганаровы грамадзянін Полацкага раёна».



## КУШНАРЭНКА
### Аляксей Іванавіч

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах
і нацыянальнай бяспецы.
Выбраны ад Магілёўскай вобласці (вылучаны
ад Бялыніцкага, Круглянскага і Шклоўскага раёнаў)

Нарадзіўся 8 жніўня 1975 года ў горадзе Полацку Віцебскай вобласці. Скончыў Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Працаваў у філіяле «Віцебскае вытворчае ўпраўленне газавай гаспадаркі» УП «Віцебскаблгаз»; дырэктарам філіялаў «Сенненскае раённае вытворчае ўпраўленне газавай гаспадаркі», «Полацкае вытворчае ўпраўленне газавай гаспадаркі» УП «Віцебскаблгаз»; намеснікам галоўнага інжынера, намеснікам генеральнага дырэктара па капітальным будаўніцтве УП «Віцебскаблгаз»; генеральным дырэктарам РУП «Магілёўаблгаз».

Дэпутат Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў. Дэлегат шостага Усебеларускага народнага сходу.

Генеральны дырэктар дзяржаўнага вытворчага аб'яднання па паліве і газіфікацыі «Белпалівагаз».

Старшыня Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па энергетыцы і транспарце. Намеснік кіраўнікоў дэлегацыі па ажыццяўленні кантактаў з ПАСЕ; рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Аўстрыі, Чэхіі, Каралеўства Швецыя.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Віцебскага і Магілёўскага аблвыканкамаў, міністэрстваў энергетыкі, сельскай гаспадаркі і харчавання. Прысвоена ганаровае званне «Ганаровы работнік газавай і паліўнай прамысловасці».



## ЛІСКОВІЧ
### Віктар Андрэевіч

Член Пастаяннай камісіі
па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.
Выбраны ад Гродзенскай вобласці
(вылучаны ад Зэльвенскага і Слонімскага раёнаў)

Нарадзіўся 4 верасня 1960 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. Скончыў Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (лячэбная справа); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржавае адміністраванне). Кандыдат медыцынскіх навук. Аўтар больш як 350 навуковых работ і публікацый, у тым ліку 8 манаграфій, падручніка і 8 навучальных дапаможнікаў, 16 метадычных рэкамендацый і інструкцый і інш. Мае 4 патэнты на вынаходствы.

Працаваў у Брэсцкай цэнтральнай раённай бальніцы; Астравецкай цэнтральнай раённай бальніцы; галоўным акушэрам-гінеколагам, намеснікам начальніка лячэбнага аддзела ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама; галоўным урачом установы аховы здароўя «Гродзенскі абласны клінічны перынатальны цэнтр»; намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама; старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання, Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў 26-га і 28-га скліканняў.

Дэлегат чацвёртага, пятага і шостага Усебеларускага народнага сходу.

Старшыня Гродзенскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў.

Член РГА «Белая Русь».

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За працоўныя заслугі», ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, юбілейнымі медалямі. У 2010 годзе ўнесены ў Кнігу Славы Гродзенскай вобласці.



## ЛУК'ЯНАЎ
### Уладзімір Міхайлавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі
па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.
Выбраны ад Мінскай вобласці (вылучаны
ад Валожынскага, Нясвіжскага і Стаўбцоўскага раёнаў)

Нарадзіўся 25 мая 1972 года ў горадзе Берліне (ФРГ). Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; Інстытут дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Працаваў намеснікам дырэктара ВГПУП «Візус Экспрэс»; дырэктарам ТАА «Ойлкомпані»; намеснікам дырэктара ТАА «Актыўкомпані»; намеснікам дырэктара, першым намеснікам дырэктара па птушкагадоўлі і камерцыйнай дзейнасці, дырэктарам камунальнага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Племптушказавод «Беларускі» Мінскага раёна.

Дэлегат шостага Усебеларускага народнага сходу.

Генеральны дырэктар ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі» Дзяржынскага раёна.

Член Пастаяннай камісіі МПА СНД па аграрнай палітыцы, прыродных рэсурсах і экалогіі; рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Туркменістана (намеснік кіраўніка), Узбекістана і Рэспублікі Філіпіны.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, падзякі Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыні Дзяржынскага райвыканкама, падзяку і падзячнае пісьмо старшыні Мінскага аблвыканкама. Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейным медалём «100 гадоў прафсаюзнаму руху Беларусі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Дзяржынскага райвыканкама, нагруднымі знакамі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання «За заслугі ў сельскай гаспадарцы», органаў пагранічнай службы «За дапамогу органам пагранічнай службы».

Удастоены ганаровага звання «Чалавек года Міншчыны – 2018».



## ЛЯЎКОВІЧ
### Ірына Пятроўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі
па эканоміцы, бюджэце і фінансах.
Выбрана ад Віцебскай вобласці (вылучана
ад Бешанковіцкага, Сенненскага,
Талачынскага і Чашніцкага раёнаў)

Нарадзілася 28 верасня 1964 года ў горадзе Оршы Віцебскай вобласці. Скончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Працавала на Віцебскім холадакамбінаце; ва ўпраўленні гандлю Віцебскага аблвыканкама; намеснікам дырэктара па камерцыйных пытаннях арэнднага прадпрыемства Віцебскага абласнога вытворчага аб'яднання «Чараўніца»; эканамістам упраўлення гандлю і грамадскага харчавання Віцебскага аблвыканкама; намеснікам начальніка, начальнікам упраўлення гандлю, грамадскага харчавання, тавараў і паслуг Віцебскага гарвыканкама; начальнікам упраўлення гандлю і паслуг Віцебскага аблвыканкама.

Дэпутат Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання.

Начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па эканамічнай палітыцы, прамысловасці і гандлі.

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», «За бездакорную службу» III ступені, ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, Віцебскага аблвыканкама.



## ЛЯХАЎ
### Аляксандр Андрэевіч

Член Пастаяннай камісіі
па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.
Выбраны ад Гомельскай вобласці (вылучаны
ад Калінкавіцкага, Акцябрскага і Рэчыцкага раёнаў)

Нарадзіўся 7 ліпеня 1962 года ў гарадскім пасёлку Капаткевічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт, аспірантуру пры Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны.

Працаваў у ВА «Заходнафтагеафізіка»; намеснікам генеральнага дырэктара па фінансавых і эканамічных пытаннях, першым намеснікам генеральнага дырэктара ВА «Беларуснафта»; генеральным дырэктарам РУП «Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта». Аўтар публікацый па эканоміцы геолагаразведачнай вытворчасці.

Генеральны дырэктар дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Беларуснафта» — генеральны дырэктар РУП «Вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта».

Член рабочых груп Нацыяльнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Індыі, Мексікі (кіраўнік), Кувейта, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, асобных дзяржаў Азіі і Паўночнай Афрыкі.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, падзякі Гомельскага аблвыканкама і Гомельскага гарвыканкама. Узнагароджаны ордэнам Айчыны II і III ступені, медалём «За працоўныя заслугі», ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Гомельскага аблвыканкама, Гомельскага гарвыканкама, Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў і інш., знакам «Ганаровы нафтавік».

Прысвоены званні «Ганаровы грамадзянін Рэчыцкага раёна», «Чалавек года Гомельскай вобласці — 2011», «Ганаровы грамадзянін Гомельскай вобласці».



## МАТВЕЕЎ
### Уладзімір Сямёнавіч

Член Пастаяннай камісіі
па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.
Выбраны ад Віцебскай вобласці (вылучаны
ад Браслаўскага, Міёрскага, Пастаўскага
і Шаркаўшчынскага раёнаў)

Нарадзіўся 28 жніўня 1964 года ў горадзе Полацку Віцебскай вобласці. Скончыў Наваполацкі політэхнічны інстытут; Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Служыў у Савецкай арміі. Працаваў у Полацкай перасоўнай механізаванай калоне № 92 Віцебскай вобласці; саўгасе «Шаркаўшчынскі» Віцебскай вобласці; майстрам, прарабам, старшым прарабам участка № 1 дарожна-будаўнічага ўпраўлення № 2 г. Полацка Віцебскай вобласці; галоўным інжынерам дарожна-будаўнічага ўпраўлення № 2 ААТ «Дарожна-будаўнічы трэст № 1, г. Віцебск»; намеснікам старшыні па жыллёва-камунальнай гаспадарцы і будаўніцтве Полацкага гарвыканкама, намеснікам генеральнага дырэктара камунальнага праектна-рамонтна-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскаблдарбуд».

Дэпутат Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў 28-га склікання. Генеральны дырэктар камунальнага праектна-рамонтна-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскаблдарбуд».

Член рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі асобных дзяржаў Паўднёвай Афрыкі (намеснік кіраўніка), Дзяржавы Ізраіль, асобных дзяржаў Паўночнай Афрыкі і Цэнтральнай Афрыкі.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Віцебскага аблвыканкама, Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, нагруднымі знакамі Міністэрства транспарту і камунікацый «Ганаровы дарожнік Беларусі» II ступені і «Ганаровы транспартнік». Мае падзякі старшыні Віцебскага аблвыканкама, старшыні Браслаўскага райвыканкама.





## НАРКЕВІЧ
### Юрый Іосіфавіч

Член Пастаяннай камісіі
па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.
Выбраны ад Брэсцкай вобласці
(вылучаны ад Бярозаўскага і Пружанскага раёнаў)

Нарадзіўся 2 лютага 1964 года ў вёсцы Слабада Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У. Куйбышава; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Працаваў старшым эканамістам калгаса «Светлы шлях» Іванаўскага раёна; галоўным эканамістам калгаса імя М. Горкага Іванаўскага раёна; намеснікам старшыні Іванаўскага райвыканкама; кіраўніком Іванаўскага аддзялення ААТ «Белаграпрамбанк»; старшынёй Бярозаўскага райвыканкама; кіраўніком спраў Брэсцкага аблвыканкама.

Дэлегат трэцяга, чацвёртага, пятага і шостага Усебеларускага народнага сходу.

Старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў.

Член Беларускага прафсаюза работнікаў дзяржаўных устаноў, палітсавета РГА «Белая Русь». Член Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Сената Французскай Рэспублікі, рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Каралеўства Іспанія.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



## НЯВЕРАЎ
### Аляксей Мікалаевіч

Член Пастаяннай камісіі
па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.
Выбраны ад Гомельскай вобласці
(вылучаны ад горада Гомеля)

Нарадзіўся 16 чэрвеня 1973 года ў горадзе Уральску (Казахская ССР). Скончыў Заходне-Казахстанскі сельскагаспадарчы інстытут (механізацыя сельскай гаспадаркі); Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны (правазнаўства); Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (дзяржаўнае і мясцовае кіраванне).

Працаваў слесарам механазборачных работ Уральскага завода «Зеніт»; спецыялістам, вядучым спецыялістам аддзела знешнеэканамічных сувязей, намеснікам начальніка аддзела матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння СП ААТ «Спартак»; юрысконсультам, намеснікам начальніка камерцыйнага аддзела КСУП «Цяплічнае»; старшынёй Улукаўскага сельвыканкама Гомельскага раёна; намеснікам старшыні Гомельскага райвыканкама; кіраўніком адміністрацыі Навабеліцкага раёна г. Гомеля; старшынёй Гомельскага абласнога аб'яднання арганізацый прафсаюзаў, якія ўваходзяць у Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі, генеральным дырэктарам дзяржаўнай установы «Гомельаблпрам».

Выбіраўся дэпутатам Улукаўскага сельскага Савета дэпутатаў Гомельскага раёна 25-га склікання, Гомельскага раённага Савета дэпутатаў 26-га склікання. Дэлегат пятага і шостага Усебеларускага народнага сходу.

Намеснік генеральнага дырэктара (па камерцыйных пытаннях) СП ААТ «Спартак».

Член Беларускага прафесійнага саюза агрaпрамысловага комплексу, Беларускай партыі «Белая Русь».

Член рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Федэратыўнай Рэспублікі Германія, Каралеўства Іспанія, Манголіі, Французскай Рэспублікі, Швейцарскай Канфедэрацыі.

Узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Гомельскага гарадскога выканаўчага камітэта. Мае падзякі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі і Гомельскага аблвыканкама.



## ПАЛІШЧУК
### Валерый Мікалаевіч

Член Пастаяннай камісіі
па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.
Выбраны ад Магілёўскай вобласці
(вылучаны ад Горацкага,
Дрыбінскага і Мсціслаўскага раёнаў)

Нарадзіўся 30 кастрычніка 1963 года ў сяле Прыазёрнае Табольскага раёна Кустанайскай вобласці (Казахская ССР). Скончыў Магілёўскую спецыяльную СШ транспартнай міліцыі МУС СССР; Акадэмію МУС Рэспублікі Беларусь (правазнаўства). Генерал-маёр міліцыі.

Служыў у Савецкай арміі. Працаваў у г. Магілёве на розных пасадах у АУС Цэнтральнага райвыканкама; АУС Ленінскага райвыканкама; АУС адміністрацыі Ленінскага раёна; АУС Чавускага райвыканкама; АУС адміністрацыі Кастрычніцкага раёна; УУС Магілёўскага аблвыканкама; быў першым намеснікам начальніка УУС Магілёўскага аблвыканкама — начальнікам крымінальнай міліцыі; начальнікам УУС Гомельскага аблвыканкама, начальнікам установы адукацыі «Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь».

Дэлегат чацвёртага і шостага Усебеларускага народнага сходу.

Начальнік установы адукацыі «Магілёўскі спецыялізаваны ліцэй Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь».

Член рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Рэспублікі Таджыкістан (намеснік кіраўніка), Азербайджана, Кыргызстана, Малдовы.

Узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені, медалямі «За бездакорную службу» I, II і III ступені, ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Генпракуратуры, Дзяржаўнага сакратарыята Савета Бяспекі, міністэрстваў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Мае падзякі старшынь Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў.



## ПАНЦЮХОВА
### Алена Валяр'янаўна

Член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы
і мясцовым самакіраванні.
Выбрана ад Віцебскай вобласці
(вылучана ад горада Віцебска)

Нарадзілася 20 снежня 1972 года ў горадзе Віцебску. Скончыла Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут.

Працавала рэдактарам Віцебскага абласнога тэлерадыёаб'яднання, спецыяльным карэспандэнтам па Віцебскай вобласці, загадчыкам карэспандэнцкага пункта па Віцебскай вобласці службы інфармацыі тэлебачання інфармацыйнага агенцтва Белтэлерадыёкампаніі, дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства радыётэлецэнтра «Тэлерадыёкампанія «Віцебск».

Член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

Прадзюсар тэлевізійных і радыёпраграм рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства радыётэлецэнтра «Тэлерадыёкампанія «Віцебск».

Член рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Грузіі, Егіпета, Індыі, Іспаніі, Казахстана, Латвіі, Мексікі, Султаната Аман, Польшчы, Сербіі, Славакіі, Францыі, Чэхіі, Швейцарскай Канфедэрацыі і Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Удастоена званняў «Чалавек года Віцебшчыны» і «Віцябчанін года».



## ПОЛУШКІНА
### Тацццяна Генадзьеўна

Член Пастаяннай камісіі
па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.
Выбрана ад Віцебскай вобласці
(вылучана ад Полацкага і Верхнядзвінскага раёнаў)

Нарадзілася 14 лютага 1957 года ў горадзе Полацку Віцебскай вобласці. Скончыла Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя С.М. Кірава.

Працавала ў сярэдняй школе № 7 г. Полацка, Полацкім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга педагагічным каледжы імя Ф. Скарыны.

Тройчы выбіралася дэпутатам Полацкага гарадскога Савета дэпутатаў. Дэлегат трэцяга, пятага і шостага Усебеларускага народнага сходу.

Дырэктар Полацкага каледжа ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».

Член РГА «Белая Русь», Беларускай партыі «Белая Русь».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя; Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Сената Французскай Рэспублікі; рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Аргенціны, Бразіліі, Каралеўства Нідэрландаў, асобных дзяржаў цэнтральнай Афрыкі (намеснік кіраўніка), Егіпта, Сінгапура.

Мае Падзяку Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, нагруднымі знакамі «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», «За заслугі перад Полацкам».

Прысвоены ганаровыя званні «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», «Чалавек года Віцебшчыны».



## ПОРТНІК
### Алег Пятровіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі
па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.
Выбраны ад Магілёўскай вобласці
(вылучаны ад Глускага, Асіповіцкага, Кіраўскага
і Клічаўскага раёнаў)

Нарадзіўся 20 мая 1959 года ў горадзе Мінску. Скончыў Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію (заатэхнія).

Працаваў кіраўніком племянной свінагадоўчай фермы, дырэктарам саўгаса «Дабраволец».

Дэпутат Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў 27-га і 28-га скліканняў.

Дэлегат чацвёртага і пятага Усебеларускага народнага сходу.

Дырэктар унітарнага камунальнага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Саўгас «Дабраволец».

Член Беларускага прафесійнага саюза работнікаў сельскагаспадарчага комплексу.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па прыродных рэсурсах, экалогіі і ахове навакольнага асяроддзя; рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі Каралеўства Бельгія і Дзяржавы Ізраіль.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалямі «За працоўныя заслугі», «100 год органам дзяржаўнага кіравання сельскай гаспадаркай і харчаваннем Беларусі», ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Удастоены ганаровага звання «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь».



## ПРАТАСАВІЦКІ
### Рыгор Васільевіч

Член Пастаяннай камісіі
па эканоміцы, бюджэце і фінансах.
Выбраны ад Брэсцкай вобласці
(вылучаны ад Столінскага і Лунінецкага раёнаў)

Нарадзіўся 24 лістапада 1961 года ў пасёлку Клесава Сарненскага раёна Ровенскай вобласці (Украінская ССР). Скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Працаваў на кормапрадпрыемстве «Відзібор» калгаса «XIX партз'езд» Столінскага раёна Брэсцкай вобласці; другім, першым сакратаром Столінскага раённага камітэта Ленінскага камуністычнага саюза моладзі Беларусі; намеснікам старшыні Столінскага гарвыканкама; загадчыкам аддзела па рабоце з моладдзю, намеснікам старшыні, першым намеснікам старшыні Столінскага райвыканкама.

